

Работа над... стрэсам

СТАР. 7



«Урочышча Пяскі». Кола замкнулася

СТАР. 9



Мазыране скарылі Манака

СТАР. 12

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 САКАВІКА 2016 г. СЕРАДА № 40 (28150) Кошт 2400 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НА ХВАЛІ СУПРАЦОЎНІЦТВА І ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю Цэнтральнаму тэлебачанню Кітайскай Народнай Рэспублікі.**



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы адказаў на шэраг пытанняў адносна найбольш значных вынікаў і перспектыў беларуска-кітайскага супрацоўніцтва з акцэнтам на ўдзел нашай краіны ў рэалізацыі кітайскай канцэпцыі па будаўніцтве эканамічнага пояса Шаўковага шляху. У гэтым кантэксце асобная ўвага падчас інтэрв'ю была нададзена Кітайска-беларускаму індустрыяльнаму парку як аднаму з найбольш значных і перспектыўных праектаў у краінах, размешчаных уздоўж эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Прэзідэнт Беларусі выказаў меркаванне, што ініцыятыва кітайскага лідара Сі Цзіньпіна аб стварэнні эканамічнага пояса Шаўковага шляху — гэта вялікая ідэя ў імя аб'яднання і стварэння.

Адно з пытанняў датычылася Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку «Вялікі камень», які закліканы стаць важным звяном на гэтым новым шляху, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. На думку кіраўнікоў дзвюх краін, парк можа стаць жамчужынай эканамічнага пояса Шаўковага шляху. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы чакаем (і ўжо пачалі ажыццяўляць гэтую ідэю) самых сур'ёзных інвестыцый у гэты праект на тэрыторыі Беларусі. Наша з Сі Цзіньпінам жорсткае патрабаванне — тут павінны быць створаныя прадпрыемствы, якія выпускаюць прадукцыю новага пакалення».

«Рэспубліка Беларусь — гэта цэнтр Еўропы, а ЕС — гэта высокатэхналагічны саюз, — працягнуў кіраўнік дзяржавы. — Ствараць тут прадукцыю мінулага стагоддзя і спрабаваць потым яе прадаць на гэтых рынках — бесперспектыўна. Таму трэба ствараць вельмі высокага ўзроўню прадукцыю, каб потым яе рэалізоўваць».

На думку Прэзідэнта, Беларусь як ніякая іншая краіна гатовая і падыходзіць для гэтага. Асабліва з улікам развітой інфраструктуры — чыгункі, аўтамабільных дарог, паветранага транспарту, бо тут скрыжаванне гэтых шляхоў. Акрамя таго, новыя магчымасці адкрываюцца са стварэннем Еўразійскага эканамічнага саюза, актыўным удзельнікам якога з'яўляецца Беларусь.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што Кітайска-беларускі парк — гэта адкрыты праект, да якога могуць далучацца і іншыя партнёры. «Пры стварэнні гэтага прамысловага кластара важна не дапусціць стварэння нейкіх раздзяляльных бар'ераў. Мы гэта ўлічвалі першапачаткова. Наш праект адкрыты для ўсіх і не скіраваны супраць каго б там ні было, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Веліч гэтага праекта — у вялікай ідэі аб'яднання (эканамічнага, гандлёвага), а следам за гэтым абавязкова прыйдзе аб'яднанне культур і людзей».

Інтэрв'ю з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь увойдзе ў 6-серыйны дакументальны фільм пад назвай «Адзін пояс, адзін шлях», які прысвечаны эканамічнаму поясу Шаўковага шляху і выйдзе ў эфіры Цэнтральнага тэлебачання Кітая ў чэрвені 2016 года.

## Снежная элегія вясны



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Кожны праект, які прадугледжвае стварэнне новых працоўных месцаў, павінен атрымліваць максімальнае садзейнічанне мясцовай улады. Рашэнне задачы па стварэнні новых працоўных месцаў магчымае з дапамогай малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Таму наша задача — зняць усе бар'еры для бізнесу, выключыць выпадкі, калі прадпрымальны чалавек заблытваецца ў бюракратычных сетках. Калі сёння прадпрымальнік гатовы даць людзям работу, гэта і павінна быць вызначальнай умовай для выдзялення яму зямельнага ўчастка, аказання ўсемагчымай падтрымкі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.03.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21277,00 | ▼ |
| Еўра | 23127,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 287,77 | ▲ |
| Укр. грыўня | 785,49 | ▼ |

■ Ва ўрадзе

## САБРАЦЬ І ПЕРАПРАЦАВАЦЬ

У найбліжэйшую пяцігодку долю паўторнага выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў (ТКА) неабходна павялічыць да 25%

**Аб гэтым учора заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй КАБЯКОЎ на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў на тэму «Аб выніках выканання Дзяржаўнай праграмы па зборы (нарыхтоўцы) і перапрацоўцы другаснай сыравіны ў Рэспубліцы Беларусь на 2009—2015 гады, мерах па нарошчванні аб'ёмаў збору і выкарыстання другаснай сыравіны».**

СТАР. 2

■ Даслоўна

## НА ВАРЦЕ ПРАВА І ПАРАДКУ



Фота Вячаслава ЦУРАНАВА.

**Як адкажуць праваахоўнікі на інтэрнэт-правакацыі? Хто абароніць пенсіянераў ад злачынстваў і калі супрацоўнікаў у форме на стадыёнах заменяць спецыяльна падрыхтаваныя сцюарды? На самыя актуальныя пытанні журналістаў напярэдадні Дня беларускай міліцыі адказаў Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў Беларусі.**

### «ВАЯВАЦЬ З ПРАВАКАТАРАМІ НЕ БУДЗЕМ»

— Правакацыі ў дачыненні да міліцыі сёння сапраўды здараюцца, — кажа Ігар Анатолевіч. — Некаторыя паказваюць міліцыю ў бездапаможным выглядзе, але яна такой насамрэч не выглядае. Праваахоўнік не павінен быць у палоне сваіх эмоцый, адказваць хамствам на хамства. У такім выпадку ён — дрэнны міліцыянер. Аднак сёння крытычныя заўвагі, публікацыі ў сродках масавай інфармацыі, што тычацца працы міліцыі, пераважна носяць канструктыўны характар.

СТАР. 5




## ПРАВІЛЫ ПАД'ЁМУ

### З якімі праблемамі сутыкаецца айчынная ліфтавая гаспадарка?

**Шматпавярховую забудову гарадоў нельга ўявіць без гэтых механізмаў. Але, як і любой тэхніцы, ліфтам уласцівы паступовы знос, старэнне і, як вынік, паломкі. А часам пад'ёмнік нават даводзіцца спыняць на пэўны тэрмін з-за неналежнага абслугоўвання. Пра сітуацыю, якая склалася ў ліфтавай гаспадарцы Беларусі, карэспандэнт «Звязды» даведаўся ў начальніка ўпраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных збудаванняў і атракцыёнаў Дзяржпрамнагляду Пятра КЛІМКО.**

### Ці магчымыя дэфекты?

— Хутчэй за ўсё зношваюцца ў пад'ёмніку лябёдка і шкіў — адным словам, дэталі, якія пастаянна труцца. Мы ведаем, што некаторыя людзі неахвотна ездзяць у ліфце з-за боязі таго, што кабіна можа ўпасці ў шахту. Але думка гэтая памылковая. Той жа канат мае дванаццаціразовы запас трываласці. А канатаў такіх у ліфце звычайна тры... Ды і каб кабіна насамрэч упала, павінна адначасова супасці вельмі шмат фактараў — катастрафічны знос канатаў, адмова адразу ўсіх лоўнікаў, магутная карозія і дэфармацыя канструкцый. Такое магчыма толькі ў адным выпадку — калі ліфт доўгі час не абслугоўваўся, не рамантаваўся. Інакш кажучы,



яго абыходзілі бокам. Ці прыглядалі за ім чыста фармальна. Менавіта таму за ўвесь час, пакуль Дзяржпрамнагляд вядзе статыстыку, пра падзенні кабін ліфтаў у Беларусі звесткі адсутнічаюць. Любая арганізацыя, якая абслугоўвае машыны, абавязкова падкантрольная нам. І дзякуючы такой цэнтралізацыі мы не паўтарылі памылкі Расіі і Украіны, дзе ў ліфтах штогод гіне некалькі дзясяткаў чалавек.

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ




### АПЕК знізіла здабычу нафты

Дзяржавы — члены Арганізацыі краін — экспарцёраў нафты знізілі здабычу нафты ў лютым на 280 тыс. бараляў у суткі. Здабыча нафты значна ўпала ў Іраку, які з сярэдзіны лютага прыпыніў пастаўкі па нафтаправодзе з Курдыстана. Акрамя таго, здабыча чорнага золата прыкметна знізілася ў Нігерыі пасля аварыі на мясцовым прадпрыемстве нафтагазавай кампаніі. Прычынай зніжэння ўзроўню здабычы нафты ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах стала закрыццё некалькіх буйных радовішчаў з тэхнічных прычын, паведамляюць трэйдары. Разам з тым два найбуйнейшыя вытворцы нафты — Іран і Сірыя — зніжаць здабычу чорнага золата пакуль не збіраюцца. На таргах цана нафты Brent стабілізавалася на ўзроўні $36,62 за бараль.

### Кітай паэтапна павысіць пенсійны ўзрост

Кітай апублікуе ў 2016 годзе план павышэння пенсійнага ўзросту. Гэты крок накіраваны на барацьбу з праблемай скарачэння рабочай сілы і старэння насельніцтва. Цяперашнія нормы па выхадзе на пенсію былі прынятыя 60 гадоў таму. Узрост выхаду на пенсію для кітайскіх мужчын складае 60 гадоў, для жанчын, занятых у сферы разумовай працы, — 55 гадоў, а для жанчын, занятых фізічнай працай, — 50 гадоў. «Мы ўжо распрацавалі план павышэння пенсійнага ўзросту, але яго яшчэ павінны зацвердзіць улады да таго, як ён будзе прадстаўлены на суд грамадскасці», — заявіў міністр працоўных рэсурсаў і сацыяльнага забеспячэння Інь Вэймінь. Ён таксама падкрэсліў, што павышэнне пенсійнага ўзросту будзе адбывацца паступова і зойме досыць шмат часу. Штогадовыя змены будуць нязначнымі, таксама будзе ўжыты дыферэнцыраваны падыход да работнікаў розных сфер працы. У цяперашні час Кітай сутыкаецца з сур'ёзнай праблемай старэння насельніцтва, колькасць людзей старэйшых за 60 гадоў дасягнула 212 млн чалавек у мінулым годзе, што складае 16% насельніцтва краіны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Соль небяспечная для печані

Папярэднія даследаванні паказалі, што лішак солі павялічвае рызыку гіпертаніі і іншых праблем са здароўем. Паводле звестак новага даследавання, дыета з высокім утрыманнем солі наносіць шкоду печані. Прычым печань пакутуе не толькі ў дарослых, але і ў дзяцей ва ўлонні маці, піша Science World Report. Упраўленне па санітарным наглядзе за якасцю харчовых прадуктаў і медыкаментаў ЗША рэкамендуе спажываць не больш за 2300 міліграмаў натрыю ў дзень (прыкладна адну чайную лыжку). Іоны натрыю ўдзельнічаюць у цыркуляцыі вады ў арганізме і дапамагаюць праводзіць нервовыя імпульсы. Аднак многія людзі ўжываюць значна больш солі. Спецыялісты правялі даследаванне на мышах. Высветлілася, што лішак солі прыводзіў да шэрагу змяненняў у печані жывёл. Гэта павышала рызыку фіброзу. У той жа час вітамін С дапамагаў часткова аднавіць пашкоджаныя клеткі.

■ Спадчына

## ЗВАНІ ЗВАНЧЭЙ, ЗВОН!

### Традыцыйнае званарства можа ўвайсці ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі

**Пабачыла свет адна з першых айчынных грунтоўных манаграфій па кампаналогіі — навуцы аб званах. Гэта кніга кандыдата мастацтвазнаўства Алены Шацько «Колокольный звон Белой Руси: тысячелетие традиции». Пад яе вокладкай — унікальны матэрыял пра традыцыйнае беларускае званарства, звесткі пра каштоўныя старажытныя званы, што захоўваюцца ў музеях і яшчэ гучаць у храмах. Выданне сталася вынікам амаль пятнаццацігадовага даследавання, соцень экспедыцый, працы ў архівах Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі. Гэтая кніга — не толькі найбагацейшая крыніца звестак пра званы, але і доказ таго, што традыцыйнае званарства нашага народа непаўторнае, унікальнае, вартае захавання і зберажэння. Сёння Алена Шацько разам з Беларускім саюзам музычных дзеячаў ініцыюе ўнясенне традыцыйнага званарства ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, а потым і ЮНЕСКА. У гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» Алена Генадзеўна ўспамінае пра вытокі сваёй цікавасці да званоў, расказвае пра сенсацыйныя знаходкі і адкрыцці, а таксама тлумачыць, чаму ў вёсках нельга праводзіць майстар-класы для званароў.**

СТАР. 10



ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

Пачалася падпіска на «Звязду» на II квартал 2016 года!

5 разоў на тыдзень!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

# САБРАЦЬ І ПЕРАПРАЦАВАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адразу Андрэй Кабякоў нагадаў, што ў лютым 2014 года на нарадзе па пытаннях абыходжання з адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі (ДМР) кіраўніком дзяржавы была пастаўлена задача па дасягненні ступені выкарыстання адходаў аналагічнай узроўню ў краінах Заходняй Еўропы (50-90%). Таму для выканання гэтай задачы вызначаны прыярытэтныя кірункі развіцця сістэм абыходжання з адходамі і ДМР на пяцігодку. У першую чаргу гэта зніжэнне аб'ёмаў захавання адходаў на палігонах, забеспячэнне да 2020 года паўторнага выкарыстання не менш чым 25% цвёрдых камунальных адходаў, стварэнне замкнутых цыклаў збору і выкарыстання ДМР, якія забяспечваюць першачарговае выкарыстанне сабранай другаснай сыравіны для патрэб айчынных перапрацоўшчыкаў пад іх поўную вытворчую патрэбу.

Кіраўнік урада паведаміў, што ўзровень здабывання асноўных другасных матэрыяльных рэсурсаў (без уліку будаўнічых адходаў) з аб'ёму цвёрдых камунальных адходаў за сем гадоў павялічыўся больш чым у 2 разы. Такая доля другасных рэсурсаў павялічылася за гэты час з 7,5% да 15,6% у 2015 годзе.

Паводле яго слоў, урадам і зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі ў цэлым забяспечана выкананне асноўных задач, вызначаных у праграме. Спікер пасяджэння падкрэсліў, што дасягнуты пэўныя станоўчыя вынікі і забяспечана павышэнне ўзроўню здабывання другасных матэрыяльных рэсурсаў са складу цвёрдых камунальных адходаў. Цяпер у краіне забяспечаны рост аб'ёмаў збору (нарыхтоўкі) другаснай сыравіны, у тым ліку макулатуры на 185%, адходаў пластмас — у 3 разы, зношаных шын — у 3,3 раза, адходаў шкла — у 5,8 раза.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што паралельна з развіццём сістэмы паасобнага збору адходаў і здабывання другасных матэрыяльных рэсурсаў неабходна ўкараняць тэхналогіі кампаставання арганічнай часткі адходаў і выкарыстання камунальных адходаў у цеплаэнергетыцы.

«Гэтыя падыходы павінны быць адлюстраваны ў праграмных дакументах Мінжылкамгаса і Мінпрыроды па пытаннях развіцця сістэм абыходжання з адходамі і другаснай сыравінай», — паведаміў Андрэй Кабякоў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Добра, калі цябе чуюць

## По выніках «прамой лініі» старшыня Віцебскага аблвыканкама застаўся незадаволены ўзроўнем работы мясцовых улад

**Яшчэ перад пачаткам тэлефоннай сувязі з жыхарамі вобласці Мікалай ШАРСТНЁЎ даручыў сваім падначаленым праверыць, як сельсаветы і выканкамы вырашаюць агучаныя насельніцтвам праблемы. Яго памочнік далажыў, што прыкладна 30% просьбаў задавальняюцца.**


Фота Аляксея СПАТКАЯ.
Падчас «прамой лініі» з удзелам старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Сустракаюцца і спрэчныя выпадкі. Напрыклад, жанчына з Полацка прасіла кіраўніка вобласці прыняць яе асабіста, каб данесці, нарэшце, сваю праблему, звязаную з падтапленнем яе зямельнага ўчастка. Старшыня райвыканкама па відэасувязі запэўніў, што інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці. Сітуацыю неаднаразова вывучалі на месцы, жанчыне адказвалі пісьмова. Мікалай Шарстнёў даручыў падключыць да праверкі інфармацыі экспертаў.

Нечаканым быў званок з Мінска. Мужчына расказаў пра тое, што ў Чашніцкім раёне за свае грошы ўсталяваў памятны знак, каб увекавечыць подзвіг партызанаў і апалчэнцаў. Цяпер трэба зарэгістраваць помнік і забяспечыць яго ахову з боку дзяржавы.

Адназначнае абурэнне ў Мікалая Шарстнёва выклікала размова з жыхаркай Віцебска, паводле слоў якой, у яе 5-павярховым доме рамонт вядзецца ўжо шэсць гадоў.

— Неабходна знаходзіць вінаватых і прыцягваць іх да адказнасці. Гэты факт сведчыць пра адсутнасць прафесіяналізму, халатнасць, можна сказаць, пра злачыннасць, — выказаў сваю думку кіраўнік рэгіёна.

Званок з Шаркаўшчыны здзівіў упэўненасцю, што ў выхадныя і святы ў кране няма вады. Такое меркаванне ў жанчыны, якая званіла, з'явілася з-за таго, што вады няма не толькі ў яе доме, але і ў іншых дамах горада.

Жыхар абласнога цэнтра незадаволены ацэнкай кошту кватэры для прыватызацыі. Дзе пенсіянеру знайсці 500 мільёнаў рублёў?

Некалькі зваротаў тычыліся вялікай затрымкі па выплаце зарплаты. У прыватнасці, будаўнік з Віцебска не бачыў заробленых грошай з кастрычніка мінулага года. Некаторыя прасілі дапамогі ў пошуку працы. З-за рэарганізацыі трэста ЖКГ бацька дваіх дзяцей, рабочы, стане беспрацоўным. Сям'і не будзе на што жыць.

На «прамую лінію» са старшынёй Віцебскага аблвыканкама дазванілася і старшыня прафкама ЖРЭТ Кастрычніцкага раёна Віцебска, які рэарганізуецца. Яна даказвала, што трэст не трэба ліквідоўваць (ён увойдзе ў склад адзінай арганізацыі. — **Аўт.**). Маўляў, мы не «лішняе звяно» ў камунальнай сістэме, а эфектыўна працуем. Мікалай Шарстнёў прапанаваў стварыць камерцыйную структуру па аказанні паслуг насельніцтву па абслугоўванні жылля. Са свайго боку паабяцаў падтрымаць ініцыятыву. Але прадстаўніца прафсаюза засталася пры сваёй думцы.

Усяго з кіраўніком вобласці ўдалося пагутарыць 25 грамадзянам. Падводзячы вынікі, губернатар заклікаў старшынь сельскіх і райвыканкамаў, райсаветаў штодня ўнікаць у праблемы людзей. Каб звароты па дробных пытаннях не адымалі час у кіраўніцтва вобласці і ў рэспубліканскіх органаў.

— Прайсці трэба па вёсцы, сустрэцца з людзьмі, пагаварыць з імі. Неабходна зайсці ў краму, бібліятэку, школу, каб пацікавіцца, якія ёсць пытанні, што трэба вырашаць, — сказаў старшыня аблвыканкама.

Навядзенне парадку на сельскіх могілках — гэта ўзровень сельсавета. Ненармальна, калі без каманды зверху ўлады не могуць усталяваць... поручань уздоўж лесвіцы. Калі ўзнікаюць звароты па навядзенні парадку ў двары.

Губернатар патрабаваў правесці «кадравую чыстку» ў службах, якія працуюць са зваротамі грамадзян. Ён распарадзіўся звальняць тых, хто размаўляе з людзьмі груба, ставіцца да зваротаў фармальна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Да пабачэння, школа!

# АД АПОШНІХ ЗВАНКОЎ — ДА ВЫПУСКНЫХ ВЕЧАРОЎ

**Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, звязаных з заканчэннем навучальнага года, і выпускнымі экзаменамі. Апошнія званкі для вучняў 9-х і 11-х класаў прагучаць у гэтым годзе 30 мая. А вучэбны год для ўсіх школьнікаў завяршаецца 31 мая.**

З 1 па 11 чэрвеня ў школах пройдуць выпускныя экзамены на II і III ступенях навучання.

Выпускнікі 11-х класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (па выбары) і матэматыцы пройдуць 1, 3, 6 і 8 чэрвеня 2016 года. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама размяшчацца на партале Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па іншых заданнях. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі. Экзамен па гісторыі Беларусі будзе грунтавацца толькі на тым матэрыяле, які школьнікі вывучалі ў 10-м і 11-м класах.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку (пісьмова). Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 4, 7 і 9 чэрвеня.

Ва ўстановах адукацыі, дзе навучанне і выхаванне вядзецца на польскай і літоўскай мовах, для навучэнцаў 9-х і 11-х класаў праводзяцца выпускныя экзамены ў пісьмовай форме па мове нацыянальнай меншасці: 24 мая — у 9-х класах і 25 мая — у 11-х класах.

Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў Міністэрства адукацыі рэкамендуе 10-11 чэрвеня 2016 года. Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе ў гэтым годзе 13 чэрвеня.

На нацыянальным адукацыйным партале (http://adu.by/) у раздзеле «Вучню» (падраздзеле «Экзамены») можна знайсці Праграмы ўступных іспытаў ва ўстановы адукацыі для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені і (або) сярэдняй спецыяльнай адукацыі на 2016 год.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Меркаванні

# НЕ ЗБАВІЦЬ ТЭМПЫ

**Указ Прэзідэнта №78 «Аб мерах па павышэнні эфектыўнасці сацыяльна-эканамічнага комплексу Рэспублікі Беларусь» можна назваць дакладнай праграмай дзеянняў для рэгіёнаў. Так лічыць старшыня камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Павел ЮХНЕВІЧ.**

— Галоўная задача для вобласці — не збавіць тэмпы росту, якія былі дасягнуты летась і за пяцігодку ў цэлым. А магчымасці для гэтага ёсць — як у прамысловасці, так і сельскай гаспадарцы, тавараздвароце. У першую чаргу за кошт традыцыйных вытворчасцяў, а таксама новых, якія запусцілі летась. У прыватнасці, эфектыўна развіваюцца і павялічваюць аб'ёмы вытворчасці фармацэўтычныя прадпрыемствы, нядрэнныя паказчыкі на пачатку года ў машынабудаўнікоў, вытворцаў транспартных сродкаў. Стабілізавалася сітуацыя на БелАЗе. Акрамя таго, важкую прыбаўку даюць новыя мадэрнізаваныя суб'екты гаспадарання, напрыклад «Велес-Міт», Пухавіцкі завод горнага воску. Ну і, безумоўна, нельга скідваць з рахунку прадпрыемствы дрэваапрацоўкі. Сюды ўкладзены сродкі, якія павінны даваць вынік.

Што тычыцца новых рабочых месцаў, то ў 2015 годзе іх было створана больш як 7,5 тысячы. Сёлета плануецца дадаткова яшчэ 6 900 за кошт адкрыцця новых прадпрыемстваў і пачатку работы тых, што зарэгістраваны летась або 2-3 гады таму, паколькі цыкл арганізацыі вытворчасці дастаткова працяглы. Думаю, па выніках першага квартала з'явіцца не менш як 1,5 тыс. новых рабочых месцаў. А ў цэлым на тэрыторыі Мінскай вобласці рэалізуецца больш як 50 праектаў, дзе прадугледжана іх арганізацыя. Сёлета наша задача — захаваць інвестыцыі на ўзроўні 2015 года, а менавіта больш як 45 трлн рублёў. Вядома, гэта нялёгка. Тым не менш кіраўнік дзяржавы даў дакладны кірунак, дзе гэтыя грошы браць — прыцягваць прамыя замежныя інвестыцыі. Сёлета ў Мінскай вобласці плануецца прыцягнуць прамых замежных інвестыцыі на чыстай аснове не менш, як 180 млн долараў ЗША.

На жаль, ёсць пэўнае зніжэнне паказчыкаў знешнеэканамічнай дзейнасці. Але яны ў многім вызначаліся кан'юнктурай, працэсамі, што адбываюцца ў краінах-партнёрах. Тым не менш у фізічным вымярэнні шэраг прадуктаў, тавараў рэалізавалі з плюсам у параўнанні з 2014 годам. Галоўнае ж, мы захавалі знешнія рынкі, сваю прысутнасць там, і выйшлі на новыя. У гэтым годзе пачаліся пастаўкі ў Саудаўскую Аравію, Чылі, Перу, некаторыя краіны Афрыкі, у прыватнасці Нігерыю. Аб'ёмы іх пакуль не такія вялікія, як хацелася б, але гэта справа часу

■ Ініцыятыва

# Я Ў ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ПАЙДУ, ХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

**У сталіцы адбылося выязное пасяджэнне грамадска-кансультацыйнага савета пры Міністэрстве эканомікі, на парадку дня якога было развіццё вучнёўскіх бізнес-кампаній. Мерапрыемства праводзілася ў рамках тыдня прадпрымальніцтва, які праходзіць з 29 лютага па 4 сакавіка ў Беларусі.**

Падобныя вучнёўскія фірмы на базе школ пачалі з'яўляцца не так даўно. Гэта ініцыятыва ўзнікла стыхійна. Часцей за ёй стаяць таленавітыя педагогі. Лідзіруе па колькасці гэтых фірм сёння Мінская вобласць. Школьныя бізнес-кампаніі досыць разнастайныя і прадастаўляюць паслугі ад дызайну і паліграфіі, да вырошчвання раслін, стварэння вырабаў і малюнкаў. Прычым вучні ў іх выступаюць не толькі як наёмныя супрацоўнікі, але і як кіраўнікі. Як адзначаюць у Міністэрстве эканомікі, зараз такім кампаніям неабходна падтрымка прафесіяналаў для далейшага развіцця. Многія з іх маюць праблемы юрыдычнага характару: няма неабходнай інфармацыі аб тым, як выкарыстоўваць фінансавыя сродкі, як аплачваць бонусы і ўзнагароды для вучняў. Гэтыя пытанні не могуць быць вырашаны без удзелу Міністэрства эканомікі. **Намеснік дырэктара дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі Дзмітрый КРАСОЎСКІ** адзначыў, што сёння важна вывесці гэтую ініцыятыву на агульнадзяржаўны ўзровень. Для гэтага і быў сабраны грамадска-кансультацыйны савет, на якім прафесіяналы з зацікаўленых галін абмяркоўвалі праект тыпавога палажэння, што ў будучыні будзе прымацца кожнай школай. Дакументам плануецца ўзаконіць парадак стварэння і ліквідацыі школьных кампаній. Мяркуецца, што ствараецца такая фірма будзе на час навучальнага года, далей ліквідавацца і ўзнікаць зноў ужо ў наступным годзе. Вучні пры гэтым змогуць канкурыраваць як на школьных кірмашах, прадаючы прадукты сваёй працы ці паслугі, так і ў рамках больш шырокага рынку.

«Важным з'яўляецца пытанне неабходнасці ўлівання рэальных грошай у працу школьных кампаній. У выпадку іх выкарыстання ў такіх фірмах, магчыма, спатрэбіцца пэўны ўказ Прэзідэнта. У тым ліку неабходна будзе юрыдычна вывесці гэтую дзейнасць з поля прадпрымальніцтва, каб яна не абкладалася такімі ж высокімі патрабаваннямі. Альтэрнатывай можа быць і гульнявая валюта, якая памяншае ступені рызык, але дазваляе вучням больш актыўна ўдзельнічаць у кіраванні і атрымліваць бонусы», — адзначыў Дзмітрый Красоўскі.

У Міністэрстве эканомікі патлумачылі, што згаданы праект плануецца падрыхтаваць ужо да наступнага навучальнага года.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Погляд

# ХОЦЬ НЕ ПЫШНА, АБЫ ЗАЦІШНА



З паўночы 27 лютага ўвайшло ў сілу **перамір'е ў Сірыі,** гістарычнае пагадненне аб якім было дасягнута па ініцыятыве Расіі і ЗША 26 лютага ў Савеце Бяспекі ААН. На перамір'е з урадам Сірыі пагадзілася амаль сто груповак узброенай апазіцыі, якія да гэтага ваявалі з ім. Перамір'е не распаўсюджваецца на групоўку «Ісламская дзяржава» і іншыя арганізацыі, прызнаныя тэрарыстычнымі. Нягледзячы на тое, што ў многіх экспертаў ёсць сумненні ў тым, што перамір'е працягнецца доўга, гэта ўсё ж добры шанц, роўнага якому не было з 2011 года. Важным з'яўляецца разуменне, што асобныя парушэнні дасягнутага пагаднення непазбежныя, але на іх не трэба рэагаваць агульным спыненнем перамір'я. У выніку пагаднення ўпершыню ў многія раёны Сірыі пачне паступаць гуманітарная дапамога.

На **парламенцкіх выбарах у Іране** ўпэўненую перамогу атрымалі прыхільнікі дзейнага прэзідэнта Хасана Раўхані і ўмераныя сілы. Яны сталі большасцю ў парламенце, адцясніўшы кансерватыўна настроеных клерыкалаў. Перамога была прадказальнай, улічваючы, што дзейны прэзідэнт змог дабіцца адмены санкцый супраць Ірана, якія вельмі негатыўна ўплывалі на яго эканоміку. Зараз Іран імкліва нарошчвае экспарт нафты, размарожаны дзясяткі мільярдаў долараў у розных банках свету, да якіх урад страціў доступ пасля ўвядзення санкцый. Усё гэта дае надзею насельніцтву, што ранейшыя сур'ёзныя эканамічныя праблемы хутка скончацца і жыццёвы ўзровень пачне павышацца пасля доўгага падзення.

Пасля заключэння **пагаднення з ЕС аб асаблівым статусе Вялікабрытаніі** ў гэтай міжнароднай арганізацыі, брытанскі ўрад прыкладае намаганні, каб прызначаны на 23 чэрвеня рэферэндум аб членстве ў ЕС не завяршыўся прыняццем насельніцтвам рашэння аб выхадзе краіны з Еўрасаюза. У ход ідуць самыя разнастайныя аргументы, як звязаныя з сур'ёзнымі эканамічнымі непрыемнасцямі ў выпадку выхаду з ЕС, так і накіраваныя на тое, каб выклікаць страх у брытанскага насельніцтва застацца без падтрымкі з боку ЕС у ваенных адносінах. Пры гэтым прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран прама намякнуў, што ЗША ў выхадзе Вялікабрытаніі з ЕС не зацікаўлены.

Праблема з наплывам бежанцаў працягвае адбівацца на ўнутранай сітуацыі ў Еўрасаюзе. На мінулым тыдні **прэм'ер-міністр Венгрыі Віктар Орбан паабяцаў правесці рэферэндум** наконт таго, ці варта краіне згаджацца з квотамі па прыёме бежанцаў, прадпісанымі для яе Еўракамісіяй. Кіраўніцтва Венгрыі з самага пачатку выступіла супраць падобных квот, якія размяркоўвалі б нагрузку па бежанцах больш раўнамерна па ўсім Еўрасаюзе, але не знайшло дастатковай колькасці саюзнікаў, каб не дапусціць іх прыняцця. Калі на абяцаным рэферэндуме насельніцтва краіны выкажацца супраць прыёму бежанцаў, што зусім лёгка прадказаць, Еўракамісія апынецца ў складанай сітуацыі. Рэферэндум з'яўляецца формай прамой дэмакратыі, і яго вынікі давядзецца браць пад увагу, каб не атрымаць абвінавачванні ў парушэнні дэмакратычна выказанага меркавання венгерскага народа. Але і наплыў бежанцаў, ад якога пакутуюць у найбольшай ступені ўсяго некалькі дзяржаў ЕС, таксама з'яўляецца праблемай, якая патрабуе вырашэння.



Агенцтва Associated Press паведаміла пра тое, што Нью-Ёрк страціў свой статус лідара ў свеце па колькасці доларавых мільярдэраў, якія пражываюць у ім. **На першае месца выйшаў Пекін,** у якім па выніках 2015 года пражывае 100 мільярдэраў. Пры гэтым цікава, што ўсяго за год іх колькасць вырасла на 32 чалавекі, прытым, што Нью-Ёрк змог дадаць толькі чатырох чалавек. Гэты трэнд з'яўляецца адным з прыкмет паступовага, але ўпэўненага зрушэння цэнтра фінансавай актыўнасці ў Азію з еўраатлантычнага напрамку.

У Мінску на мінулым тыдні адбылося **пасяджэнне Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы.** На ім абмяркоўваліся пытанні палітычнага ўзаемадзеяння, перш за ўсё ў сферы знешняй палітыкі, па якой у рамках Саюзнай дзяржавы якраз завяршылася двухгадовая праграма ўзгодненых дзеянняў. Але, безумоўна, галоўнай тэмай стала эканоміка. Па выніках 2015 года тавараабарот дзвюх краін апусціўся да вельмі нізкага ўзроўню — 27,2 мільярда долараў ЗША. Калі ўлічыць, што па выніках 2012 года ён дасягаў 43 мільярдаў долараў, то яго падзенне за тры гады вельмі актыўных інтэграцыйных працэсаў інакш як драматычным назваць нельга. У найбольшай ступені пацярпела беларуская эканоміка, паколькі ва ўмовах недахопу сыравінных рэсурсаў у краіны не было магчымасці нарасціць золатавалютныя рэзервы, каб лягчэй перажываць цяперашнія праблемы. Па выніках сустрэчы чакаецца, што Расія акажа садзейнічанне ў выдзяленні крэдыту ў рамках Еўразійскага фонду стабілізацыі і развіцця.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■ Медыяпрастора

# Фарміраваць асобу, патрыёта, грамадзяніна

## ГЭТА АДНА З АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ МЯСЦОВАГА ДРУКУ

**Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі, якая прыняла ўдзел у пасяджэнні калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінаблвыканкама, заявіла, што рэгіянальная прэса ў краіне мае значныя рэзервы развіцця.**

«Рэчаіснасць такая, — заявіла Лілія Ананіч, — што друкаваныя СМІ, з прычыны развіцця інфармацыйных тэхналогій, страчваюць свае пазіцыі. Мы бачым гэта па змяншэнні тыражоў выданняў, у меншай ступені — рэгіянальных. Як сведчаць сацыялагічныя даследаванні цэнтра сацыяльна-палітычных даследаванняў БДУ, 29 працэнтаў апытаных выпісваюць і чытаюць рэгіянальную прэсу. Значыць, у рэгіянальнай прэсы асаблівы чытач і большыя рэзервы росту».

На думку міністра, на інфармацыйным полі рэгіёна СМІ павінны быць галоўнай крыніцай інфармацыі. «Трэба быць аўтарытэтным органам, якому давяраюць грамадзяне краіны», — сказала кіраўнік ведамства. Сфера інфармацыі і друку неабыякава насельніцтву. «Неабходна нагадваць школьнікам, падрастаючаму пакаленню, што ў шматлікіх крыніцах інфармацыі трэба вучыцца разбірацца. У павуціне можна знайсці ўсё: і добрае, і дрэннае. Калі інтэрнэт у дэструктыўных руках, то і вынік будзе дэструктыўным», — сказала Лілія Ананіч. Паводле яе слоў, традыцыйныя медыя ва ўмовах новых тэхналогій павінны самі развівацца і развіваць свайго чытача, каб газета была запатрабавана не толькі ў старэйшага пакалення, але і каб маладыя людзі цягнуліся да друкаванага слова. «А гэта і культура чытання, і фарміраванне асобы, патрыёта і грамадзяніна Беларусі», — рэзюмавала міністр інфармацыі

**Выказваем глыбокае спачуванне жонцы, родным і блізкім ЛІСІЦЫНА Пятра Сцяпанавіча, члена Саюза пісьменнікаў Расіі і Рэспублікі Беларусь, інваліда Вялікай Айчыннай вайны, юрыста, які памёр на 89-м годзе жыцця. Светлая яму памяць!**

**Сем'і Гарбачовых, Богушаў і Абрамовічаў.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
| Продавец | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь»,** г. Минск, ул. Некрасова, 9 | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| Лот № | Наименование, общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| 1 | **Гараж № 226,** 16,1 кв.м | 500/D-14030 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 226 |
| 2 | **Гараж № 267,** 16,1 кв.м | 500/D-14067 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 267 |
| 3 | **Гараж № 278,** 15,8 кв.м | 500/D-14075 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 278 |
| 4 | **Гараж № 351,** 15,9 кв.м | 500/D-14128 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 351 |
| 5 | **Гараж № 423,** 15,3 кв.м | 500/D-14180 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 423 |
| 6 | **Гараж № 26,** 16,4 кв.м | 500/D-13953 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 26 |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 151 500 000 белорусских рублей** | | | |
| 7 -15 | **Машино-место № 121, № 123, № 127, № 129, № 131, № 132, № 133, № 136, № 137, № 138** | | г. Минск, пр-т Независимости, 168/3-1г |
| Лоты №№ 7–15 расположены в подземной автостоянке, общ. пл. 6299,0 кв.м. с инвентарным № 500/D-70793116 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 297 000 000 белорусских рублей** | | | |
| 16 | **Гаражи на 4 автомашины,** 89,3 кв.м | 102/С-9461 | Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 167 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с №3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **04.04.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **31.03.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +37517-280-36-37; +375 29-183-69-71. auction@cpo.by; www.cpo.by** | | |

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 4 апреля 2016 г. торгов по продаже конфискованного имущества**

| | ПРЕДМЕТ ТОРГОВ № 1 | ПРЕДМЕТ ТОРГОВ № 2 |
|---|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | Изолированное помещение (двухкомнатная квартира) общей площадью 43,8 м² с инвентарным номером 640/D-4368, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. 8-е Марта, д. 22, кв. 78 (квартира расположена на 4-м этаже в пятиэтажном кирпичном доме 1989 года постройки) | Изолированное помещение (трехкомнатная квартира) общей площадью 59,4 м² с инвентарным номером 640/D-395, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Копыльская, д. 29, кв. 58 (квартира расположена на 6-м этаже в девятиэтажном панельном доме 1975 года постройки) |
| **Начальная цена** | 623 000 000 рублей | 798 000 000 рублей |
| **Сумма задатка** | 62 000 000 рублей | 79 000 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 | |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **4 апреля 2016 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02.03.2016 по 31.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».**

■ Працяг тэмы

# КУБАК НАДЗЕІ ДЛЯ АНІ БАХУР

## ЗАРАБІЦЬ ГРОШЫ ІНВАЛІДУ ПЕРШАЙ ГРУПЫ ДАПАМАГАЕ БРЭСЦКАЯ МАЙСТЭРНЯ «КЕРАМАРТ»

**Пра Ганну Бахур з Івацэвіч у нашай газеце расказвалася 3 верасня мінулага года ў артыкуле «Хэпі-энд з сумным асадкам». Інвалід першай групы тады ўсімі сіламі змагалася за тое, каб ёй пакінулі нованароджанае дзіця. Аня два месяцы знаходзілася ў бальніцы, дзе чакала вырашэння свайго пытання. Летам у 37-гадовай жанчыны нарадзіўся сын, і яшчэ ў раддоме ёй аб'явілі, што дзіця, хутчэй за ўсё, забяруць. Ёсць адпаведны дакумент Міністэрства аховы здароўя, дзе сказана, што інваліды першай групы не могуць выконваць бацькоўскія абавязкі. Ганну прывезлі з Брэста, дзе яна нараджала, у Івацэвічы, шпіталізавалі ў дзіцячае аддзяленне раённай бальніцы, якое забаранілі пакідаць без спецыяльнага дазволу.**



Маладую маці наведалі прадстаўнікі сацыяльных службаў з прапановамі па ўладкаванні сына ў прыёмную сям'ю альбо інтэрнатную ўстанову. Са сродкаў масавай інфармацыі гісторыя атрымала вядомасць у краіне. Было зламана шмат коп'яў у спрэчках. Але ўсё скончылася добра. Шчаслівая маці ўдзячная найперш міністру працы і сацыяльнай абароны Марыяне Шчоткінай, якая тады менавіта па яе пытанні прыязджала ў Івацэвічы, удзячная таксама ўсім знаёмым і незнаёмым людзям, якія яе падтрымлівалі.

Зараз Ганна гадуе свайго сыночка, яму ўжо крыху больш за паўгода. Даглядаць малога дапамагаюць нянькі, стаўку для іх у сацыяльнай службе прызначылі спецыяльным рашэннем райвыканкама.

Жыццёвая гісторыя Ганны Бахур вартая, відаць, цэлага тэлесерыяла, не надта вясёлага, але ж цалкам жыццесцвярджальнага. Мабыць, ён стаў бы карысным для тых, хто мае здаровыя рукі-ногі, але пакутуе рознымі дэпрэсіўнымі праяўленнямі на глебе пошуку сэнсу жыцця і свайго месца ў свеце...

Дык вось, калі ў адной жанчыны нарадзілася дзяўчынка з анамаліямі канечнасцяў, а дакладней — без кісцяў рук і амаль без ступні, маці адмовілася ад немаўляткі ў радзільным доме. Так бывае. Дзіця накіравалі ў адпаведную ўстанову. Дзяцінства, юнацтва, лепшыя гады маладосці Аня правяла ў Гарадзішчанскім доме-інтэрнаце Баранавіцкага раёна. Там навучылася многаму, напрыклад шыць і маляваць. Можа здацца дзіўным у яе стане, але Ганна спраўляецца фактычна з любой жаночай работай. Яна даглядае агарод, на зіму рыхтуе розныя агуркі-салаты ды варэнне. Усё як ва ўсіх — вызначае яна стан сваёй хатняй гаспадаркі.

А яшчэ інвалід першай групы вельмі любіць маляваць. Вядома, яна самавучка, і карціны піша, як ёй падказвае душа і натхненне. Больш за ўсё любіць адлюстроўваць прыроду. Пейзаж паступова стаў любімым жанрам самадзейнай мастачкі. А вось у Даніі, дзе сябрам удалося прадаць некалькі карцін івацэвіцкага майстра, просяць памяняць рэалістычны кірунак і звярнуцца да абстракцыянізму. Часам у яе атрымліваецца напісаць абстракцыю, але праходзіць некалькі дзён, і зноў з-пад пэндзля выходзіць яблынька, уся ў кветках, як малаком аблітая. Ну што тут скажаш, хіба згадаеш паэта: «І тчэ, забыўшыся рука...»

Цяпер у Ганны Бахур ёсць сябры ў Даніі, Польшчы, Літве, Расіі. Дабрачынныя фонды гэтых краін арганізоўвалі падарожжы і экскурсіі для нашых інвалідаў, бывала там і Аня.

Яна рада, што яе мастацтва не раз атрымлівала прызнанне іншых людзей. Некалькі карцін цяпер ёсць у прыватных калекцыях аматараў жывапісу ў асобных еўрапейскіх краінах. У Расіі яна адзначана прэстыжнай міжнароднай прэміяй «Філантроп».

Прадаваць карціны ў сябе на радзіме пакуль не вельмі атрымліваецца. Бо палатно і фарбы цяпер дарагія, сабекошт аднаго пейзажа не выходзіць менш за 30-40 долараў, а прызначаць цану за адну работу яшчэ вышэйшую сэнсу няма. У нас, на жаль, не прынята купляць рэч, каб падтрымаць інваліда, ну не такая ў нас грамадская і грамадзянская свядомасць. Наш менталітэт фарміраваўся ў краіне, дзе «не было інвалідаў». Яны вымушаны былі сядзець у сценах сваіх кватэр альбо інтэрнатаў, пра іх рэалізацыю сябе ў жыцці, пра безбар'ернае асяроддзе не гаварылі наогул. Мабыць, іншаму ўспрыманню тых, хто побач з намі, але не такія, як мы, трэба вучыцца. Працэс жа навучання можа зацягнуцца на жыццё цэлага пакалення, а то і болей.



Дырэктар таварыства «Цэнтр маладзёжнай ініцыятывы» Васіль БАРЫСАЎ, які ўсё жыццё працуе з інвалідамі, з горыччу заўважыў, што на форумах дзясяткі, а то і сотні людзей выказваліся ў падтрымку Ганны, калі вырашалася пытанне пра яе дзіця. Некаторыя пісалі цэлыя трактаты на тэму міласэрнасці і спагады. Ды, на жаль, ніхто не здагадаўся тую самую спагаду матэрыялізаваць, гэта значыць, аказаць хоць маленькую, але канкрэтную дапамогу сям'і інвалідаў першай групы, якія зрабілі магчымае і немагчымае, каб адстаяць сваё права на бацькоўства.

Напрыклад, яшчэ да нараджэння сына Ганна і Анатоль самастойна адолелі рамонт кватэры ў старым доме. На дзве дапамогі па інваліднасці, згадзіцеся, гэта зрабіць не проста. Толькі Ганна, як правіла, нічога ні ў каго не просіць, не ў яе характары. Вось і цяпер яна хоча знайсці дадатковы заробак, каб годна ўтрымліваць сям'ю. Яна ўжо разлічвала: прыстойную дапамогу на малога будзе атрымліваць тры гады, а потым трэба разлічваць на свае сілы.

І ў гэтым ёй узяліся дапамагчы сябры па «Маладзёжнай ініцыятыве», з якімі Ганна супрацоўнічае многія гады. Яна не раз праходзіла рэабілітацыю ў цэнтры, структурным падраздзяленнем якога з'яўляецца «Майстэрня КерамАрт». У названай майстэрні працуюць інваліды, яны займаюцца выпускам сувенірнай прадукцыі. Тут вырабляюць керамічны посуд, гаршкі для кветак, магнікі і іншае. У асноўным гэта сувеніры з сімволікай Брэста, Мінска, Белавежскай пушчы, прыгожых і памятных мясцін Беларусі. Дык вось у майстэрні нарадзілася ідэя запусціць інтэрнэт-праект у падтрымку Ганны Бахур. «КерамАрт» гатовы вырабіць партыі кубкаў, на якіх нанесены выявы карцін самадзейнай мастачкі.



Праект назвалі «Кубак надзеі». Яго лёгка адшукаць у сецібе, там падрабязна расказваецца, як замовіць сувенір, можна выбраць кубак з карцінкай па сваім гусце. Ёсць розныя прапановы, але ў сярэднім кубак, у дадатак з магнікам, абыйдзецца ў 100 тысяч беларускіх рублёў.

— Арыгінальны сувенір з аўтарскім малюнкам можна набыць як для сябе, так і для падарунка сябрам альбо родным, — гаворыць Васіль Барысаў. — Такім чынам мажліва падтрымаць таленавітых людзей з абмежаванымі магчымасцямі і зрабіць добрую справу. Патэнцыйнаму пакупніку варта ўлічваць, што кожны кубак будзе выраблены для яго, з улікам яго пажаданняў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# СПАДЧЫНА, ЯКАЯ ВАБІЦЬ

**Як зацікавіць падлеткаў гісторыяй свайго краю? Ці тымі рамёствамі, што спакон веку займаліся іх продкі? Або лёсам людзей, якімі можна ганарыцца? Ды проста — арганізаваць конкурс, што дае магчымасць больш даведацца пра знаёмую-незнаёмую спадчыну. Дарэчы, менавіта так — «Спадчына» — і называлася спаборніцтва, праведзенае Гомельскай абласной арганізацыяй Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».**

Абласны конкурс па патрыятычным выхаванні прайшоў трэці раз, і сёлета, у Год культуры, яго асноўнай тэмай стала захаванне культурных традыцый. За перамогу змагаліся больш за 200 навучэнцаў і выкладчыкаў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Гомельшчыны. Дзеці, якія атрымліваюць рабочыя спецыяльнасці, і іх настаўнікі прадэманстравалі, наколькі шырокае кола іх інтарэсаў.

Напрыклад, Ігар ХАДАНОВІЧ, які вучыцца ў Гомельскім дарожна-будаўнічым каледжы, зрабіў сапраўднае навуковае даследаванне, прысвечанае гісторыі вышывання ў яго роднай вёсцы Дубавіца на Кармяншчыне. Хлопец пагутарыў з жыхаркамі свайго населенага пункта, якія і расказалі юнаку гісторыі, старанна занатаваныя ў даследчай працы.

*«Вышыўка і ткацтва складалі адны з асноўных жаночых заняткаў, дзякуючы якім сям'я забяспечвалася адзежай і тканінамі. З успамінаў Петрачэнкі Таццяны Еўдакімаўны 1936 года нараджэння: «Зямлі тады было мала. Лён сеялі самі. Спачатку ткала мая маці, а ўжо ў 17-18 гадоў сама спрабавала ткаць. Вышывалі з ранняга дзяцінства, з 9-12 гадоў. У нас у Карме быў цэх. Мая цётка Аксіння, якая была брыгадзірам, так яна хадзіла ў Карму пешшу і прыносіла вышываць. Вышывалі касавароткі, сукенкі з узорамі, шмат чаго. Тканіну мы бралі з цэха. Гэта рабілі на заказ. Плацілі і да 5 рублёў. Па тых часах гэта былі добрыя грошы. Можна было за дзень вышыць некалькі кашуль: усё залежала ад складанасці ўзору».*



**Раман БРОДНІКАЎ узнагароджаны за даследчую работу «Развіццё кавальскай справы».**

*Раней для атрымання каляровых нітак і тканіны выкарыстоўвалі натуральныя прыродныя фарбавальнікі. Дубовай карой, шалупіннем цыбулі тканіну фарбавалі ў карычневыя колеры, кара крушыны і алешыны і чорныя ягады бузіны давалі чырвоны колер, сцёблы малачаю, лісце крапівы — зялёны, васількі, браткі, спарыш — сіні. Для замацавання колеру карысталіся капусным расолам, кіслай сыроваткай ці настоем попелу».*

Сваю навуковую працу Ігар заканчвае словамі адной з аднавяскоўак: «Толькі дзякуючы ткацтву і вышыўцы мы змаглі выжыць пасля вайны...»

Між тым, кожны з удзельнікаў мог выбраць тэму, якая блізкая менавіта яму і тычылася таго рэгіёна, дзе знаходзіцца ўстанова адукацыі або жыве навучэнец ці педагог. Выкладчыкі зрабілі свой значны ўнёсак і як вынік — адпаведныя намаганням узнагароды. Намеснік дырэктара Калінкавіцкага аграрна-тэхнічнага ліцэя Канстанцін Іванін, разбяр-віртуоз па сумяшчальніцтве, прадэманстраваў «Другое жыццё дрэва» і атрымаў заслужаны гран-пры.

У намінацыі «Край, у якім я жыву» вышэйшая ўзнагарода дасталася Гомельскаму каледжу народных мастацкіх рамёстваў. Дыпломамі былі ўзнагароджаны сем устаноў прафтэхадукацыі ў конкурсе дэкаратыўна-прыкладной творчасці. А аўтарам лепшай творчай работы прызнаны навучэнец Светлагорскага індустрыяльнага каледжа Валерый АЛЕКСАШОЎ. Яго эсэ, напісанае на беларускай мове, таксама неабходна працытаваць:

*«Пішу пад свежымі ўражаннямі ад сустрэчы з ветэранам вайны. У клас увайшоў чалавек каля дзевяноста гадоў. Усе падняліся, прывіталіся. І пачалася размова. Уразіў закалены дух сапраўднага героя, які мужна абараняў наш родны край, нашу палескую краіну, наш родны горад. «Падчас расправы быў паранены ў галаву. Заліваючыся крывёй, нерухома ляжаў на снезе і бачыў такое, што забыць ужо не змагу ніколі, — расказваў госць Тарас Каляснёў. — Вось вядуць чарговую групу маіх аднавяскоўцаў, чалавек сорак, сярод іх пазнаю жонку і дзяцей. Жонка з малодшым сынам ідзе ззаду. Азіраецца, пэўна, шукае мяне. За метраў дваццаць, на кургане, стаіць нізенькі тоўсты афіцэр. Ён увесь час нешта крычыць. Канвойныя кінуліся ў бакі ад людзей і пападалі ў снег — афіцэр у той час шпурнуў гранату ў натоўп».*

Цікава чытаць разважанні гамяльчаніна Максіма ГУСАКОВА, які вучыцца ў Гомельскім каледжы-філіяле Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Пятнаццацігадовы падлетак зацікавіўся гераічным лёсам Барыса Царыкава, у гонар якога названая адна з вуліц абласнога цэнтра. А пачалося ўсё так:

*«Вучуся ў каледжы, а па вечарах з сябрамі рэжуся ў «танчыкі», часам — у «Авіяналёт», увогуле, усё як ва ўсіх: звычайны горад, бацькі, вучоба, комп, часам — вылазка ў кіно. Самы вялікі стрэс для мяне — гэта сітуацыя «забыўся мабільны дома». Усё так і было да апошняга моманту. Пакуль мой дзед не кінуў фразу: «Падумаеш, мабільнік ён забыўся, а ты паспрабуй, як Царыкаў, здзейсніць подзвіг». У выніку, чытаю гісторыю Барыса Царыкава, Героя Савецкага Саюза... Чытаю і разумею, што Боры ўсяго было 15, калі ён страціў бацьку, а маці з малодшым братам забралі гітлераўцы. Усяго 15, калі ў яго на вачах забілі роднага дзеда і ён збег у партызанскі атрад. Усяго 16, калі ён стаў разведчыкам і атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга. Усяго 16, калі ў кастрычніку 1943-га зусім хлапчуком некалькі разоў пераплываў ледзяныя воды Дняпра каля роднага горада Лоева, здабываючы неабходныя звесткі пра праціўніка, рызыкуючы жыццём. Дзякуючы чаму быў паспяхова фарсіраваны Дняпро, і Барыс узняў Чырвоны сцяг на вызваленай тэрыторыі. Але, на жаль, 13 лістапада 1943 года хлопца не стала».*

І хто цяпер скажа, што ў нас дрэнная моладзь? Дарэчы, дзякуючы ў тым ліку праведзенаму конкурсу, дзеці пачалі глыбей асэнсоўваць свет. Начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкама Сяргей ПАРОШЫН адзначае важнасць мерапрыемства для развіцця патрыятычнага выхавання моладзі:

— Фарміраванне правільнага стаўлення да гісторыі, матэрыяльнай спадчыны, удзел у работах дазваляе выхоўваць у маладых людзей такія якасці, як любоў да радзімы, сваіх блізкіх, садзейнічае паразуменню паміж пакаленнямі.

— Яны хочуць рэалізавацца ў гэтым свеце, — падкрэслівае і намеснік старшыні Гомельскай абласной арганізацыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Наталля МАМРУКОВА. — Акрамя таго, што падлеткі, удзельнікі нашага конкурсу, атрымліваюць рабочыя спецыяльнасці, яны вельмі зацікаўленыя і творчыя людзі. І некаторыя свае ўнікальныя здольнасці змаглі прадэманстраваць дзякуючы арганізаванаму спаборніцтву.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ На сувязі

# 3G-сетка новага стандарту

**Мабільны аператар velcom першым запусціў у Мінску тэхналогію UMTS-900. Базавыя станцыі ў гэтым стандарце пачалі працаваць у паўднёвай частцы горада, паведамілі ў прэс-службе кампаніі.**

З'яўленне тэхналогіі UMTS-900 у Мінску паскорыць развіццё мабільнага інтэрнэту. Акрамя таго, ствараецца аснова для нарошчвання сярэдняй хуткасці доступу ў інтэрнэт, што магчыма за кошт камбінавання некалькіх частотаў.

У дзень запуску 3G-сетка ў дыяпазоне 900 Мгц стала даступная большасці жыхароў Лошыцы і Курасоўшчыны. Базавыя станцыі пакрываюць як забудову спальных раёнаў, так і прылеглыя тэрыторыі за кальцавой дарогай. Мабільны інтэрнэт стаў прыкметна лепш працаваць унутры памяшканняў у месцах шчыльнай гарадской забудовы і на цокальных паверхах будынкаў. Абаненты ўжо адчулі змяненні: узрасла сярэдняя хуткасць мабільнага інтэрнэту, павысілася якасць злучэння.

Базавыя станцыі UMTS-900 неўзабаве будуць запушчаны і ў іншых раёнах горада. Па планах мабільнага аператара поўнае абнаўленне 3G-сеткі зойме паўтара месяца — усе работы павінны быць завершаны ў красавіку. Найбольшую карысць укараненне новага стандарту прынясе абанентам, якія з-за знешніх фізічных перашкод не маглі карыстацца добрай 3G-сувяззю. Так, indoor-пакрыццё 3G-сеткі ўзрасце ў Мінску да 99,3%. Але паляпшэнні заўважаць і абаненты, якія выкарыстоўваюць мабільны інтэрнэт у месцах з якасным пакрыццём базавых станцый UMTS-2100.

Раней аператар velcom уключыў базавыя станцыі ў дыяпазоне 900 МГЦ у Дзяржынску. На першым этапе таксама плануецца забяспечыць пакрыццё сеткі ў новым стандарце на буйных магістралях Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Да канца года ахоп 3G-сеткі вырасце больш чым у два разы — з 46,3% да 97%. Высакахуткасны інтэрнэт стане даступны не толькі ў гарадской, але і ў сельскай мясцовасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# РАСІЯНЕ ВЕЗЛІ ПАТРОНЫ

**Трох расійскіх паляўнічых затрымалі ў зоне радыеактыўнага забруджвання на тэрыторыі Добрушскага раёна.**

— Мужчыны ехалі на двух аўтамабілях і перавозілі больш за сотню патронаў да наразной і гладкаствольнай зброі. Усяго дзяржінспектары знайшлі і канфіскавалі 109 кулявых патронаў і 13 патронаў з карцеччу, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Па словах расіян, яны прыехалі паляваць у прыгранічную вёску Дабрадзееўку, там жа пакінулі сваю зброю, а самі ў пошуках дзікіх жывёл накіраваліся па тэрыторыі Беларусі да расійскага анклава. За незаконнае перамяшчэнне боепрыпасаў у дачыненні да парушальнікаў можа быць заведзена крымінальная справа. Да завяршэння праверкі іх аўтамабілі канфіскаваныя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Ёсць пытанне

# З «МЕТАЛІЧНЫМ» ПРЫСМАКАМ,

## або Чаму станцыі абезжалезвання не заўсёды вырашаюць праблемы з вадой

**Аграгарадок Усход, што ў Магілёўскім раёне, — цэнтр гаспадаркі з аднайменнай назвай, сімпатычны ў многіх адносінах. Сасновы бор падступае амаль да жылых шматпавярховікаў, побач маляўнічае возера — жыві, здавалася б, і радуйся. Вось толькі з вадой не пашанцавала. Колькі існуе гэты населены пункт, столькі ж тут наракаюць на яе якасць. Насельніцтва перыядычна скардзіцца ў розныя інстанцыі, а нядаўна на электронную пошту рэдакцыі прыйшоў ліст ад мясцовага жыхара, які эмацыянальна выказаўся на гэты конт.**

### ЛЫЖКА ДЗЁГЦЮ

Год таму мужчына атрымаў ключы ад новай кватэры, але хутка радасць змянілася расчараваннем... 



**Абураны жыхар новабудоўлі страціў ужо 9 мільёнаў на гэтых фільтрах.**

дзяржавай нормаў. У тым ліку і па вадзе. Той відэаролік, які прадэманстравала жанчына, уражвае. «На жаль, немагчыма «запісаць» пах, — абураецца яна. — Такое адчуванне, што ў гэтую ржавую вадкасць трапляюць яшчэ і каналізацыйныя стокі».

**Акрамя гэтага, ёсць прэтэнзіі і да ПМК, якая будавала дом. Год прайшоў пасля яго здачы ў эксплуатацыю, а дах ужо працякае. Што далей будзе?**

Праблема, між тым, не абмяжоўваецца адной бруднай вадой. Аўтар ліста сцвярджае, што жыхары пераплачваюць за гарачую ваду, тэмпература якой ніжэйшая за сацыяльныя 50 градусаў. Акрамя гэтага, ёсць прэтэнзіі і да ПМК, якая будавала дом. Год прайшоў пасля яго здачы ў эксплуатацыю, а дах ужо працякае. Што далей будзе?

Начальнік участка жылкамгаса згодны, што праблемы з вадой ёсць. Але не ў такіх маштабах, пра якія напісаў заяўнік. Пытанне вырашаецца, праўда, не так хутка, як гэтага хацелася б. Што да тэмпературы вады, то тут ёсць свае нюансы. Па дарозе з кацельні ЦЭЦ-2 да цэнтральнага цеплавога пункта аграгарадка вада крыху ахалоджваецца, а таму і ў дамы трапляе з меншым градусам. Але ў ванных пакоях дома, дзе жыве аўтар скаргі, прадугледжаны змеевікі, якія павінны даваць вадзе дадатковае цяпло. Проста гэты патэнцыял не выкарыстоўваецца.

— Дом толькі напалову заселены, таму і тэмпература вады ў кранах ніжэйшая, — кажа суразмоўца. — Жыхары атрымалі ключы год таму, але пераязджаць не спяшаюцца. Як, дарэчы, і плаціць за «камуналку». Вось паглядзіце на гэты стос «жыровак». У некаторых па некалькі мільёнаў доўгу. Трэба ж сумленне мець.



**І на пад'езд да новага дома не хапіла грошай.**

### ДОМ НА ГАРАНТЫІ, А ПАДРАДЧЫК... БАНКРУТ

Дом, дзе жыве сям'я, пабудаваны магілёўскай ПМК-270. На працягу 5 гадоў будынак на гарантыі, а значыць усе недаробкі ліквідуюцца за кошт падрадчыка. Але прадпрыемства, мякка кажучы, загадала доўга жыць. Яно абанкруцілася, і цяпер яго паўнамоцтвы выконвае Магілёўаблсельбуд. Як **запэўнівае начальнік ЖЭУ жылкамгаса Магілёўскага раёна Дзмітрый ЗАІКІН,** тут не адмаўляюцца ліквідаваць дэфекты. І пра дах, які працякае, ужо ў курсе, кажа ён. Як толькі складуцца спрыяльныя ўмовы надвор'я, праблему ліквідуюць.

З тэмпературай гарачай вады, сведчыць Дзмітрый Заікін, таксама праблем не павінна быць. Сумесна з прадстаўнікамі Магілёўскіх гарадскіх цеплавых сетак было зроблена рэгуляванне сістэм падагрэву вады на мясцовым ЦЦП. Сістэма разлічана на тую нагрузку, што існуе. Калі будуць узнікаць нейкія непаразуменні, іх можна будзе без праблем вырашыць сваімі сіламі.

Якасць вады, як абяцаюць адказныя асобы, таксама хутка палепшыцца. У сакавіку ў Усходзе павінна ўступіць у строй станцыя абезжалезвання, але мясцовае насельніцтва чамусьці гэта не вельмі абнадзейвае. У Вільчыцах яшчэ пазалетась паспрабавалі запусціць, а толку?



**Дом новы, а дах ужо цячэ.**

«Месяц жыхары карысталіся чыстай вадой, і ўсё, — паскардзілася адна з жыхарак вёскі. — Стаіць сабе станцыя і... не працуе. Кажуць, што санслужба забараніла».

Гэта пытанне непакоіць і жыхароў Усходу. Некаторыя наогул сумняваюцца ў магчымасцях самой станцыі. Той жа аўтар ліста ў рэдакцыю патраціў на індывідуальныя фільтры 9 мільёнаў, але яны не вытрымалі такога выпрабавання жалезам і хутка выйшлі са строю.

### ДЗЕ ЗНАЙСЦІ ВЫЙСЦЕ?

Спецыялісты суцяшаюць, што фільтры на станцыі моцныя, бытавыя з імі нельга параўноўваць. Адна ж з прычын, якая перашкаджае працаваць станцыі ў Вільчыцах, — фінансавая, не хапае каля 25 мільёнаў, каб разлічыцца з віцебскім пастаўшчыком. А без грошай той не вельмі спяшаецца рабіць наладку. Ёсць і іншыя прычыны, але пра іх заказчык гэтага аб'екта — УКБ Магілёўскага райвыканкама — расказваць не жадае.

**У сакавіку ў Усходзе павінна ўступіць у строй станцыя абезжалезвання, але мясцовае насельніцтва чамусьці гэта не вельмі абнадзейвае.**

У Магілёўскім занальным цэнтры гігіены і эпідэміялогіі абвяргаюць той факт, што «табу» на работу станцыі накладзена менавіта іх службай. «Станцыя ў Вільчыцах па праекце павінна была ўступіць у строй яшчэ 5 гадоў таму, але мы нават яшчэ не прымалі гэты аб'ект, — паведаміў **галоўны ўрач установы Вячаслаў ШУЛЯК.** — Што датычыцца станцыі ва Усходзе, то там яшчэ вядуцца пуска-наладачныя работы. Плануецца, што ў сакавіку абодва гэтыя аб'екты здадуць. Але калі не будуць забяспечаны неабходныя параметры — 0,3 міліграма жалеза на літр, — ні пра які запуск не будзе ісці і гаворкі. Дарэчы, без ачысткі ўзровень жалеза ў вадзе па Магілёўскім раёне складае 1,5 міліграма на літр».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Падзея

# «МІЛЫ ЧАЛАВЕК» І ПЯКУЧАЯ САТЫРА

**Заўтра, 3 сакавіка, у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пачынае сваю працу міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларуская літаратура ў культурнай прасторы сучаснага грамадства», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы.**

Легендарны драматург, паэт-байкапісец, аўтар неўміручых камедый, пражыў багатае на падзеі жыццё. За плячыма ў яго — розныя сацыяльныя і палітычныя часіны, мноства публікацый, у кожнай з якіх ён імкнуўся адпавядаць часу. І разам з тым класік і цяпер запатрабаваны. Праз прызму прыдуманых і падгледжаных ім мастацкіх вобразаў і сімвалаў можна ўважліва ўзірацца і ў сучасныя пераўтварэнні грамадскага мыслення, рабіць высновы пра тыя ці іншыя хібы і з'явы. Калі пастаянна перачытваць Кандрата Крапіву, то, несумненна, у многіх яго творах можна знайсці адпаведныя часу сатырычныя, гумарыстычныя лекі. Тады і маскі мілага чалавека ў яго п'есе «Мілы чалавек» будуць зразумелымі і пры патрэбе раскрытымі. Тады і светапогляд беларуса ў рамане «Мядзведзічы» не будзе чымсьці абстрактным. А што ўжо казаць пра тое, колькі сучаснага матэрыялу сустрэне ўважлівы чытач у камедыі «Хто смяецца апошнім»...

У канферэнцыі, якая будзе працягваць сваю работу і 4 сакавіка, прымуць удзел вучоныя з універсітэтаў, акадэмічных інстытутаў не толькі Беларусі, але і з Украіны, Польшчы, ЗША.

**Сяргей ЗАЛАМАЙ.**

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ
№ 3 (21)

# НА ВАРЦЕ ПРАВА І ПАРАДКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хоць ёсць і такія, якія іначай, як інфармацыйнай атакай на Міністэрства ўнутраных спраў не назавеш. На маю думку, гэта інфармацыйная вайна з усімі наступствамі, інструментарыямі. Што з гэтым рабіць? Ваяваць, безумоўна, міністэрства ні з кім не будзе. Мы выконваем свае абавязкі максімальна прафесійна. Да любой канструктыўнай крытыкі паставімся з павагай, а калі нас правакуюць, хамяць, спрабуюць ілюстраваць наш прафесіяналізм менавіта дэструктыўнымі спосабамі, будзем усё адно рэагаваць цывілізавана. У тым ліку з выкарыстаннем механізму прававой абароны супрацоўнікаў МУС, павышэннем прафесіяналізму мы здолеем адэкватна адказаць на неардынарныя паводзіны нашых грамадзян.

### ЗАРОБКІ І ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ

— Памяншэння заробкаў у міліцыі не адбылося і падобнае не плануецца. Аднак дзякуючы эканоміі мы нават маем невялічкую магчымасць павялічваць заробкі тым, хто гэтага заслугоўвае. Але я не думаю, што супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў змены ў матэрыяльным дастатку ставяць вышэй за ўсё пры ацэнцы сваёй дзейнасці. Усё ж такі пераважная большасць міліцыянераў працуе найперш з разуменнем таго, што яны выконваюць сур'ёзную мужчынскую работу. Да любых змен у пенсійным узросце мы таксама гатовы, і я лічу, што гэты працэс непазбежны.

### ПРАБЛЕМНЫЯ ДЗЯРЖЗАКУПКІ

— Сфера дзяржзакупак з'яўляецца крыміналагеннай ва ўсім свеце. І мы не выключэнне. Гэтую праблему спрабуюць рэгуляваць нарматыўна, але пытанні ўсё роўна застаюцца. Каля 90 працэнтаў дзяржзакупак, якія адбываюцца ў нашай краіне, — набыццё з адной крыніцы, што не вельмі правільна. Пры іх бюджэтныя сродкі не заўжды выкарыстоўваюцца эфектыўна. І ў рэчышчы нядобрасумленнай канкурэнцыі праводзяцца 10 працэнтаў такіх працэдур, якія могуць мець пад сабой карупцыйную глебу.

### ПЛАНУЕМ УСТАНАВІЦЬ ПОМНІК ГАРАДАВОМУ

— У наступным годзе міліцыя адзначыць стагадовы юбілей. Да святкавання пачалі рыхтавацца загадзя, бо разумеем, гэта будзе не толькі міліцэйскае свята, але і цікавая дата для многіх нашых суайчыннікаў. Плануем зняць кіно, выпусціць кнігу па гісторыі міліцыі, адліць юбілейны медаль, устанавіць невялічкі помнік гарадавому ў Мінску ў стылі гарадской скульптуры. Акрамя таго, мы хочам аддзячыць нашым ветэранам, тым, хто ствараў міліцыю і ў самыя складаныя часы застаўся верны пагонам.

### «ЗАКОН БУДЗЕ РЭАЛІЗАВАНЫ ТАДЫ, КАЛІ ЗНОЙДЗЕ ПАДТРЫМКУ Ў НАРОДЗЕ»

— Прапанова лібералізаваць адміністрацыйнае заканадаўства зроблена на аснове глыбокага аналізу правапрымяняльнай практыкі, ацэнкі ўсіх выклікаў і пагроз, якія існуюць у нашай краіне ў гэтай сферы. Да апытання мы далучылі нашых грамадзян. Я наогул лічу, што заканадаўчая ініцыятыва можа быць рэалізавана толькі тады, калі будзе падтрымана народам. У абмеркаванні лібералізацыі ўжо паўдзельнічала каля 60 тысяч чалавек. Ініцыятывы насамрэч атрымалі жывы водгук. Некаторыя ідэі МУС знайшлі адназначную падтрымку, а некаторыя — не вельмі. Многія з прапаноў мы проста прынялі да ўвагі, бо гэтыя пытанні (дарожны збор, тэхагляд) знаходзяцца не ў нашай кампетэнцыі. Мы іх перадалі ў адпаведныя ўстановы. У нас атрымаўся сапраўдны зрэз грамадскай думкі. І я спадзяюся, што на асенняй сесіі парламента мы здолеем унесці прапановы ў шэраг артыкулаў законапраекта па лібералізацыі адміністрацыйнага заканадаўства.

### «Я СУПРАЦЬ ПРОДАЖУ АЛКАГОЛЮ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ»

— За апошнія пяць гадоў колькасць злачынстваў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення, зменшылася з 27 тысяч да 17,5 тыс. Менавіта столькі зафіксавалі праваахоўнікі ў 2015 годзе. Але гэта часовы поспех. Я баюся таго, што ў выніку адмены некаторых санкцый сінусоіда злачынстваў папаўзе ўгару. Я не магу сказаць, што мы зрабілі ўсё дзеля дэалкагалізацыі насельніцтва. І наша міністэрства надалей збіраецца выступаць з шэрагам ініцыятыў, каб зменшыць даступнасць алкаголю. Паводле маёй ацэнкі, сёння даступнасць алкагольных вырабаў даволі высокая. І яе абмежаванне — тое, чым мы будзем займацца ў найбліжэйшы час. Якія метады і сродкі будзем ужываць для дасягнення мэты? Над гэтым мы пакуль працуем, і паверце, маем некалькі козыраў у рукаве. Што тычыцца дастаўкі алкаголю праз інтэрнэт, я лічу гэта адным з элементаў чартаўшчыны, і я катэгарычна супраць падобнага спосабу дадатковага спойвання насельніцтва.

### «КУРЫШ У ФОРМЕ — АТРЫМАЕШ ДЫСЦЫПЛІНАРНАЕ СПАГНАННЕ»

— Каментаваць сваіх калег, якія выйшлі на злачынны шлях, вельмі складана. Але па ўнутранай бяспецы МУС хачу сказаць наступнае. З ёй праблема ёсць, аднак над яе вырашэннем працуе цэлая служба. Паверце, я, як міністр, удзяляю яе дзейнасці вялікую ўвагу. Шкода, якую прыносіць злачынца ў пагонах, гэта не проста лыжка дзёгцю, гэта цэбар халоднай вады, які выліваецца на нашы плечы. Статыстыка гэтага самаачышчэння ад злачынцаў у пагонах не радуе. І мы самастойна выяўляем шмат супрацоўнікаў, якія здзяйсняюць адміністрацыйныя правапарушэнні. Між іншым у нашай сістэме дзейнічаюць некалькі непарушных правілаў для выканання. Напрыклад, сеў п'яны за руль — будзеш звольнены. Выйшаў у форме з цыгарэтай на вуліцу — як мінімум дысцыплінарнае спагнанне. Магчыма, гэта і штампы, але без іх нікуды не пойдзеш. Цалкам перамагчы карупцыю ў пагонах яшчэ ні ў каго не атрымалася, аднак мы стараемся звесці яе да мінімуму. І пэўныя рэчы ў нас атрымліваюцца.

### ПАРАДАК НА СТАДЫЁНАХ БУДЗЕ Ў ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ

— Наўрад ці ўжо сёлета міліцыянераў на трыбунах стадыёнаў заменяць сцюарды (валанцёры, якія адсочваюць парадак на арэнах, не з ліку праваахоўнікаў. — **Аўт.**), хоць падобныя ідэі былі. Мы лічым, што супрацоўнікаў органаў унутраных спраў у чашах стадыёнаў быць не павінна. Гэта сусветная практыка, калі за бяспеку адказваюць арганізатары спаборніцтваў і сцюарды. Шмат у чым яны вырашылі б праблемы і ў нас. Міліцыянер ён на тое і міліцыянер, каб рэагаваць на парушэнні. І ў ідэале на стадыёны мы павінны прыбываць па просьбе арганізатараў. Сёння падобнага няма. Некаторыя нашы прапановы пакуль не падтрыманы, і мы нясём службу на стадыёнах.

Што да наведвання масавых мерапрыемстваў, яно залежыць ад узроўню адказнасці. Балельшчыкам з аднаго боку патрэбна шоу, а з другога — бяспека. Яе мы можам забяспечыць. Усё астатняе ўжо залежыць ад спартсменаў. А ў нас няўдачы любяць спісваць на розныя пабочныя абставіны: засудзілі, надвор'е не тое, міліцыя вінавата, не пашанцавала. Часам атрымліваецца, што футбалісты гуляюць дрэнна, бо міліцыя кепска паводзіць сябе з фанатамі. І гэта даволі папулярная фармулёўка. Разам з тым я яшчэ раз падкрэслю, што мы знайшлі кропкі судакранання з федэрацыяй футбола, вынайшлі пэўны алгарытм, які задавальняе абодва бакі. Усё гэта будзе працаваць. І мне хочацца, каб мы рушылі насустрач адно аднаму. Аднак мы ніколі не пойдзем на аднабаковыя ўступкі. Мы можам дамовіцца аб правілах гульні і разам прытрымлівацца іх.

### «ГРОШЫ ПЕНСІЯНЕРАЎ — СПАКУСА ДЛЯ ЗЛАЧЫНЦАЎ»

— Пытанне бяспекі пенсіянераў даволі актуальнае для нас. На жаль, сёння моладзь не вельмі трапятліва ставіцца да пажылых. А яны ж самыя слабыя. У іх заўжды ёсць грошы, пенсія, што з'яўляецца вялікай спакусай для злачынцаў. Мы ўжо распрацавалі комплекс мер для абароны пенсіянераў. Будзем задзейнічаць участковых інспектараў, супрацоўнічаць з сельскімі старастамі, далучаць грамадства, каб людзі кантралявалі сітуацыю і дапамагалі нам інфармацыяй.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*



Фота Надзеі БУЖАН.

Балельшчыкам з аднаго боку патрэбна шоу, а з другога — бяспека.

■ Ёсць пытанне

# ЧЫМ ПАГРАЖАЕ НЯВЫПЛАТА АЛІМЕНТАЎ?

**Нядаўна да нас з пытаннем звярнуўся чытач, якога цікавіла, ці прымяняюцца ў Беларусі ў дачыненні да правапарушальнікаў такія меры пакарання, як грамадскія і папраўчыя работы. Гэты запыт мы перанакіравалі да Веранікі БЕЛЕНЬКАЙ, старшага інспектара Цэнтральнага РУУС г. Мінска.**



Фота Сяргея Нікановіча.

***— У чым сутнасць гэтых пакаранняў?***

— У сваёй рабоце я дзейнічаю ў двух кірунках: гэта грамадскія і папраўчыя работы. Паводле крымінальнага кодэкса, сэнс грамадскіх работ — у выкананні асуджанымі бясплатнай працы на карысць грамадству. Тэрмін падобнай меры — ад шасцідзесяці да двухсот сарака гадзін. Суд накіроўвае распараджэнне з копіяй прыгавору ў крымінальна-выканаўчую інспекцыю для далейшага выканання. Я стаўлю правапарушальніка на ўлік, а пасля размяркоўваю яго на працу, напрыклад, у жыллёва-эксплуатацыйную службу. Кожны тыдзень яны павінны адпрацаваць не менш за дванаццаць гадзін. Калі працуюць меней, ім выносяць афіцыйнае папярэджанне. Тры афіцыйныя папярэджанні з'яўляюцца падставай для завядзення крымінальнай справы, бо чалавек ухіляецца ад пакарання і замест грамадскіх работ назначаецца арышт. Нам вельмі важна, каб людзі працавалі, бо ў іншым выпадку пачынаюцца бойкі, п'янкі, крадзяжы... Праца робіць многіх дысцыплінаванымі.

Што тычыцца папраўчых работ, іх выконваюць ад шасці месяцаў да двух гадоў. У гэтым выпадку з заробку асуджанага ўтрымліваюць суму грошай, якая ўстаноўлена прыгаворам суда і складае не менш за адну базавую велічыню. Гэтыя грошы штомесяц павінны вылічваць з яго нага заробку.

***— За якія злачынствы выносяць прыгавор у выглядзе грамадскіх і папраўчых работ?***

— За тыя, якія не ўяўляюць вялікай небяспекі для грамадства. Напрыклад, нявыплата аліментаў, некаторыя дарожна-транспартныя здарэнні, дробныя крадзяжы... У мяне на ўліку стаяць пераважна мужчыны, але ёсць сярод іх і жанчына. Яна прысвоіла ў краме пакінуты чужы планшэт, але ўсё гэта зафіксавалі камеры відэаназірання. У выніку — шэсцьдзясят гадзін грамадскіх работ.

***— І як яна адпрацоўвае сваё пакаранне?***

— Працуе ў ЖЭСе. Прыбірае снег, смецце, старую лістоту. Саму працу для кожнага размяркоўвае майстар, і нашы падначаленыя не могуць адмаўляцца ад выканання сваіх абавязкаў. Пры адмове, як казала раней, выносяць папярэджанне. Многія з асуджаных маюць асноўную працу і адпрацоўваюць свае гадзіны ў вольны час: вечарам альбо ў выхадныя дні.

***— А ці не звальняюць за падобныя правапарушэнні з працы?***

— Мяркую, калі чалавек працуе ўжо доўга, добрасумленна выконвае абавязкі, яго звальняць не будуць. Наогул, скасаванне працоўных адносін адбываецца ў адпаведнасці з працоўным заканадаўствам нашай краіны. Хоць на працу аб правапарушэннях, безумоўна, паведамляюць.

***— Ці ёсць акрэслены тэрмін, за які чалавек павінен выканаць усе свае гадзіны?***

— Няма. У прыгаворы суда пазначаецца колькасць гадзін грамадскіх работ. Якасць выкананай работы, прыход і сыход у сваім журнале адзначае якраз майстар. Кожны месяц я забіраю гэты табель, праглядаю яго, вяду статыстыку. Многія паводзяць сябе адэкватна, імкнуцца як мага хутчэй справіцца з дадатковай нагрузкай.

***— А які самы складаны выпадак у вашай практыцы?***

— Мінулай вясной папраўчыя работы праходзіла маладая дзяўчына, якую пазбавілі бацькоўскіх правоў. З ёй было вельмі складана кантактаваць. Яна проста не была падрыхтаваная да працы і не хацела ёю займацца. Часта выпівала разам са сваім сужыцелем. Напачатку здавалася, што чалавек усё разумее, хоча змяніцца. Нават плакала, калі гутарка заходзіла пра дзіцё. Аднак як толькі сустракалася са сваім сябрам, усё пачыналася па-новаму.

***— Вы ж сваіх «падначаленых» таксама наведваеце.***

— Безумоўна. Але толькі ў тым выпадку, калі асуджаныя ўхіляюцца ад адбывання пакарання і іншым спосабам, як наведванне па месцы жыхарства, выйсці на кантакт з імі не атрымліваецца. Зразумела, я хаджу да іх не адна. І выпадкаў, калі б яны ставіліся да мяне з непавагай, не было. Фрывольнасцяў сабе не дазваляюць.

**Якаў ЖУРБІН**

■ Нашы дзеці

# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

## МУС сцвярджае, што патрэбны асобны закон аб абароне дзяцей ад хатняга гвалту і забароне фізічных пакаранняў

**У мінулым годзе 9256 дзяцей у Беларусі прызнаны пацярпелымі ад злачынстваў. Правы 7767 з іх былі ўшчэмлены праз ухіленне бацькоў ад выплаты аліментаў.**

Астатняя, здавалася б, не вельмі вялікая колькасць здарэнняў палохае сваім азначэннем і лічбавым ростам. За 2015-ы 113 дзяцей зазналі сексуальны гвалт (у 2014-м такіх было 96), 334 непаўналетнія пацярпелі праз хуліганства (гэтая лічба таксама пабольшала). 15 дзяцей былі забітыя, 11 атрымалі цяжкія цялесныя паходжанні, 21 — менш цяжкія. Зафіксавана 11 выпадкаў катавання і 41 пагроза забойства. Пры гэтым, як прызнаюць прадстаўнікі МУС, гэта далёка не поўныя лічбы, а толькі вяршыня айсберга.

Значная колькасць катаванняў, лёгкіх пашкоджанняў і пагроз забойства здзяйсняецца над дзецьмі членамі сям'і. Дзіцяці не трэба і на вуліцы апынацца ноччу, каб пацярпець праз хатняе насілле. Нават гвалтуюць дзяцей не толькі айчымы ці сужыцелі, а і родныя бацькі. Пад крымінальны артыкул падпадаюць і выпадкі, калі «каханне» адбываецца са згоды ахвяры. Як правіла, гэта сексуальныя кантакты з удзелам непаўналетняй асобы і чалавека, які старэйшы за падлетка літаральна на некалькі гадоў. У 2015-м адбылося 138 такіх выпадкаў, паведаміў журналістам прадстаўнік МУС.

*— У 2014 годзе ўступіла ў сілу новая рэдакцыя закона «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў», якой прадугледжаны шэраг мер па абароне членаў сям'і ад насілля, аднак трэба выйсці на самастойны закон аб папярэджанні насілля ў сям'і, — распавёў* **Алег КАРАЗЕЙ, начальнік упраўлення прафілактыкі Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.** *— У ім трэба прадугледзець павышаныя меры бяспекі ў дачыненні да ахвяры і рэабілітацыйныя паслугі. Рэгламентаваць работу па аказанні дапамогі дзецям, пацярпелым ад насілля ў сям'і. Прымаць прэвентыўныя меры да асоб, якія дапусцілі насілле.*

Супрацоўнікі міністэрства падрыхтавалі таксама праект закона аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у закон аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці правапарушэнняў непаўналетніх. Апроч іншага прапануецца вывесці з-пад пільнай увагі МУС правапарушальныя дзеянні дзяцей, якім не споўнілася 10 гадоў. Гэта тычыцца і тых, хто ўчыніў невялікае парушэнне, накшталт хаджэння без флікера ці дробнага парушэння правілаў дарожнага руху.

*— Цяпер мы вымушаны ставіць такіх дзяцей на ўлік, і бацькі крыўдзяцца на беспадстаўнасць прымянення такіх мер. Мы згодны, што адсутнасць флікера — перш за ўсё небяспека для самога дзіцяці, аднак не падстава для тэрміновай прафілактычнай працы з малым, — дадаў Алег Каразей. — Праз скарачэнне кантынгенту дзяцей, што стаяць на ўліку мы вызвалім сілы і сродкі на іншыя кірункі: работу ва ўстановах адукацыі і прафілактыку больш сур'ёзных парушэнняў.*

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Навіны «102»

# Ашукаў «партнёраў» на мільярд рублёў

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС г. Мінска за ўчыненне махлярскіх дзеянняў у асабліва буйным памеры затрыманы раней не судзімы 24-гадовы жыхар сталіцы.**

Падазраваны сцвярджаў, што з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам і актыўна развівае бізнес, звязаны з рэалізацыяй мабільных тэлефонаў. Маўляў, у яго ў Расіі шмат знаёмых пастаўшчыкоў, гатовых оптам прадаваць яму дарагую прадукцыю для наступнага перапродажу на тэрыторыі Беларусі. Аднак для пачатку хлопцу не хапала пэўнай грашовай сумы, якую ён пазычаў у сваіх знаёмых.

Працуючы такім чынам, «прадпрымальнік» сабраў пэўную суму грошай і набыў аўтамабіль, які перапрадаў пасля даражэй. Тады ж зламыснік прыняў рашэнне займацца «больш сур'ёзным бізнесам», пачаўшы займаць у людзей больш буйныя сумы грошай, прадстаўляючыся ім як «Жора». Для прэзентабельнасці ён браў у салоне пракату элітныя аўтамабілі і расказваў будучым «партнёрам», што яны набытыя ў Расіі ў два-тры разы танней, чым можна купіць на тэрыторыі Беларусі. Дарэчы, адзін з такіх пракатных аўтамабіляў быў разбіты кіроўцам на праспекце Пераможцаў у сталіцы.

Такім чынам затрыманы рэкламаваў свой бізнес патэнцыйным укладчыкам, а тыя, у сваю чаргу, разлічваючы на хуткі прыбытак, аддавалі ашуканцу грашовыя сродкі на закупку неіснуючага тавару. Свой незаконны даход махляр траціў на паездкі за мяжу, адпачынак у дарагіх рэстаранах і клубах. Аператыўнікамі ўстаноўлена, што ён завалодаў сумай каля мільярда рублёў. Паводле інфармацыі Савецкага РУУС, на рахунку махляра больш за 20 эпізодаў злачыннай дзейнасці. Цяпер высвятляецца датычнасць затрыманага да іншых магчымых эпізодаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Актуаліі

# УДАР ПА НАРКАДЫЛЕРАХ



**Праблема наркатызацыі нашага грамадства працягвае па-ранейшаму заставацца адной з самых актуальных. Штогод у Беларусі рэабілітацыйныя цэнтры прымаюць многіх нарказалежных, дзясяткамі судзяць наркадылераў і іх хаўруснікаў. Вось і зараз, калі вы, паважаны чытач, гартаеце свежы нумар «Звязды», у Мінскім гарадскім судзе ідзе працэс над 17 удзельнікамі буйнога наркасіндыката, лідар якога трымаў амаль увесь рынак псіхатропаў у краіне і ў лепшыя часы зарабляў па сем тысяч долараў у дзень. Пры гэтым, як адзначыў Васіль ЛОСІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС, ёсць у нас падставы і для аптымізму.**

## Інтэрнэт-распаўсюджвальнікі атрымалі па заслугах

Па-першае, на думку Васіля Лосіча, за 2015 год у Беларусі атрымалася стабілізаваць сітуацыю з крымінальнымі справамі, звязанымі з незаконным абарачэннем наркотыкаў. Па-другое, зменшылася колькасць пацыентаў з перадазіроўкамі псіхатропных рэчываў і лятальных канцоў, а па-трэцяе, прыняцце і дзейнасць антынаркатычнага дэкрэта, які зрабіў больш жорсткай адказнасць за нарказлачынствы, садзейнічала зніжэнню аб'ёмаў псіхатропаў на беларускім наркарынку.

— Летась, дзякуючы дэкрэту №6, нам удалося падарваць фінансавы складнік гандлю наркотыкамі, — кажа Васіль Лосіч. — Нормы законапраекта прадугледжваюць ідэнтыфікацыю нумароў электронных кашалькоў. І з 600 тысяч зарэгістраваных на буйным апературы EazyPay перарэгістрацыю прайшло менш за пяць працэнтаў уласнікаў. Можна ўявіць, колькі з кашалькоў выкарыстоўвалі ў супрацьпраўнай дзейнасці. У тым ліку, звязанай з распаўсюджваннем наркотыкаў. Лічу, што мы часткова вырашылі праблему распаўсюджвання наркотыкаў з дапамогай інтэрнэту. Не ўсе сайты мы можам закрыць, але летась абмежаваны доступ да 18 парталаў, на якіх былі паведамленні альбо матэрыялы, скіраваныя на незаконнае абарачэнне наркотыкаў. Некаторыя крамы працягваюць прадаваць наркотыкі, але іх не так шмат і пра ўсе мы ведаем, паступова закрываем. За год дзейнасці дэкрэта мы стабілізавалі сітуацыю. Яна, магчыма, яшчэ не пачала кардынальна паляпшацца, але не пагаршаецца тымі тэмпамі, якія былі дагэтуль.

Краінай, з якой у Беларусь пераважна ўвозяць наркотыкі, працягвае заставацца Расія. З суседняй тэрыторыі да нас дастаўляюць гашыш, амфетамін, марыхуану. З Заходняй Еўропы — усё той жа амфетамін, буйныя лабараторыі па вырабе якога знаходзяцца па суседстве — у Польшчы. Усё часцей у нашу краіну трапляе гашыш, прызначаны Расіі, з... Марока. І як лічыць Васіль Лосіч, гэта можа быць абумоўлена ў тым ліку няпростай палітычнай абстаноўкай у Еўропе.

Некаторыя наркотыкі адпраўляюць па пошце і, дзякуючы суправаджэнню карэспандэнцыі, летась у 78 адпраўленнях знайшлі насенне каноплі, грыбніцы са спорамі галюцынагенных грыбоў і кактусаў.

## У нас наркотыкі яшчэ не з'явіліся, але іх ужо забаранілі

Унікальнасць беларускага антынаркатычнага заканадаўства адзначае Генадзь Шаўлюкевіч, начальнік галоўнага ўпраўлення спецыяльных экспертыз Цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Працэдуру забароны аналагаў наркотыкаў праводзяць максімальна хутка — за суткі, а ў дачыненні да новых наркотыкаў — на працягу 5-7 дзён.

Супрацоўнікі Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз таксама пастаянна вывучаюць наркатычную сітуацыю ў суседніх краінах. Звесткі прыносяць плён.

— Па выніках маніторынгу мы ініцыіруем забарону новых наркотыкаў яшчэ да іх з'яўлення ў нашай краіне, — кажа Генадзь Шаўлюкевіч. — І ў 2015 годзе мы такім чынам выявілі 22 новыя небяспечныя рэчывы (зараз у забаронным спісе больш за 300 назваў. — **Аўт.**)

## Хто ён, наркаман?

Нягледзячы на пэўныя поспехі, ёсць рэчы якія прымушаюць не толькі задумацца, але і аператыўна дзейнічаць. Як адзначылі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, тэндэнцыя да амаладжэння наркаспажыўцоў нікуды не знікла. Падлеткі працягваюць даволі часта здзяйсняць нарказлачынствы. Закон цяпер дазваляе садзіць «за краты» за распаўсюджванне наркотыкаў нават 14-гадовых.

— На жаль, у гэту злачынную дзейнасць даволі часта залучаюць непаўналетніх, — заўважае Васіль Лосіч. — На сайтах, якія рэкламуюць наркотыкі, часта вярбуюць школьнікаў. Асабліва гэта было заўважна напярэдадні навагодніх канікулаў. Змест паведамленняў быў прыкладна наступны: вам за гэта нічога не будзе, але вы заробіце грошы. І мы сумесна з другімі ўстановамі працавалі, каб падобнае не дапусціць. Аднак, на жаль, такія факты былі.

Але сярэднестатыстычны нарказалежны ўсё ж такі больш сталага ўзросту. Іван Канаразаў, галоўны нарколаг Міністэрства аховы здароўя, агучыў псіхалагічны партрэт звычайнага наркамана. Гэта найчасцей мужчына. Яму ад 22 да 24 гадоў. Мае сярэднюю альбо сярэднюю спецыяльную адукацыю. Часцяком жыве адзін ці разведзены. Без пастаяннай працы. Звычайны наркаспажывец мае некалькі адміністрацыйных правапарушэнняў, схільны да агрэсіўных паводзінаў...

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

***P.S.* Падобны пералік гучыць так, як сухія лічбы статыстыкі, але за імі стаіць мноства зламаных наркадылерамі лёсаў, тых, хто назаўжды саступіў у гэтай барацьбе і ўжо не вернецца да нармальнага, адэкватнага жыцця. Вынікі, якія агучылі ў МУС, безумоўна, усцешваюць. Але ўсё роўна хочацца, каб дзеянні ў дачыненні да наркараспаўсюджвальнікаў заставаліся рашучымі, а пакаранні — больш жорсткімі. Можа хоць сумны прыклад «калег» у кагосьці адаб'е жаданне займацца такой паскуднай справай**

# ПРАВІЛЫ ПАД'ЁМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кожны ліфт праходзіць праз тэхабслугоўванне штомесяц. Раз на год у ім прызначаецца неабходны рамонт і тэхнічны агляд супрацоўнікамі Дзяржпрамнагляду ці арганізацый, якія маюць дазвол Дзяржпрамнагляду на яго правядзенне. Летась яны прыпынілі работу 118 ліфтаў з прычыны няспраўнасцяў, якія маглі паўплываць на бяспеку пасажыраў. На жаль, прысутнічаюць тут і арганізацыйныя моманты — чамусьці за ліфтам не замацоўваюць адпаведны абслуговы персанал. Калі гэта выяўляецца пры праверцы, то пад'ёмная машына работу часова спыняе.

— Здараецца так, што новы ліфт наладзілі, выпрабавалі, здалі, а пасля запуску ён пачынае перыядычна спыняцца, — працягвае Пётр Клімко. — Тут нічога дзіўнага няма — часцяком проста трэба пачакаць, пакуль усе дэталі пад'ёмніка «прытруцца» адна да адной. Але і якасць абслугоўвання адыгрывае тут далёка не апошнюю ролю. Чамусьці не бярэцца пад увагу і тое, што любы дом пачынае даваць усадку. З гэтай прычыны накіравальныя, па якіх едзе кабіна і якія спачатку былі роўныя, пасля крыху перакрывіліся, і ліфт пачынае шумець падчас язды і прастойваць. Не так даўно да нас звярталіся прадстаўнікі аднаго таварыства ўласнікаў. Прайшло пяць гадоў пасля здачы дома, і за апошнія паўмесяца пад'ёмнік стапарыўся некалькі разоў запар. Аказалася, што справа якраз-такі ў накіравальных. У тым доме 22 паверхі. А чым большы гмах, тым даўжэй ідзе працэс усадкі. Плюс побач з домам пачалі капаць катлаван, каб узвесці новую высотку. І гэта таксама можа ўплываць на стабільную работу ліфта.

## Самадзейнасць правакуе пажары

Кабіну тыповага савецкага ліфта памятаюць усе. Чамусьці для яе ўнутранага аздаблення выкарыстоўваліся матэрыялы згаральныя, напрыклад, ДСП ці ДВП. А на падлозе, як правіла, ляжаў лінолеум. Цяжка сказаць, якую мэту перaследавалі тагачасныя праекціроўшчыкі — выгадаць на грашах або зрабіць пад'ёмнік крыху эстэтычным. Вось толькі не ўлічылі яны адно вельмі важнае «але». Ліфт — прыбор электрычны, і пры няякасным абслугоўванні ён можа і загарэцца з прычыны кароткага замыкання. Ды і некаторыя жыхары любяць пакурыць у ім.

У 1990-я гады па краіне пракацілася хваля пажараў у пад'ёмніках. І таму кабіны ўсіх машын, выпушчаных у новым тысячагоддзі, зроблены з незгаральных матэрыялаў. Хоць ад «самадзейнасці» жыхароў не заўжды страхавала і гэта.

— Як вы думаеце, якая сувязь існавала раней паміж пажарамі ў ліфтах новабудоўляў і тэрмінам іх запуску? — пытаецца Пётр Клімко. — Здавалася б, узаемасувязі тут не павінна быць. Разгадка насамрэч вельмі простая. Пасля засялення дома на ліфт кладзецца каласальная нагрузка. Народ пачынае перавозіць літаральна ўсё: мэблю, будаўнічыя матэрыялы, буйнагабарытную тэхніку... А каб не сапсаваць новы пад'ёмнік, яго саматужна абшывалі якім-небудзь падручным матэрыялам, напрыклад, кардонам. Іншае пытанне, чаму гэта праходзіла міма абслуговых арганізацый. Нейкі курэц у ліфце зацягваўся цыгарэткай, іскра ляцела не туды — і ўсё...



## Рэгламент Мытнага саюза зробіць ліфты зручнымі...

Кабіна, зробленая з проціпажарных матэрыялаў, — гэта толькі адзін з пунктаў адпаведнага рэгламенту Мытнага саюза, у адпаведнасць з патрабаваннямі якога павінны быць прыведзены ўсе беларускія пасажырскія ліфты да 2020 года. Натуральна, што машыны, зробленыя яшчэ за савецкім часам, сучасным жорсткім стандартам бяспекі не адпавядаюць, бо рабіліся па тагачасных правілах. І нават калі б рэгламент ставіў больш працяглыя тэрміны рэалізацыі, ад масавай замены ўсё роўна нікуды не падзецца — нарматыўны тэрмін службы ў чвэрць стагоддзя адпрацавалі ўжо ўсе савецкія ліфты. На гэта накладваецца яшчэ і тое, што ў 1970-я і 1980-я гады ў Беларусі разгарнулася будаўніцтва цэлых вышынных мікрараёнаў. Да таго ж акцэнты пасля змясціліся ў бок 12-павярховых і нават вышэйшых гмахаў. А ў пад'ездах такіх дамоў стаіць ужо мінімум па два ліфты. Адпаведна, і выдаткі на іх замену таксама істотна ўзрастаюць.

Чаго ж чакаць жыхарам старых дамоў? Па-першае, зручнасці. Існуе жартоўная лагічная загадка пра карліка, які жыў на апошнім паверсе дома і на працу ехаў на ліфце, а калі падымаўся дадому, то некалькі паверхаў быў змушаны ісці пешшу, бо не дацягваўся да патрэбнай кнопкі. Смех смехам, але вось інвалідам на калясках, якія жывуць у пад'ездах з такімі ліфтамі, не да яго. Асабліва, калі патрэбна, напрыклад, на 11-ы паверх, а кнопкі ў кабіне дружна выстраены ў адзін слупок. Таму панэль кіравання ў кабінах новых ліфтаў будзе размешчана ніжэй.

— Сталі больш жорсткімі патрабаванні да канструкцый лябёдкі, кабіны, дзвярэй, абмежавальнікаў хуткасці... — пералічвае навоўвядзенні Пётр Клімко. — Пад парогамі будуць устаноўлены спецыяльныя шчыты, якія абароняць ад магчымага падзення ў шахту. Былі выпадкі ў Расіі, калі дзверы на паверсе адчыняліся, а кабіна не прыязджала. Чалавек увагі не звяртаў, ішоў на аўтамаце — і правальваўся ў бездань... Можна згадаць яшчэ адну асаблівасць старых ліфтаў — пры адключэнні электрычнасці пасажыры ў кабіне раптам аказваюцца ў замкнутай цёмнай прасторы. І як сябе адчуваюць тыя, хто пакутуе на клаўстрафобію? Да таго ж пры адключэнні электрычнасці ў старых ліфтах можа парвацца сувязь з дыспетчарскім пунктам. І як паведаміць пра непаладку? На мабільны тэлефон спадзявацца не варта — яго можа з вамі проста не быць, ды і наўрад ці ў вялікай колькасці людзей туды забіты патрэбны нумар. Таму асвятленне кабін мусіць абавязкова заставацца на такі выпадак.

Сучасныя ліфты спажываюць на 20-30% менш электраэнергіі за сваіх папярэднікаў. Сёння гэта становіцца яшчэ больш актуальным, бо з новага года кампенсацыя выдаткаў на энергію, якую расходаваў ліфт, кладзецца на плечы жыхароў. Ды і выдаткі на пастаянныя рамонты агрэгата таксама зменшацца. Усё-такі ў старым пад'ёмніку запчастак трэба мяняць даволі шмат. А гэта дадатковыя рахункі і за матэрыялы, і за працу. Неўзабаве мы накіруем кіраўнікам аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама лісты з прапановамі наконт замены і мадэрнізацыі ліфтаў.

## ...Але каб замяніць старыя механізмы, спатрэбіцца 30-40 гадоў?

Менш за чатыры гады засталося да ўступлення ў сілу патрабавання рэгламенту Мытнага саюза аб мадэрнізацыі і замене старых ліфтаў. Але ці паспеюць камунальнікі зрабіць гэта ўсё за час, які застаўся? Прагноз складваецца несуцяшальны. З 41 тысячы пасажырскіх ліфтаў, зарэгістраваных у Дзяржпрамнаглядзе, нарматыўны тэрмін адпрацавалі крыху больш за 14 тысяч машын. А летась было запланавана спісаць «на пенсію» ўсяго 431 ліфт. Гэта толькі тры працэнты ад агульнага ліку састарэлых машын! Прычым і ён на месцы не стаіць, а пастаянна папаўняецца пад'ёмнікамі, якія запрацавалі ўжо на пачатку 1990-х гадоў. Аднак і гэта яшчэ не ўсё. Нават такія сціплыя планы замены былі выкананы не да канца з-за недахопу сродкаў. Толькі 347 ліфтаў былі заменены на новыя. І калі сітуацыя ў найбліжэйшы час кардынальна не пераменіцца, то з такімі тэмпамі замяніць усе старыя машыны па Беларусі можна будзе толькі за 30-40 гадоў. Пры гэтым трэба ўлічыць, што кожны такі ліфт ужо адпрацаваў чвэрць стагоддзя.

І як будуць выходзіць з гэтай сітуацыі?

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

Інавацыі

## ЗА БЯСПЕКУ ЛІФТАЎ МОЖНА НЕ ХВАЛЯВАЦЦА...

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце распрацаваны і асвоены дробнасерыйны выпуск рэгістратараў параметраў руху ліфтавага пад'ёмнага абсталявання У-590 «Палтус».**

Інавацыя выканана спецыялістамі навукова-даследчай лабараторыі інфармацыйна-вымяральных сістэм факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій.

Створаны партатыўны апарат прызначаны для правядзення аператыўнай ацэнкі стану і тэхнічнага агляду пад'ёмных механізмаў. Гаворка ідзе пра бяспечную эксплуатацыю пасажырскіх і грузавых ліфтаў, пад'ёмнікаў, будаўнічых кранаў, эскалатараў і іншага абсталявання.

На прыборы размешчаны індыкатар, клавіятура, аўтаномнае сілкаванне і магнітныя трымальнікі, якія дазваляюць вымераць, зафіксаваць вібрапаскарэнне, вібрахуткасць і лінейную хуткасць аб'ектаў, якія рухаюцца. Дэталёвы аналіз зарэгістраваных звестак перадаецца карыстальніку праз камп'ютар. Да яго прыбор можа быць падключаны праз інтэрфейс USB. Першасная апрацоўка вымяральных даных і адлюстраванне вынікаў на ўбудаваным экране дазваляюць аператыўна ацэньваць тэхнічны стан пад'ёмнага механізму.

На сённяшні дзень у БДУ выраблена сем прыбораў, якія пастаўлены на прадпрыемствы «Магілёўліфтмаш», «Белліфт» і ў дэпартамент па наглядзе ў прамысловасці МНС Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Беражыце сябе!

# КАБ РАБОТА НЕ ПАЗБАЎЛЯЛА ЗДАРОЎЯ

### Зніжаецца колькасць месцаў са шкоднымі ўмовамі працы

**Пра гэта паведаміў дырэктар дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Віктар СІДАРОВІЧ. За апошнія пяць гадоў месцаў са шкоднымі умовамі стала менш на 17 тысяч. Усяго такіх месцаў у краіне сёння — 702 тысячы. Аднак плануецца, што кожны год іх колькасць будзе зніжацца на 1 працэнт. Такі захад прадугледжаны Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці на наступную пяцігодку.**

Самымі траўманебяспечнымі з'яўляюцца прафесіі кіроўцаў аўтамабіляў, трактарыстаў-машыністаў, электраманцёраў, электрагазазваршчыкаў, вальшчыкаў лесу, жывёлаводаў, падсобных рабочых, вартаўнікоў. Найбольшая колькасць няшчасных выпадкаў традыцыйна адзначаецца ў сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы. На гэтыя галіны прыпадае трацiна ўсіх смерцяў на вытворчасці. Яшчэ 23 працэнты тых, хто загінуў на працы, былі заняты ў прамысловасці і будаўніцтве.

Увогуле падчас леташніх праверак было выяўлена больш за 88 тысяч парушэнняў працоўнага заканадаўства, 9,5 тысячы службовым асобам выпісалі штраф, 91 чалавека звольнілі. Кампенсацыі па абавязковым страхаванні атрымалі 29,5 тысячы работнікаў. Выдаткі на гэтыя выплаты склалі каля 889 мільярдаў рублёў.

**Начальнік упраўлення нагляду за выкананнем заканадаўства аб ахове працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Станіслаў КАМІНСКІ** адзначае, што факты ўтойвання няшчасных выпадкаў адзінкавыя. Наймальніку, які не паведамляе пра траўмы на вытворчасці, пагражае штраф — ад 10 да 50 (калі гэта індывідуальны прадпрымальнік) або ад 50 да 100 базавых велічынь (для юрыдычнай асобы). А самі пацярпелыя, што згаджаюцца замоўчваць траўмы, пазбаўляюцца сацыяльных гарантый, якія прадастаўляюцца ім дзяржавай у выпадку страты працаздольнасці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

# Плённая дыскусія ва ўмовах турбулентнасці

**У Інстытуце журналістыкі БДУ адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Міжнародная журналістыка — 2016: турбулентнасць міждзяржаўных адносін і медыя».**

У канферэнцыі акрамя беларускіх навукоўцаў і практыкаў удзельнічалі прадстаўнікі вышэйшай школы Расіі, Украіны, Казахстана, Малдовы. Разам з беларускімі калегамі яны абмеркавалі шэраг такіх актуальных тэматычных кірункаў, як асаблівасці асвятлення інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. У цэнтры ўвагі таксама былі спецыфіка медыйнага забеспячэння беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, інфармацыйныя падставы міжнародных канфліктаў, досвед і навацыі замежнай журналістыкі, міжнародная журналістыка ў кантэксце глабальнага і рэгіянальнага інфармацыйнага абмену. У рамках абмену думкамі былі разгледжаны тэндэнцыі, характэрныя для міжнароднага сегмента сучаснай журналістыкі Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, Кітая, Германіі, Бангладэш, Ірана.

Разам з прадстаўнікамі вышэйшых навучальных устаноў, журналістамі-практыкамі ў дыскусіі ўдзельнічалі і маладыя даследчыкі: аспіранты, саіскальнікі, магістранты, студэнты.

Канферэнцыя была падрыхтавана сумесна з Беларускім саюзам журналістаў і рэдакцыямі шэрагу СМІ. Асаблівую цікавасць у замежных гасцей, выкладчыкаў БДУ і студэнтаў выклікала выступленне і адказы на шматлікія пытанні начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Беларусі Дзмітрыя Міронччыка.

**Леанід ТУГАРЫН.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ПАДАРАЖЭЛА ЗОЛАТА Ў СКУПКАХ

**Асобнай пастановай Міністэрства фінансаў №6 сёлета ў другой палове лютага былі павялічаны цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, якія скупляюць у фізічных асоб.**

Такім чынам, скупкі цяпер прымаюць у насельніцтва золата 375-й пробы ў вырабах і ломе за 236 350 рублёў за грам. Золата 500-й пробы прымуць за 315 130 рублёў, метал 583-585-х проб — за 368 700 рублёў, 750-й пробы — за 472 690 рублёў, 900-й пробы — за 567 230 рублёў, 916-й пробы — за 577 310 рублёў, 950-й пробы — за 598 740 рублёў, а за золата 958-й пробы дадуць 603 780 рублёў за грам.

За грам плаціны 950-й пробы ў скупках кліенту заплацяць 465 тысяч 260 рублёў. Серабро ў скупках прымаецца значна танней. За грам серабра 750-й пробы тут дадуць 5990 рублёў, а 800-я проба металу пацягне на 6390 рублёў. За серабро 875-й пробы чалавеку дадуць амаль 7 тысяч рублёў за грам, за 916-ю пробу — 7320 рублёў, за 925-ю пробу — 7390 рублёў, а за грам 960-й пробы заплацяць 7670 рублёў.

Змяніліся з 15 лютага і скупачныя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе іншай пробы. Цяпер за адзін грам золата ў чысціні ў скупцы дадуць 630 тысяч 254 рублі, за грам серабра — 7 тысяч 990 рублёў, за грам плаціны — 489 тысяч 751 рубель, а за грам металу паладыю заплацяць 279 тысяч 831 рубель.

Памяняліся цяпер і скупачныя цэны на каштоўныя металы ў выглядзе зубатэхнічнай прадукцыі. Цяпер кліенту за грам зубных пратэзаў з золатам 900/750 пробы дадуць 557 780 рублёў, пратэзаў са сплаву золата 750-й пробы з плацінай і серабром — 517 410 рублёў, а за грам дэталяў зубных пратэзаў сярэбрана-паладыевага сплаву дадуць 58 тысяч рублёў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## НЕЛЬГА ТАК У ЛЕСЕ «ПРЫБІРАЦЦА»

**На тэрыторыі Магілёўскага і Гавядскага лясніцтваў Магілёўскага лясгаса дзяржінспектары падчас рэйду выявілі вялікую колькасць свежых пнёў ад сырарослых дрэў. Ведаючы, што ў гэтых месцах высечкі можна праводзіць толькі з мэтай прыбірання засмечанасці, інспекцыя вырашыла праверыць іх законнасць.**

У выніку кантрольнага пераліку і зверкі з матэрыяламі адводу і таксацыі гэтых лесавысечак было ўстаноўлена, што пры правядзенні ўборкі незаконна спілаваныя не прызначаныя для таго дрэвы. Так, у Магілёўскім лясніцтве пры нарыхтоўцы драўніны на падставе ордэра на яе дробны водпуск на пні грамадзянін незаконна высек 28 дрэў, 26 з якіх былі здаровымі елкамі з дыяметрам пнёў ад 54 да 80 сантыметраў. Памер нанесенай шкоды склаў 56,6 мільёна рублёў.

Аналагічная сітуацыя склалася і ў Гавядскім лясніцтве. Паводле інфармацыі Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, пад выглядам правядзення прыбірання засмечанасці па дагаворы падраду на аказанне паслуг тры грамадзяніны незаконна высеклі 24 елкі, з якіх 15 былі сырарослымі з дыяметрам пнёў ад 44 да 70 сантыметраў. Сума шкоды ад дзеянняў «чорных лесарубаў» склала амаль 27 мільёнаў рублёў. Матэрыялы накіраваны ў праваахоўныя органы для дачы прававой ацэнкі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПОЎНЫ НАЗАД

**Задам на агароджу ўзлезла машына, якой кіравала 27-гадовая дзяўчына. Фота кур'ёзнага ДТЗ з'явілася ў супольнасці «Это Гомель, детка!»**



У апошні дзень зімы аўтамабіль Renault заглух пасярэдзіне вуліцы Кірава ў Гомелі. З салона выйшаў пасажыр. Малады чалавек вырашыў дапамагчы маладой кіроўцы. Ён стаў пхаць машыну назад. У нейкі момант аўтамабіль завёўся. Яму хапіла некалькі секунд, каб заехаць на двухметровую агароджу аўтастаянкі. Не вытрымаўшы цяжару, драцяны плот паваліўся і пашкодзіў Peugeot на стаянцы. Людзі пры гэтым дзівосным ДТЗ не пацярпелі. У аддзяленні па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС аблвыканкама расказалі, што дзяўчына толькі паўгода таму атрымала пасведчанне кіроўцы. У адносінах да яе складзены адміністрацыйны пратакол за парушэнне ПДР, якое прывяло да пашкоджання транспартнага сродку. Магчымы штраф — ад 3 да 30 базавых велічынь.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ПРЫПЫНІЛІ ПРАЦУ ГІПЕРМАРКЕТА

**Гаворка ідзе пра гандлёвы аб'ект Mile ў Магілёве.**

Падчас праверкі будаўнічай крамы пад такой назвай спынена рэалізацыя 16 найменняў тавараў: паркетных лакаў, адбельвальнікаў, герметыкаў, мантажнай пены і іншага на суму звыш 14 мільёнаў рублёў. Пры гэтым тэрміны прыдатнасці на ўказаныя тавары скончыліся ад 2-6 месяцаў назад, паведамляе прэс-служба Міністэрства гандлю. Сярод іншых парушэнняў неадпаведнасць асартыментнага пераліку патрабаванням заканадаўства, адсутнасць цэннікаў, прадастаўленне няпоўнай інфармацыі пра тавары і іншае. Для прыняцця мер і выпраўлення выяўленых парушэнняў кіраўніцтву гандлёвага аб'екта адведзены час, пакуль работа крамы часова прыпынена.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


## ОАО «Дорстройиндустрия» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже дробилки КМД-1200Гр

| Лот | | | Начальная цена (с учетом НДС), бел. руб. | Задаток (с учетомНДС), бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Дробилка КМД-1200Гр | 222750, РБ, Гродненская область, Ошмянский р-н, д. Боруны | 498 777 480 | 49 877 748 | 5 |

**ОПИСАНИЕ**

Производитель: Южноуральский машиностроительный завод, РФ, 1990 г.в., ø конуса – 1200 мм, ø приемной щели – 100 мм, крупность материала – 80 мм, ширина разгрузочной щели – 5-15 мм, масса – 27 тн., мощность – 75 кВт, производительность – 40–130 $м^3/ч$

С информацией об условиях проведения аукциона, порядке перечисления задатка и его возврата, условиях участия в аукционе можно ознакомиться в извещении, размещенном в газете «Звязда» от 26.05.2015, 02.09.2015.

**Аукцион состоится 16.03.2016 в 10.00 по адресу: г. Фаниполь, ул. Заводская, д. 1, 3-й этаж, актовый зал**

*Задаток перечисляется на р/с 3012421830016 БИК 153001942 в Расчетно-кассовом центре № 29 в г. Фаниполь филиала ОАО «Белагропромбанк» – Минское областное управление г. Фаниполь, ул. Заводская, 3а, 222750. Получатель – ОАО «Дорстройиндустрия», УНП 100211220, ОКПО 03455184.*

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Дорстройиндустрия» (Лот №1), **проводимом 16 марта 2016 года.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.00 до 12.00, с 13.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 1, каб. 202.

Окончание приема заявлений – **11.03.2016 в 17.00.**

Заключительная регистрация участников – **16.03.2016 с 09.30 до 10.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Петрусевич Виктор Альбинович, 8 (029) 534-99-76.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор: 8 (017) 210-00-60, 8 (033) 660-70-50 • www.dsi.by • e-mail: jurist@dsi.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 17 марта 2016 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | **Здание дома-конторы вместе с пристройкой общей площадью 358,3 м.кв, расп. по адресу: Молодечненский р-н, д. Носилово, ул. Школьная, д. 30, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, кровля смешанная. Количество этажей 2 (два). (Инвентарный номер в ЕГРНИ 630/С-47139; наименование: контора Молодечненского государственного предприятия по строительству и эксплуатации мелиоративных и водохозяйственных систем; назначение: здание нежилое)** |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Молодечненский р-н, Тюрлевский с/с, д. Носилово, ул. Школьная, д. 30 |
| **Начальная цена** | 927 170 600 рублей |
| **Сумма задатка** | 92 000 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |
| **Балансодержатель (должник)** | Открытое акционерное общество «Передвижная механизированная колонна № 32», Минская обл, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2«Б» |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **17 марта 2016 г. в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 02.03.2016 по 15.03.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости».**

Утерянную квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» формы 1-су серии СВ номер 0142976 **считать недействительной.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта, адрес расположения** | Капитальное строение, инв. № 441/С-14051 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – рынок), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Ивьевский р-н, Ивьевский с/с, 6, вещевой рынок. Составные части и принадлежности: торговый павильон (площадью 49,2 кв.м), покрытие асфальтобетонное (площадью 2 797 кв.м), линия наружного освещения (протяженностью 462,4 м), опора (мачта освещения железобетонная, количеством 5 шт., и арматура освещения, количеством 7 шт.), туалет |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Кадастровый номер 422981300001000173, (назначение – земельный участок для обслуживания территории вещевого рынка), площадью 2,3365 га, расположенный по адресу: Ивьевский р-н, Ивьевский с/с, 6, вещевой рынок |
| **Начальная цена продажи** | 557 760 000 (пятьсот пятьдесят семь миллионов семьсот шестьдесят тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 55 776 000 (пятьдесят пять миллионов семьсот семьдесят шесть тысяч) белорусских рублей |
| **Продавец** | Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел. 2-11-67, факс 2-23-95 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | 1. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя. 2. Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». 3. Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи. 4. Расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, и публикации извещения в средствах массовой информации и размещения на официальном сайте, возмещаются Победителем аукциона Ивьевскому филиалу Гродненского областного потребительского общества |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 марта 2016 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь*: заверенная копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица и заверенные копии учредительных документов;
- *индивидуальным предпринимателем*: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, до продажи объекта в процессе аукционных торгов, без объяснения причины.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 30.06.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 22 марта 2016 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация http://ino-v-grodno.tam.by**

# Краіна здароўя

Выпуск № 3 (356)

■ Дадатковыя меры

## ХАДА, БАСЕЙН, МАСАЖ

**Пры захворваннях апорна-рухальнага апарата, артрозах не абысціся без аздараўленчых мерапрыемстваў — яны змяншаюць боль, паляпшаюць рух у суставе і ўвогуле самаадчуванне.**

— Хада па роўнай мясцовасці ва ўмераным тэмпе — добры спосаб падтрымання мышачнага тонусу, — нагадвае **прафесар кафедры кардыялогіі і рэўматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук Тамара ЦЯБУТ.** — Імкніцеся штодня гуляць мінімум па 30—40 хвілін. Не трэба надта спяшацца, бо пры вельмі хуткай хадзе нагрузка на суставы істотна ўзрастае. Хада з цяжкімі сумкамі таксама не спрыяе паляпшэнню нашага стану.

Вельмі карыснымі пры такіх захворваннях будуць і заняткі плаваннем. У вадзе магчымы максімальны аб'ём руху ў суставе без нагрузкі з вагой, што з'яўляецца аптымальным для храстка. Калі не ўмееце плаваць, можаце займацца ў групах аквагімнастыкі.

### Практыкаванні для каленнага сустава

**Выконвайце кожнае практыкаванне 5—10 разоў. Пажадана штодня.**

**1.** У становішчы лежачы. Ногі выцягнутыя. На «раз-два» нага слізгае па падлозе і максімальна згінаецца ў калене, на «тры» згінаецца ў тазасцегнавым суставе і рукамі прыціскаецца да тулава (спіну ад падлогі не адрываем). На «чатыры-пяць» трымаем нагу, на «шэсць» апускаем ступню на падлогу, на «сем-восем» выпростваем нагу. Тое ж самае паўтараем другой нагой.

**2.** Ляжым на спіне, ногі сагнутыя. Сагнутую нагу адрываем ад падлогі і рукамі прыцягваем да грудзей, затрымліваем у такім становішчы некалькі секундаў, апускаем. Тое ж — другой нагой.

**3.** Ляжым на спіне. Прамая нага адрываецца ад падлогі на 20—30 см, трымаем яе некалькі секундаў, пасля апускаем. Тое ж — другой нагой.

**4.** Ляжым на спіне, ногі выцягнутыя. Выцягваем рукі наперад і імкнёмся падняць галаву і верхнюю частку тулава на вышыню 20 см ад падлогі, пасля апускаем.

**5.** Ляжым на спіне. Імітуем язду на веласіпедзе. «Круцім педалі» разоў 20—50 і больш.

**6.** Ляжым на жываце. Па чарзе згінаем ногі ў каленным суставе, імкнёмся дастаць пяткай ягадзіцы. Паўтараем 20—50 разоў.

**7.** Сядзім на падлозе. Ногі прамыя. Абхапіўшы рукамі ступні, максімальна нахіляемся наперад, імкнучыся дакрануцца ілбом да ног. Калені не згінаем. Затрымліваемся, наколькі гэта магчыма. Вяртаемся ў зыходнае становішча.

**8.** Сядзім на падлозе. Згінаем нагу ў калене, абхопліваем ступню дзвюма рукамі, адрываем нагу ад падлогі, выпростваем, не расціскаючы рук. Трымаем, колькі магчыма. Вяртаемся ў зыходнае становішча. Паўтараем з другой нагой.

### Практыкаванні для тазасцегнавога сустава

**Таксама паўтараем кожнае па 5—10 разоў.**

**1.** Ляжым на спіне. Ногі максімальна сагнутыя ў каленях, ступні не адрываем ад падлогі. Калені разводзім і зводзім. Павялічваем амплітуду руху.

**2.** Ляжым на спіне, ногі прамыя. Адна нага адрываецца ад падлогі і рухаецца з боку ў бок з максімальна магчымай амплітудай. Не згінаем нагу ў калене. Тое ж паўтараем і з левай нагой. Паступова можна выконваць практыкаванне адразу дзвюма нагамі.

**3.** Ляжым на спіне. Адрываем прамую нагу ад падлогі на максімальна магчымую вышыню, пасля апускаем. Паўтараем 10 разоў і мяняем нагу.

**4.** Седзячы на крэсле. Нахіляем тулава наперад і дакранаемся пальцамі да ступняў, выпростваемся.

**5.** У становішчы стоячы. Адна нага стаіць на невысокай падстаўцы, рукой абапіраемся аб стол. Другой нагой робім махі наперад і назад, паступова павялічваючы амплітуду. Пазней дабаўляем рухі нагой у бок.

Язда на веласіпедзе, акрамя карыснага ўплыву на суставы, прыносіць станоўчы эмацыянальны зарад. Пазбягайце пры гэтым язды па няроўнай паверхні, бо падскокванні шкодзяць суставам, пагражаюць падзеннем. Можна займацца і на велатрэнажоры. Вышыня сядзення павінна быць такой, каб пры поўным націсканні на педаль у ніжнім становішчы нага была выпрастаная. Калі калена ў гэтым становішчы застаецца сагнутым, то ўзнікае боль у суставах і мышцах. Важнай будзе і адлегласць да руля — локці павінны быць крыху сагнутымі. Для пачатку можаце ездзіць па 15—20 хвілін і паступова павялічыць час паездкі да 30—40 хвілін. Зімой карысна хадзіць на лыжах — слізганне змяншае вагавую нагрузку на суставы.

Масаж паляпшае агульнае самаадчуванне, здымае спазм мышцаў, актывізуе кровазварот, перадачу нервовых імпульсаў, сілкаванне сустаўнага храстка. Рабіць масаж трэба ў вопытных спецыялістаў і пры адсутнасці абвастрэння артрозу. Больш інтэнсіўна прапрацоўваецца пазваночнік. Пры адсутнасці проціпаказанняў масаж можна рабіць двойчы на год.

Санаторна-курортнае лячэнне дазваляе праводзіць комплексную рэабілітацыю — тут і прымяненне лячэбных гразяў, ваннаў, саўны, фізіяпрацэдуры, заняткі лячэбнай фізкультурай. Важным будзе і проста знаходжанне на свежым паветры, змена абстаноўкі. Памятайце толькі, што санаторна-курортнае лячэнне, як і ўсё, аб чым ішла размова, не адмяняе пастаяннага лячэння і рэабілітацыі. І не трэба прысвячаць лячэнню ўвесь дзень адпачынку. Здараецца, што цягам дня пацыент імкнецца атрымаць 5, а то і 8 розных працэдур, а мера патрэбная ва ўсім ■

■ Чалавек і катастрофы

# РАБОТА НАД... СТРЭСАМ

## Якім вопытам пераадолення мы маглі б падзяліцца з японцамі?

**Медыцынскі ўніверсітэт Дакіа (Японія) мае намер цесна супрацоўнічаць з факультэтам псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. У межах сумесных семінараў спецыялісты абмяркуюць магчымасці рэабілітацыі (сацыяльнай, псіхалагічнай, медыцынскай) насельніцтва, якое пацярпела ад экалагічных і тэхнагенных катастроф. Для беларусаў такой катастрофай стала аварыя на Чарнобыльскай АЭС у 1986-м, для японцаў у 2011-м — на АЭС «Фукусіма-1». Паступова, верагодна, удасца параўнаць наступствы для абедзвюх краін, а пакуль японцы пачалі знаёміцца з тым вопытам, які назапасілі нашы спецыялісты. Прафесар кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі БДПУ, доктар псіхалагічных навук Леанід ПЯРГАМЕНШЧЫК расказвае аб тым, што гэта быў за вопыт — чым можна было дапамагчы беларусам адразу пасля катастрофы і на што варта звярнуць увагу сёння.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Гэта быў не іх выбар

— Для Беларусі XX стагоддзе было ўвогуле вельмі багатым на розныя катастрофы. Пад катастрофай я маю на ўвазе не толькі, скажам, 1917 або 1941 год. Гэта і вялікае мноства іншых цяжкіх падзей, якія рэзка мянялі ўклад жыцця, калі чалавек мог у адзін момант страціць усё, у тым ліку блізкіх і нават уласнае жыццё. Некалькі пакаленняў цягам жыцця перажывалі некалькі катастроф. Ці магло гэта прайсці бясследна? Магло, але не для ўсіх. Большасць з нас здольныя перажываць страты і рухацца далей. Аднак ёсць і тыя, хто не можа самастойна справіцца з моцнай псіхалагічнай траўмай.

Надзвычай адмоўныя наступствы катастрофы для чалавека заключаюцца ў тым, што на падсвядомым узроўні ён губляе ўстойлівасць, стабільнасць, веру ў тое, што заўтра надыдзе. Больш за тое, мы страчваем давер да свету, не чакаем ад наваколля нічога добрага. Давер тут можа сфарміравацца толькі тады, калі мы вельмі доўга, ну хоць бы гадоў сто, жывём спакойна...

Чарнобыльская катастрофа, безумоўна, тэхнагенная, радыяцыйная, але сёння мы кажам пра тое, што яна яшчэ мела цяжкія псіхалагічныя наступствы. Чалавек апынуўся ў палоне моцнага страху. Страху перад невядомым. Што такое радыяцыя і як яе трэба баяцца — ніхто не ведаў, і ад гэтага было яшчэ больш страшна. Стрэс узмацніла, безумоўна, і страта зямлі, дома. І гэта аказалася значна горш за страх перад радыяцыяй. Мігранты чарнобыльскай зоны былі на той момант самай неабароненай катэгорыяй. Не радыяцыйныя аблокі, а пераезд стаў для іх сапраўднай катастрофай.

Частка перасяленцаў была перавезена ў спецыяльна пабудаваныя для іх гарадскія дамы. Нам, гараджанам, жыццё ў панельным шматпавярховіку падаецца шчасцем, але навасёлы ў гэтым выпадку былі жыхарамі цалкам вясковымі, яны жылі на зямлі, з пэўнай прасторай (дарэчы, чалавеку для камфортнага самаадчування неабходна досыць вялікая прастора). Як думаеце, маглі ў вяскоўцаў з'явіцца праблемы па прычыне такога пераезду? Безумоўна...

Нават тыя, каго перасялілі ў вясковыя ўмовы, не маглі прыжыцца лёгка і адразу — бо не той лес, не тая рака і г.д. Усё ж такі, калі чалавек пераязджае па сваёй волі — гэта адно. Ён прымае рашэнне. Сам! Чалавек, які мае магчымасць прымаць рашэнні, звязаныя з уласным жыццём, будзе псіхічна здаровым. Яшчэ Жан Поль Сартр казаў: «Чалавек — гэта выбар».

**«Любую псіхалагічную траўму неабходна «прапрацаваць». Гэта можна зрабіць падчас размовы з тым, каму ты давяраеш, або з псіхолагам. Так мы пазбаўляемся страху і робім траўму часткай свайго жыцця».**

Перасяленне нарадзіла незлічоную колькасць новых стрэсавых сітуацый для людзей. Як жыць у новых умовах, куды ўладкавацца на работу... Трэба неяк прыстасоўвацца, а не ўсё атрымліваецца гладка. Узнікаюць унутрысямейныя канфлікты. Каму мы выказваем сваю незадаволенасць? Тым, хто побач. Не кожная сям'я здольная ў выніку захавацца.

### Жыць ва ўчарашнім дні

— Сацыяльнай і псіхалагічнай службы на той момант не было, псіхолагаў яшчэ не рыхтавалі... Гэта сёння мы ведаем, як у ідэале павінна аказвацца сацыяльна-псіхалагічная дапамога ў падобных сітуацыях. Скажам, пераехала сям'я. На другі дзень пасля пераезду прыходзіць сацыяльны работнік, знаёміцца і кажа, што звяртацца да яго вось па такім нумары можна па самых розных пытаннях. І такая стратэгія павінна прымяняцца да кожнага пацярпелага.

У 1990-х некалькі спецыялістаў, у тым ліку і я, арганізавалі 17 цэнтраў псіхалагічнай дапамогі пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС. Тры такія цэнтры працавалі пры падтрымцы ЮНЕСКА. Некаторыя з гэтых цэнтраў працуюць і цяпер. Ахапіць усіх перасяленцаў і тых, хто застаўся пражываць на забруджаных тэрыторыях, аказалася не па сілах, аднак прэцэдэнт быў.

Паступова мы навучыліся аказваць дапамогу, пачалі навучаць новых псіхолагаў — здольных працаваць з кожным пацярпелым у залежнасці ад яго індывідуальнай праблемы. У выніку ўзнік нават Цэнтр псіхолага-педагагічных праблем Чарнобыля, які аб'яднаў усіх такіх спецыялістаў і які мне давялося ўзначаліць. За дзесяць гадоў работы цэнтр назапасіў выдатны вопыт.

Толькі ў 1995 годзе ў педуніверсітэце быў уведзены курс крызіснай псіхалогіі. Такія псіхолагі неабходны для аказання дапамогі людзям з любой сур'ёзнай псіхалагічнай траўмай, абумоўленай не толькі тэхнагеннай катастрофай. Крызісныя псіхолагі працавалі з сем'ямі загінулых на Нямізе; калі абрынуўся дах у Краснаполлі і загінулі некалькі чалавек; калі ў дзіцячым садку мужчына ўзяў у заложнікі дзяцей...

Любую псіхалагічную траўму неабходна «прапрацаваць». Гэта можна зрабіць падчас размовы з тым, каму ты давяраеш, або з псіхолагам. Так мы пазбаўляемся страху і робім траўму часткай свайго жыцця.

Але што з намі часта адбываецца? Час ідзе, трагічная падзея аддаляецца, але з памяці не выціскаецца. Чым больш намагаешся забыць, тым больш гэта на цябе ўздзейнічае. І ты пачынаеш жыць не ў сённяшнім дні, а ва ўчарашнім. Што той маці, якая страціла сына, да сённяшніх падзей? У яе ўчора была бяда. Гэта называецца ў псіхалогіі «эфектам скарочанай будучыні» — падсвядома людзі перастаюць бачыць для сябе заўтрашні дзень, не могуць планаваць і спадзявацца на лепшае.

### Тры варыянты выхаду

— Чутак было шмат — пра дзяцей з трыма нагамі, пра закапаных экскаватарам людзей недзе за Уралам. На самай справе дзеці з пэўнымі адхіленнямі фізічнага развіцця нараджаюцца заўсёды, і іх не стала больш. Але па першым часе ўзнік страх перад усім, перад жыццём. На шчасце, гэта пачуццё не можа трымаць чалавека ў сваім палоне бясконца. Свядомасць паступова заспакойваецца. Гэта ні добра, ні дрэнна, проста спрыяе выжыванню.

Больш жывучым аказалася гіпертрафіраванае пачуццё віны ў маці, чые дзеці захварэлі, скажам, на рак шчытападобнай залозы. Пачуццё віны навальваецца адразу пасля страшнай падзеі. Бо мы задаём сабе пытанне: хто вінаваты? Мы можам абвінавачыць каго заўгодна, а калі гэта па нейкіх прычынах немагчыма, то віна перакладваецца на сябе. Так, некаторыя дзеці пасля пахавання бацькоў пачынаюць вінавацціца тым, што не так часта званілі, прыходзілі і г.д. Задача псіхолага ў такім выпадку перавесці думкі з «хто вінаваты?» на «што можна зрабіць?». Можа быць, варта пачаць дапамагаць іншым? Гэта плённае пераадоленне бяды.

Заходнія вучоныя высветлілі, што своечасовая псіхалагічная дапамога мінімізуе негатыўныя наступствы для здароўя. У шэрагу развітых краін работа над стрэсам пастаўлена выдатным чынам. Дапусцім, адбылася аўтакатастрофа з ахвярамі, якім дапамагалі ўрачы, псіхолагі, ратаўнікі. Усе пасля павінны «адпрацаваць» гэту сітуацыю са сваімі псіхолагамі. Калі цягам года той жа ратавальнік захварэе — хоць на прастуду, — лячэнне будзе аплачана толькі тады, калі ёсць адзнака псіхолага.

У Японіі пакуль, мяркуючы па словах нашых японскіх калег, не надаюць дастатковай увагі псіхалагічнай дапамозе. Улічваючы іх менталітэт — своеасаблівую сумесь традыцыйнай усходняй культуры і заходніх каштоўнасцяў, — цяжка прадбачыць, што менавіта з нашага вопыту будзе карысным для гэтай нацыі.

Увогуле ж існуе толькі тры варыянты выхаду з негатыўнага вопыту — хвароба і пакуты, рост і развіццё і... выхад за межы свядомасці (найлепшы спосаб выжыць у звар'яцелым свеце — звар'яцець). Калі з намі нешта адбываецца, мы павінны атрымліваць вопыт пераадольвання. Так мы пачынаем інакш ставіцца да свету — бачыць у людзях і наваколлі шмат добрага, па-сапраўднаму любіць. Таму любы траўматычны вопыт вельмі важны. Значна важнейшы за станоўчы. Мы вучымся не на дасягненнях, а на памылках. Каб чалавек развіваўся і рос, ён павінен пераадольваць ■

■ Медыцына заўтрашняга дня

# Наначасціцы супраць пухлін

**Вучоныя з Беларусі і ЗША распрацавалі новы метад выяўлення рэштакавых ракавых клетак, якія таксама спрыяе іх вынішчэнню.**

Выяўляць і вынішчаць ракавыя клеткі прапануецца з дапамогай плазмонных нанабурбалак. «Метад заснаваны на выкарыстанні залатых наначасціц і лазернага выпраменьвання для генерацыі нанабурбалак у ракавых клетках. Нанабурбалкі вызначаюцца акустычным зондам. Для гэтага наначасціцы апрацоўваюцца спецыяльнымі антыцеламі, якія распазнаюць злаякасныя клеткі, і назапашваюцца ў іх, практычна не трапляючы ў здаровыя», патлумачыў **кіраўнік групы пухлін галавы і шыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, кандыдат медыцынскіх навук Ігар БЕЛАЦАРКОЎСКІ** карэспандэнту БЕЛТА.

Тэхналогія паспяхова апрабавана на лабараторных мышах. Жывёлам паддоследнай і кантрольнай груп выконваліся аднолькавыя па аб'ёме аперацыі па выдаленні прышчэпленай пухліны шыі і галавы. Аднак прымяненне дадатковага мінімальнага хірургічнага ўмяшання ў паддоследнай групе пасля вызначэння рэштакавых ракавых клетак з дапамогай плазмонных нанабурбалак спрыяла 100-працэнтнай выжывальнасці жывёл, у той час як мышы кантрольнай групы (толькі стандартная хірургія) загінулі ад прагрэсавання пухліны. Акрамя таго, у выпадках выяўлення неаперабельных мікрапухлін нанабурбалкі спрыялі іх вынішчэнню. Ідэя новага метаду лячэння заключаецца ў тым, каб зменшыць частату мясцовага рэцыдыву. Перад аперацыяй пацыент атрымлівае ін'екцыю з залатымі наначасціцамі. Пасля выдалення пухліны праводзіцца апрацоўка лазерам. Нанабурбалкі актывуюцца, і мікрапухліна, калі яна недзе засталася, вынішчаецца.



Укараненне такога метаду можа паспрыяць таму, што анколагі атрымаюць магчымасць вынішчаць ракавыя клеткі, якія тэарэтычна могуць стаць крыніцай рэцыдываў, на мікраўзроўні. Спецыялісты гатовыя правесці клінічныя выпрабаванні метаду ў Беларусі ■

■ Дрэннае маўленне

# НІ «Р», НІ «Л»...

**Калі дзіця картавіць, шапялявіць, не прамаўляе «р», «д», «л» і іншыя паднябенныя гукі, калі яму цяжка высунуць язык, а пры адкрытым роце немагчыма дацягнуцца кончыкам языка да верхніх разцоў, у яго можа быць кароткая вуздэчка языка. Праблемы маўлення могуць быць звязаны і з іншымі прычынамі, але і такая анамалія не рэдкасць.**

Вуздэчкі ротавай поласці (гэта такія тонкія складкі слізістай абалонкі, якія дадаткова прымацоўваюць язык і губы да ротавай поласці) часам могуць перашкаджаць правільнаму развіццю органаў ротавай поласці. Анамалія іх будовы патрабуе назірання і своечасовага лячэння. Звычайна праблему выяўляюць неанатолагі, педыятры, лагапеды, атарыналарынголагі, стаматолагі і артадонты.

Звязана гэта можа быць як са спадчыннасцю, так і з неспрыяльным вонкавым уздзеяннем на плод (таксікоз, вірусная хвароба, уздзеянне лекаў, нейкіх шкодных рэчываў, нават маміны эмацыянальныя перагрузкі).

Існуе шэраг прыкмет, па якіх можна здагадацца, што з вуздэчкамі нешта не тое. А саміх матуль павінны насцярожыць праблемы падчас груднога кармлення — дзіця проста не можа смактаць. Гэта прыводзіць спачатку да адставання ў росце і вазе, а пазней і да праблем з маўленнем, «выпадзеннем» і скажэннем гукаў. Тут і няправільны прыкус, і запаленне і кровацачывасць дзяснаў, і павышаная адчувальнасць эмалі зубоў, а яшчэ можа быць храпенне і апноэ (кароткачасовае спыненне дыхання ў сне). Больш за тое, нерэалізаваны інстынкт смактання прыводзіць да розных відаў неўрозаў, назойлівых станаў, якія могуць захоўвацца ў чалавека ўсё жыццё.

«Існуюць два спосабы лячэння паталогіі — расцягванне звязкі з дапамогай спецыяльнай гімнастыкі і аператыўнае ўмяшанне, — расказвае **ўрач-стаматолаг-артадонт 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Віктар САСНОЎСКІ.** — Калі вуздэчка не дазваляе праводзіць груднoе кармленне, яна можа быць падрэзаная яшчэ ў радзільні. Працэдура вельмі простая, ажыццяўляецца без болю і мясцовай анестэзіі, бо вуздэчка не мае нервовых канчаткаў. Пасля 9 месяцаў вуздэчка патаўшчаецца і падчас аперацыі патрабуецца ўжо мясцовы наркоз і накладанне швоў. Калі і гэты момант упушчаны, наступным спрыяльным часам будзе ўзрост 2-2,5 гады, а затым — 5».

Калі вуздэчка надта кароткая, праводзіцца не проста яе падразанне, а паўнацэнная аперацыя — пластыка. Выконваецца такое ўмяшанне ў дашкольным або раннім школьным узросце. Пасля пластыкі неабходна займацца з лагапедам для фарміравання правільных маўленчых навыкаў ■



■ Асаблівасці абследавання

# ДЛЯ ДОБРАГА ЖАЛЕЗА

**Гемаглабін — пігмент эрытрацытаў, які забяспечвае тканкі кіслародам. Акрамя таго, ён вызваляе тканкі ад вуглякіслага газу, які ўтвараецца ў працэсе абмену рэчываў. Нізкі паказчык гемаглабіну ўказвае на тое, што варта дасканала абследавацца і звярнуць увагу на харчовы рацыён.**

— Да павелічэння канцэнтрацыі гемаглабіну прыводзяць некаторыя захворванні крыві, звязаныя з узмоцненай выпрацоўкай эрытрацытаў касцявым мозгам, — тлумачыць **загадчыца клініка-дыягнастычнай лабараторыі 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Вера КОЛТУН.** — Аднак гэты вялікі паказчык бывае і ў здаровых. Напрыклад, у людзей, якія пражываюць у высакагорных раёнах (з нізкай колькасцю кіслароду ў паветры), або ў тых, хто працуе ў гарачым цэху і актыўна пацее... Таксама пры моцных ванітах у цяжарных, дыярэі ў дзяцей, пры моцных апёках, у нованароджаных...

Зніжэнне ўзроўню канцэнтрацыі гемаглабіну з'яўляецца асноўным лабараторным сімптомам анеміі. Але варта мець на ўвазе, што дыягностыка анеміі не адбываецца толькі на падставе вызначэння канцэнтрацыі гемаглабіну ў крыві. Апошняе даследаванне выяўляе сам факт наяўнасці анеміі і павінна пацягнуць за сабой больш глыбокае абследаванне. Прычыны развіцця анемій розныя, але пры ўсіх відах развіваецца гіпаксія (кіслароднае галаданне). Анемія можа быць і самастойным захворваннем, і ўскладненнем унутраных хвароб.

### Нармальныя паказчыкі гемаглабіну крыві:

| узрост | 2-4 тыдні | 1-3 мес | 3-6 мес | 6 мес-1 год | 1-3 гады | 3-5 гадоў | 5-7 гадоў | 7-14 гадоў | М. | Ж. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| гемаглабін | 130-190 | 115-175 | 115-160 | 118-150 | 118-150 | 118-150 | 120-150 | 120-150 | 130-160 | 120-150 |

### Пры нізкім гемаглабіне...

Чалавек адчувае галавакружэнне, можа быць нават страта прытомнасці, шум у вушах, галаўны боль, задышка, тахікардыя, кволасць, пастаяннае пачуццё стомленасці, адсутнасць апетыту і г.д. ■



### ШТО БУДЗЕМ ЕСЦІ?

Прадукты, багатыя на жалеза. Найперш мяса — цяляціну, свініну, ялавічыну і ялавічную печань. Абавязкова ў рацыёне павінны быць гародніна і садавіна, у якіх шмат вітаміну С, а ён дапамагае арганізму засвойваць жалеза. Таму абавязкова ўжывайце тыя ж апельсіны, лімоны, грэйпфруты, ківі, гранаты — не трэба кілаграмамі, дастаткова аднаго апельсіна, паловы грэйпфрута, чвэрці граната ў дзень. Ешце супы і салаты з гародніны, крупы, чорны хлеб, рыбу і морапрадукты, яйкі, малочныя прадукты.

З гародніны і садавіны арганізм засвойвае прыкладна 5 працэнтаў жалеза.
З рыбы, морапрадуктаў і яек — прыкладна 12 працэнтаў.

### НАСТОЙ З ПЛАДОЎ ШЫПШЫНЫ

1,5 лыжкі сухіх пладоў шыпшыны растаўчыце і заліце шклянкай кіпеню ў тэрмасе на ноч, а раніцай працадзіце, дабаўце чайную лыжку мёду і сталовую лыжку соку лімона. Дарослым трэба піць усю шклянку раніцай перад сняданкам, а дзецям дастаткова і паловы шклянкі на дзень.

Матэрыялы падрыхтавала Святлана ПРОТАС. protas@zviazda.by

# Зала № 10. «НАШЧАДКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ»

## Працягваем віртуальнае падарожжа па Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

**Вайна, якая па маштабе, жорсткасці, людскіх ахвярах і матэрыяльных выдатках не мела сабе роўных, нарэшце скончылася. Але жыццё нядоўга было спакойным. Ваенныя канфлікты пачалі разгарацца то ў адной, то ў другой частцы свету. Уцягнуты ў іх былі і савецкія грамадзяне, у тым ліку беларусы. У сённяшняга пакалення нашых суайчыннікаў не менш адказныя задачы. Працягваючы баявыя традыцыі нашчадкаў Вялікай Перамогі, прадстаўнікі сілавых структур стаяць на варце нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.**

### КАРЭЙСКІ КАНФЛІКТ

Тэму «Лакальныя канфлікты і войны» раскрываюць фотаздымкі і прадметы, якія перадалі музею непасрэдныя ўдзельнікі баявых дзеянняў і іх сваякі. Прадстаўленыя экспанаты распавядаюць пра подзвігі нашых суайчыннікаў у ходзе пасляваенных узброеных канфліктаў.

Адным з першых сур'ёзных выпрабаванняў пасля Другой сусветнай стала вайна ў Карэі, якая доўжылася з 1950 па 1953 год. Удзельнікі баявых дзеянняў у гэтай краіне прыраўнаваны да ветэранаў Вялікай Айчыннай. Праўда, падчас узброенага канфлікту пра гэта маглі ведаць лічаныя людзі: карэйская кампанія не афішавалася. Савецкі Саюз аказваў інтэрнацыянальную дапамогу ў барацьбе карэйскага народа за сваю незалежнасць.

На фотаздымках — нашы землякі, якія за подзвігі, здзейсненыя на тэрыторыі Карэі, сталі Героямі Савецкага Саюза. Падпалкоўнік Леў Шчукін і старшы лейтэнант Яўген Стэльмах — лётчыкі-ветэраны яшчэ Вялікай Айчыннай вайны. Нямала баявых вылетаў падчас Другой сусветнай зрабіў і падпалкоўнік Мікалай Дрозд. Яго медалі, атрыманыя ад кітайскага ўрада за падрыхтоўку кітайскіх лётчыкаў, — у экспазіцыі. Дарэчы, па колькасці збітых самалётаў праціўніка падчас Карэйскай вайны савецкія лётчыкі займаюць тры верхнія радкі, за імі — амерыканцы. Ганаровае трэцяе месца належыць беларусу — Льву Шчукіну.



Палявая форма камандзіра разведвальнага батальёна Аляксандра Плаціцына, які ў сакавіку 1987 года гераічна загінуў у Афганістане.

### ВАЙНА Ў В'ЕТНАМЕ

У 1961–1974 гадах савецкія ваенныя саветнікі і спецыялісты ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях у В'етнаме. Аб падзеях тых гадоў сведчаць фотаздымкі і фрагменты збітых амерыканскіх самалётаў, дакументы ўдзельніка баявых дзеянняў Дзмітрыя Салашэнкі — пасведчанне аб уручэнні яму медаля «Згуртаванасць для перамогі над агрэсарамі». Тут жа захоўваюцца аскепкі касетных авіяцыйных бомбаў тыпу «апельсін» і «ананас», якія прымяняліся амерыканскімі ваенна-паветранымі сіламі ў В'етнаме. Алюмініевая расчоска ў форме савецкага знішчальніка належала ўдзельніку тых падзей Льву Шчукіну.



Дзесяцігадовая вайна ў Афганістане дала Беларусі чатырох Герояў Савецкага Саюза.

### АНГОЛЬСКАЕ СУПРАЦЬСТАЯННЕ

Практычна 27 гадоў ішла грамадзянская вайна ў Анголе. У баявых дзеяннях, распачатых у 1975-м, удзельнічалі і савецкія саветнікі. Толькі нашых суайчыннікаў — афіцэраў і салдат тэрміновай службы — налічвалася прыкладна 160 чалавек. Сярод беларусаў, якія пабывалі ў Анголе, у асноўным былі ваенныя перакладчыкі — выпускнікі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў і Ваеннага інстытута замежных моў Мінабароны СССР.

З шасці савецкіх генералаў, якія ў розныя гады ў Анголе займалі пасаду галоўнага ваеннага саветніка пры міністры абароны, былі два выхадцы з Беларусі. Імёны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны генерал-лейтэнантаў Ільі Панамарэнкі і Васіля Шахновіча доўгі час знаходзіліся ў цені: аб удзеле савецкіх ваенных дарадцаў і спецыялістаў у грамадзянскай вайне ўголас не казалі.

**Герой Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны сучасных Узброеных Сіл нашай краіны — Уладзімір Карват. Славуты лётчык з'яўляецца і першым Героем Беларусі.**

Савецкія ваенныя саветнікі і спецыялісты не мелі пры сабе ніякіх дакументаў, насілі ангольскую ваенную форму: праўда, без знакаў адрознення. Тая, што захоўваецца ў экспазіцыі, належала саветніку пры камандуючым Усходнім фронтам ангольскай арміі, палкоўніку ў адстаўцы Уладзіміру Аванэсаву.

Асобнае месца ў экспазіцыі займае агітацыйная прадукцыя. Шматлікія лістоўкі мелі вялікую сілу: вялася ідэалагічная барацьба паміж дзвюма сістэмамі — сацыялізмам і капіталізмам. Ва ўмовах Анголы гэтая барацьба трансфармавалася ў разлютаванае ваеннае і ідэалагічнае проціборства паміж урадавай арміяй і ўзброенымі атрадамі УНІТА. Адзін з удзельнікаў баявых дзеянняў у Анголе перадаў у музей спецыяльны сшытак унітаўскага афіцэра-артылерыста, захоплены ў якасці трафея падчас баявой аперацыі на поўдні краіны. Эксклюзіўны канспект у падрабязнасцях расказвае, якім чынам падрыхтаваць такога спецыяліста.

І сёння дакладна невядома, колькі чалавек з савецкага кантынгенту загінула ў Анголе. Паводле расійскага Саюза ветэранаў Анголы, каля 80 ваеннаслужачых і грамадзянскіх спецыялістаў з ліку савецкіх грамадзян (за перыяд з 1975 па 1992 год). Сярод беларусаў забітымі афіцыйна лічацца двое вайскоўцаў. Але ахвяр магло быць значна больш. І не толькі з прычыны баявых дзеянняў. На працягласць жыцця ўплываў і трапічны клімат, і характэрныя для яго захворванні.



Алюмініевая расчоска ў форме савецкага знішчальніка (унізе справа) належала ўдзельніку падзей у В'етнаме Льву Шчукіну.

### ВАЙНА НА ЗНЯСІЛЕННЕ

Араба-ізраільскія войны таксама сталі пляцоўкай, на якой зноў сутыкнуліся геапалітычныя інтарэсы дзвюх супердзяржаў: Савецкага Саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі. Пра адну з гэтых войнаў, так званую Вайну на знясіленне 1967—1970 гадоў, расказваюць фотаздымкі савецкіх баявых разлікаў зенітна-ракетных комплексаў, якія неслі абарону Асуанскай плаціны. У Егіпце знаходзілася немалая група савецкіх ваенных саветнікаў — спецыялістаў войскаў супрацьпаветранай абароны.

У экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі і асабістыя рэчы начальніка палітаддзела 85-й зенітна-ракетнай брыгады супрацьпаветранай абароны Мікалая Стралецкага, Іосіфа Кругліка-ва і многіх іншых воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія пабывалі ў Егіпце. Увогуле ў розныя гады ў паўночнаафрыканскай краіне праходзіла службу каля тысячы нашых землякоў.

### КАРЫБСКІ КРЫЗІС

У параўнанні з іншымі канфліктамі, Карыбскі крызіс атрымаўся амаль бяскроўным. Аднак па напружанасці пераўзышоў усе разам узятыя. Свет літаральна стаяў на парозе новай вайны — ядзернай.

У экспазіцыі — макет дызельнай падводнай лодкі «Сом». Такія субмарыны ўдзельнічалі ў аперацыі «Кама», якая праводзілася ў межах стратэгічнай аперацыі «Анадыр» па размяшчэнні савецкіх ядзерных ракет на Кубе ў красавіку 1962 года. Макет у музей перадаў ураджэнец Капыльскага раёна Мінскай вобласці, капітан 1-га рангу ў адстаўцы Міхаіл Мароз. Быўшы памочнікам камандзіра падлодкі па палітчастцы, Міхаіл Мікалаевіч удзельнічаў у паходзе эскадры падводных лодак да берагоў Кубы.

**З шасці савецкіх генералаў, якія ў розныя гады ў Анголе займалі пасаду галоўнага ваеннага саветніка пры міністры абароны, былі два выхадцы з Беларусі.**

### ТРАГЕДЫЯ АФГАНІСТАНА

Падчас дзесяцігадовай вайны ў Афганістане загінуў 771 ураджэнец Беларусі, 12 зніклі без звестак. Прозвішчы ўсіх удзельнікаў баявых дзеянняў змешчаны ў электроннай кнізе памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

У музеі захоўваюцца асабістыя рэчы, абмундзіраванне, узнагароды, фотаздымкі і лісты вайскоўцаў, узоры зброі, супрацьпяхотных мін замежнай вытворчасці, шматлікія трафеі, захопленыя ў маджахедаў. Не пакідаюць абыякавымі лісты сем'ям Дзмітрыя Манкевіча і Ігара Кароткага, у якіх бацькі даведаліся аб смерці іх сыноў.

Кніга французскага пісьменніка Барыса Віяна «Пена дзён» нагадвае аб трагедыі, якая 19 красавіка 1984 года здарылася ў небе над Афганістанам. Маджахеды збілі савецкі ваенна-транспартны самалёт «Іл-76». Згаданая кніга праз год была знойдзена сярод абломкаў самалёта. Мяркуецца, гэта быў адзін з тых камсамольскіх падарункаў, якія адпраўлялі ў вайсковыя часці.

### ГЕРОІ АФГАНА

Воіны 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі першымі ўвайшлі на тэрыторыю Афганістана. Салдаты прабылі там амаль увесь перыяд баявых дзеянняў. На рахунку дывізіі — 8 Герояў Савецкага Саюза, чатыры з якіх — нашы землякі. Навечна залічаны ў асабовы склад славутага злучэння Васіль Шчарбакоў, Васіль Піменаў, Андрэй Мельнікаў і Мікалай Чэпік.

Герой Савецкага Саюза камандзір верталётнай эскадрыллі Васіль Шчарбакоў здзейсніў 318 баявых вылетаў. У адной з аперацый ён ажыццявіў пасадку пад агнём праціўніка, падабраў экіпаж збітага верталёта і вывез сваіх таварышаў з поля бою.

Больш як 35 баявых аперацый падчас афганскай кампаніі правёў камандзір батальёна 345-га гвардзейскага асобнага парашутна-дэсантнага палка маёр Васіль Піменаў. Будучы Героем Савецкага Саюза падчас адной з аперацый захапіў караван з лазурытам. Кошт здабычы на той час складаў 2,5 мільёна долараў. За савецкіх салдат і афіцэраў, знішчаную баявую тэхніку душманам плацілі каштоўнымі камянямі, у тым ліку лазурытам. Напрыклад, лідар таджыкскай групоўкі Ахмад Шах Масуд, які кантраляваў даліну ракі Панджшэр, мог расплачвацца рубінамі і ізумрудамі, якіх там было процьма.

У баях у Афганістане вызначыўся і кулямётчык гвардыі радавы Андрэй Мельнікаў, які ў няроўнай сутычцы з маджахедамі адстрэльваўся да апошняга патрона. Вось што пра магілёўчаніна пісалі яго таварышы: «Калі з мёртвага героя знялі бронекамізэльку, то здзіўляліся, як ён заставаўся жывым. Мяркуючы па раненнях, Андрэй павінен быў памерці яшчэ некалькі гадзін таму. Пласціны ад бронекамізэлькі былі ўціснуты ў яго цела выбуховымі хвалямі».

Яшчэ адзін герой той вайны — Мікалай Чэпік. Падчас аднаго з палявых выхадаў гвардыі старшы сяржант, намеснік камандзіра ўзвода трапіў з двума таварышамі ў засаду. Адстрэльваліся. Калі боепрыпасы скончыліся і два яго таварышы загінулі, Мікалай падарваў сябе і трыццаць двух маджахедаў супрацьпяхотнай мінай.

У сакавіку 1987 года ў Афганістане гераічна загінуў і камандзір разведвальнага батальёна маёр Аляксандр Плаціцын. Фотаздымкі, а таксама палявая форма афіцэра захоўваюцца ў музеі.




Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

За подзвігі, здзейсненыя падчас Карэйскай вайны, тры нашы лётчыкі сталі Героямі Савецкага Саюза.

### НА ВАРЦЕ МІРУ

Другая частка экспазіцыі паказвае значную ролю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў рэфармаванні і развіцці Узброеных Сіл, надзейным забеспячэнні абараназдольнасці нашай краіны, падтрыманні міру, стабільнасці і бяспекі.

Шэраг экспанатаў і фотадакументаў распавядае аб працы па ўвекавечванні памяці загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, клопаце дзяржавы аб ветэранах, аб дзейнасці сучасных сілавых структур. Узоры формы ратавальніка, ваеннаслужачага Ваенна-паветраных сіл, супрацоўніка мытні і пагранічніка асабліва вабяць юных наведвальнікаў экспазіцыі. Не меншую цікавасць выклікаюць і макеты ваенных самалётаў, якія стаяць на ўзбраенні беларускай арміі.





Вайскоўцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна ўносяць і сваю лепту ў захаванне памяці аб загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Экспазіцыя знаёміць і з навучальнымі ўстановамі Беларусі, дзе можна атрымаць ваенную адукацыю. Тут жа можна даведацца і пра адметных курсантаў. Навечна залічаны ў спісы асабовага складу 1-га ўзвода 2-га курса агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Дзмітрый Гвішыяні. Вяртаючыся з водпуску ў ноч з 28 на 29 жніўня 1999 года на цягніку ў Мінск, юнак разам са сваімі сакурснікамі дапамагаў тушыць полымя, якое раптоўна ахапіла цеплавоз. З моцнымі апёкамі Дзмітрый быў дастаўлены ў 432-гі галоўны ваенны клінічны шпіталь, але ўрачы не змаглі захаваць хлопцу жыццё. За выключную адвагу і асабістую мужнасць, праяўленыя пры ратаванні людзей падчас пажару, курсант быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць». Курсанцкія пагоны і заліковая кніжка героя, а таксама медаль, які выдаецца ўдзельнікам міжнароднага турніру па ушу імя Гвішыяні, — у экспазіцыі.

**Падчас дзесяцігадовай вайны ў Афганістане загінуў 771 ураджэнец Беларусі, 12 зніклі без звестак.**

Герой Ваенна-паветраных сіл і войск супрацьпаветранай абароны сучасных Узброеных Сіл нашай краіны — Уладзімір Карват. Славуты лётчык з'яўляецца і першым Героем Беларусі. Гэтага высокага звання ён быў удастоены пасмяротна: пры выкананні вучэбна-трэніровачнага палёту адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта.

* * *

І ў мірны час ёсць месца подзвігам. Сёння іх здзяйсняюць дзеці, унукі і ўжо праўнукі салдат Вялікай Айчыннай вайны. Нашчадкі пераможцаў годна працягваюць традыцыі сваіх продкаў, бо, як ніхто, ведаюць, што самае дарагое на зямлі — гэта мір. Больш падрабязна пра яго значэнне і цану мы пагаворым наступны раз — ужо апошні ў межах гэтага праекта.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
**Міхаіл ПАВАЛЯЕЎ,**
**загадчык сектара гісторыі пасляваенных узброеных канфліктаў аддзела ваенна-франтавой гісторыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.**



Узоры формы прадстаўнікоў сілавых структур асабліва вабяць наведвальнікаў экспазіцыі.



Экспазіцыя аб сучаснай беларускай арміі выклікае цікавасць маладога пакалення.

Сумесны праект Полаччыны і газеты «Звязда»

«Урочышча Пяскі»

# ПАЗНЕЙ — НЕ БУДЗЕ

**72 гады мы дазвалялі сабе адкладаць клопат пра палеглых салдат да больш багатых часоў. Магчыма, мы разважалі няправільна. Мы ніколі не будзем адчуваць сябе ўпэўнена, пакуль не аддадзім доўг тым, хто пакінуў свае дамы, каб абараніць нашу зямлю, і не вярнуўся. Мы ўжо ніколі не даведаемся імёны ўсіх. Але мы ведаем, дзе яны ляжаць. І мы павінны ўшанаваць такія месцы. Гэта і ёсць наш доўг. Далей адкладаць нельга.**

**У тым, што прывядзенне ў парадак брацкай магілы дзясяткаў тысяч савецкіх салдат у Полацку — справа ўсёй краіны, не сумняваецца старшыня праўлення Беларускага фонду міру Максім МІСЬКО. Ён упэўнены, што беларусы здольныя годна пахаваць сваіх воінаў, нягледзячы на фінансавыя цяжкасці.**



## НЕВЫПАДКОВА

Пра Пяскі Максім Місько даведаўся, калі ехаў на ўрачыстую цырымонію ўручэння старажытнага ваеннага сцяга Полацкаму кадэцкаму вучылішчу. Гэта было ў верасні мінулага года. Ён ехаў з Мінска ў адной машыне з дэпутатам Нацыянальнага сходу Наталляй Гуйвік, якая ў ніжняй палаце беларускага парламента прадстаўляе палачан. Яны размаўлялі пра гістарычны сцяг, значнасць яго вяртання на Радзіму праз 100 гадоў. Пра сімвалічнасць падзеі.

Абое юрысты, яны даўно ведаюць адно аднаго, але так сталася, што да гэтага моманту Максім Місько пра Пяскі не чуў. За месяц да паездкі ён узначаліў Беларускі фонд міру, пра гэта і паведаміў дэпутату. На што Наталля Гуйвік усклікнула: «Вось як! Дык у нас ужо ёсць для вас справа ў Полацку!» І ўголас падзякавала Богу. А потым коратка расказала Максіму Уладзіміравічу пра Пяскі. Пазней, на афіцыйнай сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў, перадала яму ўсе матэрыялы.

## ПЕРАДГІСТОРЫЯ

Наталля Гуйвік з 2010 года, спачатку як дэпутат Полацкага гарадскога Савета, потым як парламентарый робіць усё ад яе магчымае, каб астанкі дзясяткаў тысяч людзей — ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, якія больш за 70 гадоў заставаліся ледзь прыкрытыя пяском ва ўрочышчы Пяскі ў Полацку, былі годна пахаваныя. Яна адчувае асабістую адказнасць за лёс гэтага трагічнага месца ў родным горадзе.

Восенню 2013 года газета «Звязда» падключылася да гэтай справы, стварыўшы сумесны з полацкай грамадскасцю, ад імя якой выступіла Наталля Гуйвік, інфармацыйны праект «Урочышча Пяскі». У рамках праекта на старонках «Звязды» выйшаў цыкл матэрыялаў: рэпартажы, сведчанні відавочцаў, інтэрв'ю з гісторыкамі і ваеннымі, «круглы стол» з удзелам паслоў трох дзяржаў, архівістаў, краязнаўцаў, ваенных спецыялістаў і грамадскіх дзеячаў. Газета неаднаразова публікавала рахунак для пераводу грошай на будаўніцтва мемарыяла.

Справа рухалася, але марудна. За апошнія два гады месца масавага пахавання на левым беразе ракі Палата, дзе вецер і дождж перыядычна агалялі чалавечыя косткі, было нарэшце накрыта дадатковым слоем грунту. Гэта прыкладна палова ад запланаваных вертыкальных работ. Раней там была ўсталявана мемарыяльная Дошка памяці. Аднак мемарыял дагэтуль застаецца незавершаным з-за недахопу сродкаў. На гэтым этапе пра яго і даведаўся Максім Місько.

## КОЛА ЗАМКНУЛАСЯ

У 2010 годзе менавіта Беларускі фонд міру, Полацкае гарадское аддзяленне, звярнуўся ў Полацкі гарвыканкам і гарадскі Савет дэпутатаў з просьбай аб увекавечанні памяці тых, хто ляжыць у Пясках. Тады палачане, якія не ведалі, што пад іх нагамі — вялізная магіла з незлічонымі целамі салдат і простых гараджан, у тым ліку жанчын і дзяцей, ладзілі ў Пясках пікнікі, выгульвалі сабак, бралі адсюль пясок для сваіх патрэб. Віцебскае абласное аддзяленне Беларускага фонду міру адкрыла пяць гадоў таму спецрахунак па зборы сродкаў на будаўніцтва мемарыяла. Цяпер аўтарытэтная грамадская арганізацыя падключылася да стварэння мемарыяла на рэспубліканскім узроўні.

— У лістападзе 2015 года мы сумесна з Полацкім райвыканкамам правялі пашыраную нараду з удзелам гісторыкаў і патэнцыйных спонсараў, — расказвае Максім Місько. — На нарадзе прааналізавалі, чаму адбылося запавольванне будаўніцтва, што трэба зрабіць, каб актывізаваць працэс, размеркавалі адказнасць за далейшыя дзеянні. Ад полацкага райвыканкама праект цяпер курыруе старшыня раённага Савета дэпутатаў Іосіф Грыбовіч. Ён перажывае за справу ўсёй душой.

Пазней на бюро праўлення Беларускага фонду міру старшыня прапанаваў вывесці праект з абласнога ўзроўню на рэспубліканскі, каб грошы на яго фонд збіраў па ўсёй краіне.

— Размова была няпростай, — прызнаецца Максім Місько. — Кіраўнікі абласных аддзяленняў сталі казаць, што масавыя пахаванні вязняў нямецкіх канцлагераў ёсць і на тэрыторыі іншых абласцей. Я пагадзіўся, што ўвагі заслугоўваюць не адны толькі Пяскі, але гэтае месца асаблівае, бо размова ідзе не проста пра будаўніцтва мемарыяла. У Пясках трэба па-чалавечы пахаваць людзей. Яны чакаюць гэтага ад нас каля 75 гадоў. Мы не можам рухацца наперад, пакуль не зробім гэтага.

Старшыня праўлення Беларускага фонду міра разважае так: навошта казаць пра тое, што наша зямля шматпакутная, калі нічога не рабіць? Гэта першае. Другое — калі адразу хапацца за ўсё, то сілы распыляцца, а вынік не будзе дасягнуты. Аргументы пачулі, і цяпер 148 раённых і гарадскіх арганізацый Беларускага фонду міру па ўсёй Беларусі збіраюць грошы на мемарыял у полацкіх Пясках. Дзеля таго, каб сканцэнтраваць свае намаганні на завяршэнні мемарыяла ў Полацку, грамадская арганізацыя прыпыніла збор сродкаў на будаўніцтва ўнікальнага Храма міру ў вёсцы Наваспаск на Гродзеншчыне.

## СПРАВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГОНАРУ

— Гэта вельмі важна і з пункту погляду ідэалогіі, бо мы можам паказаць, што нават не ў самыя спрыяльныя часы, аб'яднаўшыся, здольны рэалізаваць любы праект. Што мы можам усё, — упэўнены Максім Місько.

**«Я пагадзіўся, што ўвагі заслугоўваюць не адны толькі Пяскі, але гэтае месца асаблівае, бо размова ідзе не проста пра будаўніцтва мемарыяла. У Пясках трэба па-чалавечы пахаваць людзей. Яны чакаюць гэтага ад нас каля 75 гадоў».**

Яго думку пацвердзіла і начальнік фінансавага аддзела Полацкага райвыканкама Марыя Карасёва, якая заўважыла пры асабістай размове, што праекты, рэалізацыя якіх залежыць ад актыўнасці грамадства, ажыццяўляюцца менавіта ў цяжкія часы, калі фінансавае становішча людзей пагаршаецца. Чаму так адбываецца — прадмет для разваг псіхолагаў. Магчыма, калі даходы памяншаюцца, людзі становяцца больш адказнымі і больш правільна выстройваюць свае прыярытэты.

З гэтага пункту погляду старшыня праўлення Беларускага фонду міру супраць таго, каб для будаўніцтва мемарыяла ў Пясках прасіць дапамогі ў замежнікаў. Нягледзячы на тое, што логіка ў звароце да іншых дзяржаў ёсць, бо большасць з тых, хто ляжыць у Пясках, — не беларусы.

У канцэнтрацыйны лагер Дулаг-125, адкуль штодня на працягу трох з паловай гадоў сотнямі звозілі ў Пяскі целы памерлых і забітых, трапілі савецкія ваеннапалонныя з 214-й стралковай дывізіі, якая фарміравалася ва Украіне, і 62-га стралковага корпуса, які фарміраваўся на Урале. У полацкім лагеры было таксама шмат масквічоў, а яшчэ польскія і італьянскія ваеннапалонныя. Вядома, што апошніх там было 846. Больш за тое, у Пясках (а гэта вялікая пустка на месцы даваеннага стрэльбішча) немцы хавалі і сваіх салдат — у асобных магілах. Менавіта таму загадчык полацкага Музея баявой славы, аўтар кнігі «Урочышча Пяскі — тэрыторыя смерці. 1941—1944» Сяргей Копыл лічыць, што мемарыяльны комплекс на гэтым месцы павінен мець міжнароднае значэнне.

— Ёсць тут момант гонару. Можна грошы прасіць на нешта іншае. Але сваіх салдат мы павінны пахаваць самі, — кажа на гэта Максім Місько.

Беларускі фонд міру звярнуўся таксама да ўсіх воінаў Беларусі. Пад зваротам свае подпісы паставілі старшыня праўлення Беларускага фонду Міра Максім Місько, старшыня Беларускага саюзу афіцэраў Уладзімір Бамбураў, старшыня Беларускага саюзу суvoраўцаў і кадэтаў Юрый Сянькоў і старшыня Беларускага саюзу ветэранаў вайны ў Афганістане, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Валерый Гайдукевіч.

Ідэю падтрымала Міністэрства абароны. У воінскіх часцях прайшлі афіцэрскія сходы, на якіх было прынята рашэнне пра ўдзел у зборы грошай. Зварот да беларускіх воінаў быў разасланы ў Суворраўскае і ва ўсе кадэцкія вучылішчы краіны. У выніку на працягу трох тыдняў на будаўніцтва мемарыяла пералічаны больш за 358 мільёнаў рублёў. І гэта толькі пачатак. Да праекта падключыўся Следчы камітэт, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У найбліжэйшы час Максім Місько плануе сустрэцца з кіраўніцтвам Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і Міністэрства ўнутраных спраў.

— Людзям у пагонах словы «гонар» і «годнасць» асабліва зразумелыя, — заўважыў старшыня праўлення Беларускага фонду міру. — З іх ніхто яшчэ не сказаў: «Няма грошай», і ніхто не спытаў: «А навошта?»

Калі тэмпы пералічэння грошай захаваюцца, то, з дапамогай дзяржавы, будаўніцтва мемарыяла можна будзе завяршыць да канца гэтага года. Дэпутат Наталля Гуйвік глядзіць на справу яшчэ больш аптымістычна.

— Спадзяюся, што ўжо да 22 чэрвеня, да гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны, мы зможам зрабіць уваходную групу, пляцоўку перад Сцяной памяці і паставім невялікі помнік воінам 1812 года, бо на гэтым месцы ляжаць не толькі ахвяры фашызму, там ішлі кровапралітныя баі ў вайну з Напалеонам, — кажа Наталля Гуйвік. — Чатыры мільярды рублёў на мемарыял у Пясках сёлета запланаваны ў мясцовым бюджэце, і я вельмі прашу, каб сродкі былі выдаткаваны менавіта ў другім квартале. Яшчэ мільярд рублёў рэальна сабраць да мая, бо на рахунку цяпер знаходзіцца палова мільярда. Магчыма, на капліцу грошы выдаткуе прыватны спонсар.

Адначасова да работы па высвятленні імён тых, хто загінуў у канцлагеры Дулаг-125, далучыліся Міжнародная асацыяцыя фондаў міру і фонд «Народная памяць».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

**P.S. Грашовыя сродкі на стварэнне мемарыяла «Урочышча Пяскі» ў Полацку можна пералічыць у Віцебскае абласное аддзяленне ГА «Беларускі фонд міру» на рахунак №3135411066036 (у беларускіх рублях), №3135411066502 (у доларах), №3135411066805 (у расійскіх рублях) у дырэкцыі ТАА «Белінвестбанк» па Віцебскай вобласці, код 153001739, УНП 300126737, АКПА 05836097.**

**На сайце Беларускага фонду міру http://fondmira.by/ можна прасачыць за тым, колькі грошай паступіла на рахунак і як яны трацяцца.**



**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

✓ Оценка оборудования и транспортных средств
✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИЗЪЯТОГО ИМУЩЕСТВА,

### который состоится 18 марта 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение (банно-прачечный комбинат) с инв. № 342/С-29718 площадью 495,2 кв.м. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 325076201601000216 площадью 0,2993 га** | Двухэтажное кирпичное здание, перегородки кирпичные, перекрытия ж/б плиты, крыша шиферная и совмещенная, отопление, электроснабжение, водопровод, канализация | 1 513 205 800 | 151 320 580 |

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта продажи** | **Гомельская обл., Светлогорский р-н, Сосновоборский поссовет, аг. Печищи, ул. Советская, 12** |
| **Срок подачи заявления** | **По 16 марта 2016 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Продавец имущества** | **Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при Светлогорском райисполкоме** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%. Победитель обязан не позднее тридцати календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона оплатить стоимость объекта и возместить в течение трех рабочих дней затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**

**1. Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона (Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника») р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 по 16 марта 2016 года от даты опубликования настоящего извещения.**

**2. Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, по 16 марта 2016 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; гражданину Республики Беларусь – копия паспорта и копия договора на открытие текущего (расчетного) счета (в случае отсутствия у физического лица текущего счета – необходимо его открыть); представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, заверенная нотариально.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт. В случае отсутствия у физического лица расчетного счета необходимо открыть текущий расчетный банковский счет в любом банке РБ.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество не позднее тридцати календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона; возместить в течение трех рабочих дней затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет стоимости продажи имущества.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

### по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **7 апреля 2016 г. в 14.00 г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15, Мядельский сельский исполнительный комитет** |
| **Место, дата и время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов** | **г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 16, Мядельский сельский исполнительный комитет, тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-1797) 55-7-36<br>С момента опубликования извещения до 16.00 5 апреля 2016 г. В рабочие дни с 8⁰⁰ до 13⁰⁰ и с 14⁰⁰ до 17⁰⁰** |
| **Порядок осмотра земельных участков на местности** | **В рабочие дни с 8⁰⁰ до 13⁰⁰ и с 14⁰⁰ до 17⁰⁰** |
| **Условия проведения аукциона** | **Наличие не менее двух участников** |
| **Продавец** | **Мядельский сельский исполнительный комитет** |
| **Организатор аукциона** | **Мядельский сельский исполнительный комитет: г. Мядель, ул. 17 Сентября, д. 7, каб. 15-16, тел. (8-01797) 55-7-35, тел./факс (8-1797) 55-7-36** |
| **Размер задатка и документы, представляемые для участия в аукционе** | *Размер задатка: 10% от начальной цены.<br>Документы: заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ удостоверяющий личность, для юридического лица – копия свидетельства о государственной регистрации.<br>Реквизиты: р/с 3641061900110 ОАО «АСБ Беларусбанк», ЦБУ № 619 филиала 601 г. Молодечно, код 769, УНН 600380436, код платежа 04901.* |

| ЛОТ № 1 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Новая, участок № 3 площадью 0,1320 га (кадастровый номер 624083103601000258).<br>**Начальная цена 300 000 000 (Триста миллионов) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне. |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне озера Нарочь на площади 0,1320 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Улица асфальтирована |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего **21140416** бел. руб., в том числе:<br>формирование земельного участка – 9894801 бел. руб.<br>оформление градостроительного паспорта – 9244879 бел. руб.<br>государственная регистрация земельного участка – 630000 бел. руб.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 1370736 бел. руб. |

| ЛОТ № 2 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Гатовичи, ул. Центральная площадью 0,2289 га (кадастровый номер 624083103601000247).<br>**Начальная цена 120 000 000 (Сто двадцать миллионов) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него. |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы озера Мястро на площади 0,2289 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Отсутствуют |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего **16044139** бел. руб., в том числе:<br>формирование земельного участка – 6467340 бел. руб.<br>государственная регистрация земельного участка – 300000 бел. руб.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 9276799 бел. руб. |

| ЛОТ № 3 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Россохи, У-1 площадью 0,2000 га (кадастровый номер 624083109901000060).<br>**Начальная цена 200 000 000 (Двести миллионов) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне. |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением его в водоохранной зоне озера Мядель на площади 0,2000 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Отсутствуют |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего **20418290** бел. руб., в том числе:<br>формирование земельного участка – 8032730 бел. руб.<br>оформление градостроительного паспорта – 8403549 бел. руб.<br>государственная регистрация земельного участка – 648000 бел. руб.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 3334011 бел. руб. |

| ЛОТ № 4 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в д. Азарки-Дворище площадью 0,2258 га (кадастровый номер 624083100101000051).<br>**Начальная цена 50 000 000 (Пятьдесят миллионов) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне. |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,0060 га, охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения на площади 0,0062 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Электрические сети, асфальтированный подъезд. Имеется возможность газификации |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего **18347015** бел. руб., в том числе:<br>формирование земельного участка – 8032730 бел. руб.<br>оформление градостроительного паспорта – 8403549 бел. руб.<br>государственная регистрация земельного участка – 540000 бел. руб.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 1370736 бел. руб. |

| ЛОТ № 5 | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания) в Азарки-Пудовинка площадью 0,2500 га (кадастровый номер 624083100601000098).<br>**Начальная цена 50 000 000 (Пятьдесят миллионов) белорусских рублей.**<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены. |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона не состоявшимся внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>возместить затраты связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации;<br>в течение двух месяцев после проведения аукциона осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в установленном порядке получить разрешение на строительство жилого дома;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее одного года со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);<br>произвести снятие плодородного слоя грунта и использовать его для нужд, связанных со строительством объекта;<br>соблюдать режим хозяйственной деятельности в водоохранной зоне. |
| **Ограничения в использовании земельного участка** | Ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи, напряжением до 1000 В на площади 0,0020 га |
| **Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений** | Электрические сети, асфальтированный подъезд. Имеется возможность газификации |
| **Информация о затратах на организацию и проведение аукциона** | Всего **18347015** бел. руб., в том числе:<br>формирование земельного участка – 8032730 бел. руб.<br>оформление градостроительного паспорта – 8403549 бел. руб.<br>государственная регистрация земельного участка – 540000 бел. руб.<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 1370736 бел. руб. |

# ЗВАНІ ЗВАНЧЭЙ, ЗВОН!

## З ЧАГО ЎСЁ ПАЧЫНАЛАСЯ?

— Я скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі па класе цымбал. Нас, музыкантаў, заўсёды вучылі: шукай гук. Натуральна, што нават на адных і тых жа інструментах усе іграюць па-свойму. І калі я пачула звон, яго гук мяне проста ўразіў глыбінёй, непаўторнасцю, яго нельга ўзнавіць на іншых інструментах. Даведалася, што ў Мінску распачала працу Школа званароў пры храме прыхода «Усіх тужлівых Радасць», яе ўзначальваў Аляксандр Маліноўскі, ён выдаваў і часопіс «Звонница».

Але ў школе нас вучылі фактычна рускай, маскоўскай, традыцыі звона, а яго гісторыю мы вывучалі толькі па адной кнізе, выдадзенай яшчэ да рэвалюцыі, — «Гісторыя званоў і званаліцейная вытворчасць» Мікалая Алавяшнікава. Пра тое, якая спадчына захавалася ў нас, у Беларусі, ніхто не мог дакладна расказаць. Больш за тое, у пачатку 2000-х гадоў у многіх храмах яшчэ не было званоў, напрыклад, у Свята-Пятра-Паўлаўскім саборы ў сталіцы на званіцы віселі чыгунначныя рэйкі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі скончыла школу званароў, пачала званіць у храме у гонар Уладзімірскай іконы Божай Маці. Але ў 1990-я гады некаторыя людзі сябе дрэнна адчувалі, калі чулі званы. Такое і сёння сустракаецца. Вось і жанчына, якая жыла непадалёк ад храма, напісала скаргу ў міліцыю, была заведзена справа. Настаяцель храма айцец Аляксандр Рудчанка параіў мне пакуль не званіць на службу.

— Тыя, хто некалі званіў ці звоніць цяпер, мяне зразумеюць: да гэтага прывыкаеш так, што справа становіцца проста неабходнасцю, гэта радасць душы, якую ні з чым нельга параўнаць. Тады айцец Аляксандр мне параіў: звані словам, пішы!..

Атрымаўшы блаславенне самога Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі Філарэта, а таксама афіцыйнае пасведчанне з просьбай спрыяць у даследаванні, я рушыла ў амаль бясконцую экспедыцыю. Менш як за 10 гадоў пабывала ў трох сотнях храмаў, працавала ў архівах Літвы, Польшчы, Расіі, Беларусі, у музеях, дзе ў сховішчах ёсць званы, сабрала ўнікальны матэрыял. Гэта і звесткі пра тое, якія званы былі ў нашых храмах, якія з іх вывозіліся ў пачатку Першай сусветнай вайны. Было бясконца многа сустрэч з людзьмі, цікавых расповедаў, найбольш адметныя з іх змешчаны ў новым выданні.



Званар Іван ЛЯНКЕВІЧ з Маладзечна.

## НАШЫ ЗВАНЫ — УНІКАЛЬНЫЯ, І ІХ ЗАХАВАЛІ ВЕРНІКІ

— У храмах Беларусі, нават самых маленькіх вёсачках, захаваліся ўнікальныя званы. Але дакладнае месца іх размяшчэння называць не буду: былі выпадкі, калі пасля публікацый у прэсе каштоўныя прадметы — гэта было з абразамі, — знікалі з храмаў. У нас адметныя і самі мелодыі звонаў. Мы маем тое, чаго няма на ўсёй постсавецкай прасторы. Па матэрыялах экспедыцый я выявіла, што ў 19 храмах Беларусі захаваўся канон царкоўнага звону. Проста цуд!

У маёй новай кнізе прадстаўлены звесткі пра многія ўнікальныя гістарычныя званы XVII–XIX ст. Некаторыя з іх павінны знаходзіцца ў музеях — настолькі вялікая іх культурная каштоўнасць. Ёсць у выданні і факты, што могуць стаць сенсацыйнымі. Так, напрыклад, тут змешчана выява фрагмента звона з надпісам XII стагоддзя. Ён быў знойдзены на Замкавай гары ў Гродне. Раней жа лічылася, што надпісы на званах сталі рабіць з XIV стагоддзя. Ці ўнікальны звон з адтулінамі, адліты нямецкім майстрам Германам Моцфільдам у 1598 годзе ў нясвіжскай ліцейні князя Радзівіла. Дарэчы, такія званы на беларускіх землях з'явіліся на стагоддзе раней, чым у Расіі, а з-за таго, што гучалі надзвычай гучна і прыгожа, іх называлі «цымбаламі».

## КАТАЛІЦКІЯ ЦІ ПРАВАСЛАЎНЫЯ І АДКУЛЬ ДА НАС ПРЫЙШЛІ?

— Сярод навукоўцаў няма згоды наконт афіцыйнага дазволу папы Сабініяна (604–606) на выкарыстанне званоў у набажэнствах. Няма і адзінай версіі пра тое, што святы епіскап Нолы (Італія) Понцій Мітрапілій Паўліній (каля 353–431) мае дачыненне да іх з'яўлення. Вядомы амерыканскі даследчык XX ст. Эдвард Уільямс, аўтар кнігі «Званы Расіі: гісторыя і тэхналогія» многа гадоў працаваў у архівах і не знайшоў гэтаму пісьмовых доказаў. Значыць, можна меркаваць, што ў той час званы яшчэ не выкарыстоўваліся.

На зямлі тагачаснай Белай Русі праваслаўнае набажэнства, спевы прыйшлі з Візантыі, а звон — з Захаду, але не адразу. Спачатку выкарыстоўваліся білы, кляпалы. Зразумела, звон быў вялікай каштоўнасцю. Таму, калі ворагі захоплівалі мясцовасць, то першае і галоўнае, што рабілі — здымалі звон, голас.




І па форме, і па гучанні званы ў касцёлах і цэрквах сёння крыху адрозніваюцца, а ў XVI–XIX ст. адлівалі іх адны і тыя ж майстры. Яшчэ больш усё змяшалася з пачаткам Першай сусветнай вайны, калі званы пачалі вывозіць ці закопваць у зямлю — так рабілі каталікі, пратэстанты і праваслаўныя — каб захаваць.

На жаль, сёння ў касцёлах часта выкарыстоўваюць сістэму «Электронны званар», у праваслаўных храмах тэндэнцыя замяняць чалавека электронікай таксама назіраецца. І гэта не ідзе на карысць: сістэмы каштуюць дорага, патрабуюць абслугоўвання, а традыцыя званарства знікае. Некаторыя святары пачынаюць разумець памылку і шукаюць сапраўднага званара.

## МАЙСТЭРСТВА ЯК СПАДЧЫНА

— Сучасныя гарадскія званары і джазам, і рокам раней захапляліся, і маюць музычную адукацыю, таму імкнуцца пазваніць хутчэй, грамчэй, каб больш людзей пачула і прыйшло на службу. У гэтым ёсць доля праўды. Але ў маленькіх гарадах і вёсках цягам доўгіх гадоў гучыць адзін і той жа матыў, мелодыя, а майстэрства званіць перадаецца з пакалення ў пакаленне. У гэтай аднастайнасці, традыцыйнасці і хаваецца каштоўнасць. Звоны вельмі простыя, павольныя, у іх няма рытмічнай шматстайнасці, хуткага тэмпу, пераліваў. Вось чаму падчас экспедыцый нельга спрабаваць уразіць мясцовых званароў сваім майстэрствам, паказваць, як умееш. Для іх тэхнічныя трукі, складаныя камбінацыі чужыя, а значыць — непрымальныя і непрыгожыя. Гучанне званоў з іх царквы — самае роднае. Яны любяць сам гук, гэта іх духоўнае і фізічнае здароўе.

Вельмі важна, каб маладыя святары, якія прыязджаюць служыць у храмы, з павагай пераймалі майстэрства ад званароў-старажылаў, не пачыналі іх вучыць. Але, на жаль, у беларускіх духоўных семінарыях пакуль не выкладаюць кампаналогію: не вучаць, як званіць, не знаёмяць з традыцыяй званарства. А яна захавалася толькі ў нас! Яе вывучаюць у Новасібірскай, Іркуцкай школах званароў! У нас не вучаць як даглядаць самі званы, як правільна павесіць новыя. Пасля таго, як я пабывала ў храмах і гутарыла з настаяцелямі, у некаторых цэрквах сталі з'яўляцца пастаменты са званамі. Хай яны ўжо і не гучаць са званіцы, бо маюць пашкоджанні, але зберагаюцца як вялікая каштоўнасць, помнік культуры XVII–XX стагоддзяў, святыня.

**«Я запісала расповед пра дзяўчынку, якая выратавала звон. Калі яго знішчалі ў 1930-я гады, яна падбегла і ўзяла кавалачак сабе. Заўважылі, што яе жыццё склалася вельмі шчасліва: муж вярнуўся з вайны, адзіны мужчына з вёскі, нарадзіліся паслухмяныя і добрыя дзеці».**

Прайшло каля 25 гадоў з таго моманту, як званы загучалі адкрыта паўсюль, дзе яны захаваліся. Між тым значная іх частка, цудам перажыўшы войны і ліхалецце, была перабіта. Чаму? З-за няведання элементарных правілаў абыходжання. Гэта здаралася там, дзе не было званара. Многія дзяржавы маюць музеі званоў, але, на жаль, у нашай краіне такога музея пакуль няма. Клопат аб захаванні ўнікальных помнікаў духоўнай спадчыны народа — гістарычных званоў — павінен стаць паказчыкам узроўню развіцця нашай грамадзянскай супольнасці.



Алена ШАЦЬКО са званаром Канстанцінам ГРЫШЧУКОМ з вёскі Стрэльна Іванаўскага раёна.

## ЖАНЧЫНА — ЗВАНАР?!

— Жанчыны ўзняліся на званіцы пасля Вялікай Айчыннай вайны. Сапраўды, да вайны званіць на службу было выключна мужчынскай справай. Мне пашанцавала сустрэць адну жанчыну-званара — Ксенію Цімахавец, майстэрства ёй перадаў свёкар, які калісьці быў проста легендай сваёй справы, з розных месцаў спецыяльна прыязджалі ў вёску Дубай, што на Століншчыне, каб яго паслухаць. А сёння жанчыны звоняць нароўні з мужчынамі. І да сябе я заўсёды адчуваю добрае стаўленне.

## АХВЯРА ДЗЕЛЯ ЦУДУ

— Я запісала расповед пра дзяўчынку, якая выратавала звон. Калі яго знішчалі ў 1930-я гады, яна падбегла і ўзяла кавалачак сабе. Захавала. І ўсе заўважылі, што жыццё гэтай дзяўчынкі склалася вельмі шчасліва: яе муж вярнуўся з вайны, адзіны мужчына з вёскі, нарадзіліся паслухмяныя і добрыя дзеці. І ў вёсцы лічылі: усё таму, што яна выратавала звон.

Я занатавала многа апавяданняў пра тое, як звон, ахвяраваны храму, станоўча ўплываў на лёс чалавека: нараджаліся дзеці, вылечваліся цяжкія хваробы. Званы часам ахвяравалі і маладыя, калі ішлі пад вянец у храме. Прасачыць гісторыю такіх ахвяраванняў і нават даведацца пра лёс дарыльшчыкаў дапамагаюць надпісы на званах. Падчас працы над гэтым даследаваннем я мыла званы, фатаграфавала, расчытвала надпісы на іх, усяго пашпартызавала каля дзвюх тысяч званоў. Гэтыя звесткі таксама можна пабачыць у кнізе. А самі надпісы на званах надзвычай цікавыя і змястоўныя — на польскай, нямецкай, лацінскай, царкоўнаславянскай мовах. Па іх можна напісаць не адну дысертацыю.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*
**Фотаздымкі з архіва герaіні.**

ZVAROT@ZVIAZDA.BY ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVIAZDA.BY ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

■ Людзі і лёсы

# ЗОРКА мая ВАЛЯНЦІНА



**...Бяда прыйшла, адкуль не чакалі: гарачым ліпеньскім днём 1981 года, купаючыся ў рацэ, я нырнуў і ўрэзаўся галавой у пясчанае дно. Яшчэ пашчасціла — людзі выцягнулі на бераг. Але медыцынскае заключэнне было, як прысуд: кампрэсійны пералом пазваночніка ў шыйным і грудным аддзелах з пашкоджаннем спіннога нерва, поўны параліч цела. Карацей, на той момант ніхто не мог абяцаць мне жыццё, бо з такімі дыягназамі ці не ўсе пaміралі — хто адразу, хто трохі пазней. Вось і мне было адпушчана дзён шэсць ці сем — тыдзень.**

Потым, калі ён мінуў (між зямлёй і небам), высветлілася, што нерв усё ж застаўся цэлы, і дактары сказалі маёй жонцы, што жыць я, хутчэй за ўсё, буду, але ж доля мая — ляжаць ці, у лепшым выпадку, сядзець у інваліднай калясцы.

Для 30-гадовага чалавека гэта жорсткі прысуд, але яго не абскардзіш.

Жонка ўзяла адпачынак за свой кошт, каб не проста наведваць мяне ў бальніцы, а хоць нечым дапамагаць.

«Адпачынак» гэты доўжыўся пяць месяцаў, якія мая Валянціна пражыла паміж двух агнёў: дома былі сыны (шасці і дзевяці гадоў), у бальніцы — я. Жонка паспявала ўсюды. Яна не раскісала і не плакала, заўсёды была хораша апранутай і акуратна прычасанай. Здаралася, праўда, што на вачах у яе выступалі слёзы, але гэта часцей ад фізічнага бяссілля, калі трэба было, напрыклад, шмат разоў згінаць і разгінаць мае паралізаваныя ногі і рукі альбо варочаць цела пры апрацоўцы пролежняў.

Яна, Валянціна, была маёй жонкай і маці, медсястрой і санітаркай, а яшчэ — трэнерам. Яна не магла змірыцца з прысудам медыкаў, яна хацела, каб я хадзіў.

Мы разумелі, што гэта цяжка, нават амаль немагчыма, але, з іншага боку, у нас наперадзе было цэлае жыццё, і мы шукалі тую саломінку, за якую — чаго б гэта ні каштавала — трэба ўчапіцца, каб нарэшце ўстаць!

Употай ад лекараў мы рабілі розныя практыкаванні, нават тыя, што яны забаранялі, што ўрэшце аказалася і патрэбным, і карысным. Я нанова вучыўся таму, чаму вучацца малыя дзеці — стаяць і хадзіць.

Пасля найцяжэйшых пяці месяцаў на бальнічным ложку, з першай групай інваліднасці, якую далі пажыццёва, мяне выпісалі дахаты і нават адвезлі на «хуткай», як ляжачага. Але ж трэба сказаць, што намаганні дактароў і жонкі былі не марнымі: пакрысе аднаўлялася адчувальнасць канечнасцяў, некаторыя рухі. І хоць наперадзе была невядомасць і вялікая праца, не згасала надзея ўстаць на ногі, пайсці.

Для гэтага трэба было не зазіраць у імглістую далеч, а дзейнічаць, прычым зараз. Мы казалі сабе, што няма ніякіх заўтра: дзень выратавання — сёння. Жыць цяжка, але можна, тым больш, калі ты не адзін.

Карацей... Праз шэсць месяцаў і пятнаццаць дзён пасля траўмы я пайшоў. Пайшоў адзін, без чыёйсьці дапамогі, без падтрымкі, нават без страхоўкі. Я хадзіў па кватэры ад акна да акна. Мяне не бянтэжыла непаслухмянасць маіх ног і рук. Галоўнае — быў пачатак!

...З таго часу праляцелі гады. 45 з іх мы з Валянцінай пражылі ў законным шлюбе, хоць, дарэчы, і без пярсцёнкаў... Тады, у лістападзе 1971-га, калі мы стваралі сям'ю, іх не дакупіцца было.

Але ж гэта хіба перашкода для маладых і шчаслівых? Мы проста кахалі і адно для аднаго былі гатовыя на ўсё. А самае галоўнае — мы цудоўна разумелі: каб нечага ў жыцці дамагчыся, трэба ўмець фармуляваць свае жаданні, адказваць за ўчынкі. І калі першыя дзесяць гадоў нашага сумеснага жыцця прайшлі ў агульных мэтах і клопатах, дык у наступныя, калі я стаў інвалідам, жонцы прыйшлося рабіць свой выбар — заставацца са мной ці, магчыма, расстацца. Ніякае багацце, апроч дзяцей, яе не трымала, дзяліць не было чаго. Яна магла б пайсці, але...

Яна вырашыла застацца.

Кажуць, трактар жалезны — і той не вытрымлівае моцнай нагрузкі, ломіцца, а вось чалавек... Жонцы, гіпертоніку, трэба, здавалася б, берагчы сябе, жыць у спакоі. Але так, на жаль, не атрымалася. Безліч нягод яна перанесла са мной. А потым трагічна загінуў наш малодшы 26-гадовы сын...

Ужо тройчы мая Валя сама апынулася між жыццём і смерцю, але ж, дзякаваць Богу, выжывала, не апускала рук — змагалася са сваімі хваробамі, магчыма, цудоўна разумеючы, што маё жыццё шмат у чым (калі не ва ўсім) залежыць ад яе.

Ніхто, нідзе і ніколі не навучыць чалавека жыць і кахаць. Гэтыя веды кожны набывае сам. Мая жонка здолела зразумець глыбіню гэтых паняццяў і цяпер дзеліцца «сакрэтамі» з сынам, нявесткай і ўнучкай. Яна кажа, што няма няшчасця, з якім нельга было б жыць, што многае, на першы погляд зусім немагчымае, можа потым стаць прывычным і нават лёгкім.

І сапраўды: не без горычы, не без болю пpыняўшы крыж, які выпаў на долю нашай сям'і, мы вырашылі, што пражывём адведзены час, вызначаючы прынцып: «Шкадуй не пра тое, што Бог не даў, — цешся тым, што ён не адняў!»

А ў выніку...

«Ты шчаслівы, — часам кажуць мае знаёмыя, — табе адмысловая зорка свяціла!»

І я ім тады заўсёды адказваю: «Свяціла і свеціць — самым жывым святлом. Гэтая зорка — мая Валянціна, мая каханая жонка, дзякуючы якой я жыў і жыву!»

**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ,**
*г.п. Глуск.*

■ Ёсць пытанне

# ГЭТА БУДЗЕ ЗАЎТРА?

**Пра што толькі ні паведамляюць цяпер сродкі масавай інфармацыі?! У інтэрнэце, на экранах тэлевізараў, на старонках газет, у праграмах радыё — і навіны, і высокія візіты, і вопыт работы прадпрыемстваў, і цэны, і курсы валют, і крымінальная хроніка... Але ўсё ж, бяруся сцвярджаць, ёсць тры тэмы, якія хвалююць усіх. Гэта здароўе, грошы і прагноз надвор'я.**

Наша сям'я даўно ўжо сябруе са «Звяздой»: шмат гадоў выпісваем, з задавальненнем чытаем, бо гэтая газета — у чым не раз пераканаліся — і сапраўды піша пра тое, што важна.

Але ж іншыя крыніцы інфармацыі чалавеку таксама патрэбны. Мы па вечарах у нядзелю, напрыклад, заўжды ўключаем «Беларусь 1», чакаем перадачу «Навіны надвор'я». Калі верыць праграме, пачатак яе ў 22 гадзіны 35 хвілін. Як для вяскоўцаў і для зімы — дык гэта вельмі позна, але ж кожны мае намеры нешта зрабіць, загадзя плануе свой тыдзень. Значыць, інфармацыя пра надвор'е будзе на карысць...

І мы, відаць, дачакаліся б, паглядзелі патрэбную праграму, калі б яна час ад часу не пераносілася — добра, калі на 10—15 хвілін, а то ж, здараецца, на ўсе 30 ці 40.

Як на мой погляд, дык гэта вельмі няправільна. Прынамсі, далёка не ўсе могуць дазволіць сабе дачакацца «Навін...», спакойна і да канца паглядзець іх, бо шмат каму рана ўставаць.

У падобных выпадках перадачу трэба было б паўтараць — напрыклад, раніцай у панядзелак. Раней падобная практыка існавала (ды і цяпер яна існуе ў дачыненні да іншых перадач), а вось да «Навін надвор'я» — чамусьці не. Прынцыповае пытанне: чаму?..

Ну напэўна ж, адрасаваць яго трэба непасрэдна на тэлебачанне. Але газета мне неяк бліжэй. Да таго ж вельмі хочацца верыць, што не адзін я так думаю, што іншыя чытачы мяне падтрымаюць і ўрэшце ўсё будзе так, як павінна быць — гэта значыць так, як патрэбна людзям.

**Уладзімір СІДАР,**
*Мастоўскі раён.*

■ Весткі з месцаў

# ЖЫВЕ ПРЫГОЖАЕ ПІСЬМЕНСТВА! І НЕ ТОЛЬКІ...

**Багатым на цікавыя сустрэчы выдаўся гэты год для вучняў нашай Мельніцкай школы: у верасні да нас завітаў мясцовы паэт Мікалай Губей, у студзені — вучні Мяднянскай сярэдняй школы, а нядаўна — Аляксандр Кавальчук, які ўсё жыццё працаваў дыктарам на Брэсцкім абласным радыё.**

Сустрэча з ім не была выпадковай. Рэч у тым, што ў нашай школе ўжо другі год працуюць гурткі «Юны тэатрал», «Мастацкае слова», і гурткоўцам, вядома ж, хацелася прадэманстраваць свае здольнасці сапраўднаму прафесіяналу, які можа даць каштоўныя парады, падказаць недахопы, а магчыма, нават пахваліць.

Вучні чыталі вершы беларускіх і рускіх паэтаў — Рыгора Барадуліна, Роберта Раждзественскага, Эдзі Агняцвет, Яўгена Еўтушэнкі, Анатоля Грачанікава, Мікалая Забалоцкага, Андрэя Дзяменцьева...

Але ж самым цікавым быў майстар-клас ад Аляксандра Якаўлевіча. Ён таксама чытаў вершы, расказваў пра сустрэчы з опернай спявачкай Аленай Абразцовай, кампазітаркай Аляксандрай Пахмутавай, дыктарам усесаюзнага тэлебачання Ігарам Кірылавым і многімі іншымі...

Вучні слухалі нібы зачараваныя. Яны ж задавалі пытанні, бо цікава было даведацца, ці па памяці дыктары чытаюць тэксты, якімі якасцямі яны павінны валодаць, дзе можна атрымаць такую прафесію...

На развітанне госцю ўручылі падарункі. Адзін з іх — прыгожую выцінанку — вучаніца Насця Красіенка зрабіла сваімі рукамі. Дарэчы, у школе праходзіла выстаўка Насціных работ, дзе можна было пабачыць па-майстэрску выразаных на паперы анёлкаў, аленя, каня і нават партрэт Джаконды...

**Марыя ФЕДАРУК,**
**кіраўнік гуртка «Мастацкае слова»**
*Маларыцкі раён.*

■ Свой погляд

# МЫ ЗАБЫВАЕМ ЗАПАВЕТ...

**У кожнага чалавека ёсць толькі адна мова, якая завецца роднай. І, калі на добры толк, дык менавіта на ёй і трэба размаўляць — дома з роднымі, на вуліцы з чужымі...**

У нас у краіне дзве дзяржаўныя мовы. Аднак сфера ўжывання першай — мовы карэннага насельніцтва — абмежаваная. Беларускую — і гэта відавочна — трэба шырэй выкарыстоўваць у дзяржаўных установах, у справаводстве, на радыё, тэлебачанні. Трэба тлумачыць сучаснай моладзі значэнне роднай мовы, яе вялікую карысць. Але, напрыклад, у нас у Навагрудку ўсе школы цяпер рускамоўныя. Хоць здавалася б, калі ў нас двухмоўе, то і беларускіх школ павінна быць не менш за палову...

Што ўжо казаць пра розныя шыльды, рэкламныя шчыты, назвы гандлёвых пунктаў... Яны амаль усе падаюцца на рускай мове. А між тым беларуская — гэта частка прэстыжу дзяржавы. Яе трэба захоўваць і развіваць не менш чым эканоміку і культуру. Скажам, раней на 1 канале Беларускага радыё была цудоўная перадача «Роднае слова» — цяпер, на жаль, няма. У Расіі дзейнічае фонд падтрымкі рускай мовы, праводзяцца розныя міжнародныя акцыі, якія прапагандуюцца на тэлебачанні...

Дык чаму б і ў нас не наладзіць агульнадзяржаўную акцыю «Жыві, родная мова!» з шырокім асвятленнем у сродках масавай інфармацыі? Чаму б навіны на 1-м канале беларускага тэлебачання — ну хоць часткова — не падаваць на першай дзяржаўнай мове?

Размовы пра гэта ідуць даўно, але воз... Часам складваецца ўражанне, што забываем мы запавет Францішка Багушэвіча не пакідаць нашай мовы беларускай, «каб не ўмёрлі» — як нацыя, як адрозны ад іншых народ... Не баімся «ўмёрці», ці што?

А я дык з дзіцячых гадоў люблю сваю родную мову: яна мне — самая прыгожая, самая дарагая, бо менавіта на ёй размаўлялі мае бацькі, мае дзяды і прадзеды.

**Ілья АНТОНЧЫК,**
*г. Навагрудак.*

■ Чалавек — чалавеку

# «ГОД ГЛЯДЗЕЛА АГАРОД,

## А ўбіраю — недарод...»

Пра сваю любоў да роднай мовы, да «Звязды» я пісала ўжо неаднойчы. Таму цяпер скажу коратка: для мяне лепшай газеты няма, яе — амаль трыццаць гадоў — пастаянна выпісваю, з задавальненнем чытаю, карыстаюся многімі парадамі ды падказкамі. І, дарэчы, досыць часта лаўлю сябе на думцы, што шмат чаго не ведала. І нават ніколі не даведалася б, калі б не мая газета!

Такім чынам злажыўся верш. Ён, відаць, не вельмі дасканалы, але ж ад душы:

*Зранку добрае надвор'е...*
*Я — на шпацыр, у Падгор'е.*
*Пад нагамі гладка, суха...*
*Скуль вазьміся — завіруха!*
*Ў вёску сцежкі не відаць!*
*Куркача б мне прачытаць:*
*Тыя ж градусы ў «Звяздзе»*
*Больш дакладныя, чым дзе!*
*Прапусціла нейк газету,*
*Асядлала «лісапету».*
*— У снег жа нельга!*
*— Я не знала...*
*Штраф «па поўнай» аддавала.*
*Гараскоп не паглядзела, —*
*У цырульню паляцела...*
*Лепш было б дамоў вярнуцца:*
*Грошы болей не вядуцца!*
*Ці... Ніколі не забуду:*
*Укруціць хацела шрубу,*
*Не ідзе — ні так, ні гэтак...*
*Мне на выручку газета!*
*Рыс паставіла варыць...*
*А зняла — не разляпіць:*
*Спрасаваўся, нібы сала,*
*Бо «Звязду» я не чытала.*
*Ад пажарнікаў парады*
*Даць «Звязда» заўсёды рада.*
*Я артыкул прапусціла,*
*Ледзьве хату не спаліла!*
*З год глядзела свой гарод*
*А ўбіраю — недарод:*
*З тым і з гэтым прагадала,*
*Бо «Крынічку» не чытала.*
*Увосень, маючы бяду,*
*Да начальніка іду.*
*Ён жа там — ужо другі*
*Ды ўстаў не з той нагі...*
*Я пра гэта зранку б знала,*
*Каб газету прачытала!*
*...Трошкі ўсё не так было?*
*Шмат вады ўжо сплыло:*
*А не ведала б газету —*
*Магло б спраўдзіцца ўсё гэта.*
*А таму, куды ні іду,*
*Я з сабой бяру «Звязду»,*
*Ёсць хвілінка, пачытаю.*
*Тое ж іншым людцам раю.*

**Соф'я КУСЯНКОВА,** *в. Лучын, Рагачоўскі раён*

**АД РЭДАКЦЫІ.** Многія, будзем спадзявацца, прыслухаюцца да парады нашай чытачкі. Але ж нехта (што цалкам магчыма) захоча прадоўжыць вершаваную размову. Ну сапраўды: спадарыня Кусянкова «Укруціць хацела шрубу, а «не ішла», хоць стол не з дубу...», а нехта скарыстаўся іншымі парадамі са старонак газеты, меў іншыя прыгоды, уражанні, думкі... Дык чаму б ні падзяліцца імі, чаму б ні выказацца? Такім чынам — новая рубрыка: «Верш з працягам». Тэма яго зададзена. Астатняе — за чытачамі. Пішыце!

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

# МАЗЫРАНЕ СКАРЫЛІ МАНАКА

## Цяпер нас у Еўропе ведаюць і як краіну, у якой ёсць унікальныя паветраныя гімнасты

**З Монтэ-Карла вярнулася трыа ўдзельнікаў цэнтра цыркавога мастацтва «Арэна». Юныя мазыране падарылі прынцэсе Манака Стэфаніі, якая курыруе сусветнае свята цыркавых артыстаў, беларускі сувенір — вялікую саламяную ляльку.**

Між тым прылёт у агульнавядомую раскошай краіну для мазыран пачынаўся не вельмі аптымістычна. Хваляванні пералёту былі кампенсаваны прыгожымі відамі вяршынь гор, якія пратыкалі хмары наскрозь, а вось у аэрапорце іх чакаў непрыемны сюрпрыз. Сярод багажу не аказалася сумкі з галоўным рэквізітам. І дзеці, і іх кіраўнікі вельмі засмуціліся, бо знікаў сэнс іх з'яўлення на алімпійскіх гульнях цыркавога мастацтва.

— Калі нас сустрэлі, мы не адразу, але неяк зразумелі адно аднаго, — расказвае мастацкі кіраўнік цэнтра Марыя Кузняцова. — Нас запэўнілі, што арганізатары прымуць усе меры, каб знайсці багаж. Менавіта так і адбылося. Бліжэй да вечара нам даставілі згубленую сумку, і ўсе нарэшце супакоіліся. Яшчэ адна неспадзяванка чакала падчас выступлення, калі высветлілася, што лябёдка, якую прапанавалі нам для нумара, была з запаволенай хуткасцю. Праз гэта наш нумар ішоў крыху даўжэй і мы не заўсёды супадалі з музыкай. Тым не менш нашы дзеці выканалі сваю задачу на 1000%. Яны былі самыя малодшыя на гэтым конкурсе. Але ж не магу сказаць, што хваляваліся больш, чым на іншых паказах. Яны ж не першы раз удзельнічаюць у прэстыжных конкурсах, таму вельмі годна паказалі свой нумар. Ён, між іншым, быў абноўлены, удасканалены, меў складаныя элементы. Усе трукі юныя артысты выконвалі без страхоўкі.

Цыркавы «Оскар» фестывалю New Generation-2016 мае назву «Залаты клоўн». Яго падзялілі дрэсіроўшчык сланоў з Італіі і клоўн-француз. Але ж мазыранам дасталіся адразу тры спецыяльныя прызы ад арганізатараў — ад княства Манака, дырэкцыі фестывалю і акрабатычнай асацыяцыі Кітая. Ну а медалі ўдзельнікаў усім уручыла прынцэса Стэфанія.


Прынцэсы Манака Стэфанія і Паўлін з юнымі артыстамі з Мазыра Вікторыяй Баграёнак, Стэфаніяй Турмовіч, Станіславам Плотнікавым.

— Яна разам са сваёй дачкой Паўлін прыходзіла і на рэпетыцыі, дзе дарэчы, пры рэкамендацыі юных беларусаў асабліва адзначыла сваю цёзку — Стэфанію Турмовіч, — гаворыць Марыя Кузняцова. — Прынцэса Стэфанія асабіста цікавілася ў канкурсантаў, ці ёсць усё неабходнае для выканання нумароў. Яна запрашала ўсіх на абед у цыркавую кавярню, сама станавілася ў агульную чаргу і абедала разам з усімі. Нікому не адмаўляла ў просьбе сфатаграфавацца. Журы ўзначальваў Урс Пілс, ён жа віцэ-прэзідэнт фестывалю. Таксама выступленні цыркавых артыстаў ацэньвалі прадстаўнікі самых вядомых цыркаў з Францыі, Германіі і Расіі. Дарэчы, усе канкурсанты — прафесіяналы, спаборнічаць з імі нам, аматарам, было не так проста. Тым не менш цяпер Урс Пілс добра ведае пра нашу краіну і жадае прыехаць у Мазыр і паглядзець, як трэніруюцца дзеці ў нашым цэнтры. Увогуле, прасіў паказаць невялікае шоу. Будзем думаць, чым здзівіць госця.

Станіслаў Плотнікаў, Вікторыя Баграёнак і Стэфанія Турмовіч змагаліся за перамогу сярод прадстаўнікоў цыркавога мастацтва з 12 розных краін. І практычна ніхто, акрамя расіянкі, не размаўляў на зразумелай мове. Але ж пры гэтым, адзначаюць беларусы, атмасфера, створаная арганізатарамі падчас свята, была настолькі добразычлівай, што здавалася, канкурэнцыі паміж артыстамі няма ўвогуле. Усе рабілі сваю справу на самым высокім узроўні: аркестр, уніфармісты, спецыялісты па асвятленні...

— Нашы дзеці ўзялі аўтографы ва ўсіх артыстаў, якія выступалі на арэне ў Монтэ-Карла, — успамінае другі мастацкі кіраўнік «Арэны» Барыс Кузняцоў. — Там ставіліся вельмі сур'ёзныя нумары, і мы былі шчаслівыя выступаць побач з артыстамі такога ўзроўню. Атрымаўся добры майстар-клас па цыркавым мастацтве. Змагацца за «Залатога клоўна» мы маем намер і ў наступным годзе. Нас зноў запрасілі ў Манака. Гэта не толькі магчымасць заявіць пра сябе на адным з галоўных цыркавых форумаў. Мы таксама атрымалі некалькі вельмі цікавых прапаноў. Ад кітайскай асацыяцыі акрабатыкі нам ужо другі раз паступіла прапанова пра супрацоўніцтва: пазнаёміцца з нацыянальнымі цыркавымі школамі адзін аднаго. Таксама запрасілі прыехаць у Канаду і паказаць у тым ліку працэс падрыхтоўкі нумароў. Асабліва іх цікавіла, як мы адкрываем юныя таленты.

Агульныя ўражанні складаюцца з дробязяў. Вось і юныя артысты запомнілі не толькі ўсё, што мела непасрэднае дачыненне да фестывалю, але і ўмовы пражывання ў цыркавым гатэлі, дзе нават ліфт падобны на шацёр. У музеі акіянічных рыб гладзілі па спінцы асятроў, якія прымалі такія ласкі з задавальненнем. Паглядзелі на рэтра-аўтамабілі, якія ўдзельнічалі ў вядомых ралі. Пакармілі паўлінаў і чарапах, што гулялі ля цырка па пешаходных дарожках.

А яшчэ ў юных мазыран з'явілася вялікая мара аб правядзенні цыркавога конкурсу ў Беларусі. Кажуць: па-першае, гэта ж было б унікальнае відовішча для айчыннага гледача. Па-другое, была б пляцоўка, на якой аматарскія цыркавыя студыі нашай краіны змаглі параўнаць свой прафесійны ўзровень. І самае галоўнае: маладыя артысты, якія набылі прафесіяналізім менавіта ў такіх аматарскіх цыркавых калектывах, не шукалі б сабе працу за межамі нашай краіны.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# Гараскоп стрыжак на сакавік



***2 сакавіка, серада.*** Правільней не звяртацца да дапамогі нажніц. Тым, хто жадае перамен, зоркі раяць зрабіць завіўку.

***3 сакавіка, чацвер.*** Правільным будзе рашэнне пафарбаваць валасы ў цёмныя адценні, якія прыцягваюць дадатковыя сілы прыроды. Ад стрыжкі лепш ўстрымацца.

***4 сакавіка, пятніца.*** Дзень нейтральны, але ўсё ж лепш не спакушаць лёс і не прадпрымаць ніякіх дзеянняў па змене свайго іміджу.

***5 сакавіка, субота.*** Гатовым да авантуры варта падстрыгчыся: эфект будзе неардынарным і прыўнясе станоўчы ўсплёск эмоцый.

***6 сакавіка, нядзеля.*** Незвычайная стрыжка і непрадказальны тон фарбы дабавяць абаяння і сексуальнасці вашаму выгляду.

***7 сакавіка, панядзелак.*** Катэгарычна не варта рабіць аперацый з валасамі.

***8 сакавіка, аўторак.*** Д'ябальскі дзень, устрымайцеся ад выкарыстання вострых прадметаў, не кажучы пра нажніцы.

***9 сакавіка, серада.*** Дзень сонечнага зацьмення. Закрытае Сонца вам не памочнік, а без яго прымацца за новую прычоску — няўдзячны занятак, таму паход у цырульню лепш адмяніць.

***10 сакавіка, чацвер.*** Не стрыжомся, максімальная ўвага — догляду валасоў. Добра рабіць розныя маскі.

***11 сакавіка, пятніца.*** Дзень актыўнага энергетычнага абмену з прыродай, таму стрыжка выкліча непрадбачаныя наступствы. Ужыўшы натуральныя фарбавальнікі, дамажацеся ўмацавання сваіх фінансаў.

***12 сакавіка, субота.*** Падыходзячы час для крэатыўных і творчых жанчын. Толькі з незвычайнымі задумкамі абавязкова звяртайцеся да дапамогі цырульніка.

***13 сакавіка, нядзеля.*** Зайздросціце тым, у каго доўгія і бліскучыя валасы? Падстрыжыцеся — і абавязкова дамажацеся паляпшэння як структуры, так і гушчыні вашых валасоў.

***14 сакавіка, панядзелак.*** Штосьці новенькае ў знешнасці павялічыць вашу прывабнасць, можна скарыстацца любымі сродкамі.

***15 сакавіка, аўторак.*** Стрыжка дазволеная толькі тым, хто гатовы прыняць вобраз расбэшчанага падлетка з лёгкім воблакам на галаве. Што рабіць — густы ў жанчын такія розныя!

***16 сакавіка, серада.*** Цяжкі дзень, супрацьпаказаны для стрыжкі.

***17 сакавіка, чацвер.*** Можна ўмацаваць валасы з дапамогай хны або іншых гаючых масак, стрыгчыся астролагі не раяць.

***18 сакавіка, пятніца.*** Можна стрыгчыся без сумненняў, тым больш што гэта прымірыць вас са сваімі крыўдзіцелямі і падыме настрой.

***19 сакавіка, субота.*** Калі ўчора вы яшчэ не былі ў салоне, пасьпяшайцеся, зоркі раздаюць бонусы дастатку і творчага развіцця.

***20 сакавіка, нядзеля.*** Прымальная стрыжка толькі рукамі самага блізкага чалавека, калі вы не здольны зрабіць гэта самастойна.

***21 сакавіка, панядзелак.*** Думайце і вырашайце самі, мяняць ці не мяняць свой вобраз.

Размяшчэнне планет дазваляе як дзеянне, так і бяздзейнасць.

***22 сакавіка, аўторак.*** Значна лягчэй жыць з роўнымі і гладкімі валасамі, пазбягайце завівак і складаных укладак.

***23 сакавіка, серада.*** Астролагі прапануюць ўстрымацца ад стрыжкі, асабліва ў другой палове сутак. На сёння збярыце валасы ў пучок альбо зрабіце звычайную коску.

***24 сакавіка, чацвер.*** Цудоўныя лёгкія прычоскі гарантаваныя, смела адпраўляйцеся ў салон прыгажосці.

***25 сакавіка, пятніца.*** Сёння пры афарбоўцы можна дамагчыся менавіта таго адцення, пра якое вы марылі, спрабуйце рэалізаваць задуманае. Падстрыгшыся, атрымаеце больш шорсткія валасы.

***26 сакавіка, субота.*** Каб не наклікаць на сябе бяду, не дакранайцеся да валасоў пасля заходу сонца. З раніцы пажаданы звычайны догляд.

***27 сакавіка, нядзеля.*** Калі вы незадаволеныя сваёй знешнасцю, пачакайце да заўтра, а сёння пазбягайце манеўраў з валасамі.

***28 сакавіка, панядзелак.*** Падстрыгаць валасы можна толькі ў выпадку гатоўнасці да рэзкіх перамен у амурных справах.

***29 сакавіка, аўторак.*** Цікавыя знаёмствы і карысныя сувязі чакаюць тых, хто рызыкне зрабіць мадэльную стрыжку па апошняй модзе.

***30 сакавіка, серада.*** Знешнія сілы не паўплываюць на ваша рашэнне; хочаце падстрыгчыся — спрабуйце і давярайце інтуіцыі.

***31 сакавіка, чацвер.*** Можна пафарбаваць валасы або зрабіць завіўку і радасны настрой на наступныя дні забяспечаны.

**Даты | Падзеі | Людзі**

**2 САКАВІКА**

**1562** год — нарадзіўся Крыстоф Мікалай Дарагастайскі, дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, кальвініст. З 1597 года займаў адказныя пасады ў княстве: быў старастам ваўкавыскім, шарашэўскім, лепельскім. Браў удзел у Інфлянцкай вайне 1558—1582 гг., вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй (1600—1629), кіраваў абаронай Рыгі (1601). Аўтар кнігі «Гіпіка» — першага ў Рэчы Паспалітай дапаможніка па конегадоўлі. Каля 1615 года ў маёнтак Ашмяна Мураваная (цяпер на тэрыторыі Ашмянскага раёна) на ўласныя сродкі заснаваў друкарню. Памёр ў 1615 годзе.

**1930** год — у газеце «Правда» апублікаваны артыкул Сталіна «Галавакружэнне ад поспехаў» — пра «перагібы на месцах», допушчаныя падчас калектывізацыі. У артыкуле Сталін асудзіў шматлікія выпадкі парушэння прынцыпу добраахвотнасці пры арганізацыі калгасаў. Ён крытыкаваў залішнюю «заўзятасць» у справе раскулачвання, ахвярамі якога сталі многія серадняк. Уся адказнасць за допушчаныя памылкі ўскладалася на мясцовае кіраўніцтва. Трэба сказаць, што рашэнне задачы калектывізацыі ажыццяўлялася за кошт раскулачвання не толькі кулакоў, але і серадлякоў. Насілле з'яўлялася асноўным метадам аб'яднання ў калгасы. Сялянства на гэты крок адказала масавай незадаволенасцю і адкрытымі выступленнямі. У гэтых умовах сталінскае кіраўніцтва вырашыла пайсці на некаторае зніжэнне «градусу» калектывізацыі. Так званыя «перагібы» былі асуджаны, прапаноўвалася перагледзець стаўленне да серадлякоў, допускалася (як часовая мера) спыненне высялення ў аддаленыя раёны заможных сялян на час сяўбы.




**1959** год — ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову «Аб удзеле працоўных у ахове грамадскага парадку». На прадпрыемствах і ва ўстановах па ўсёй краіне пачалі ствараціца добраахвотныя народныя дружыны.

**Было сказана**

**Алесь БАЧЫЛА, паэт:**
*Дуб і той, калі ў полі адзін,*
*Не заўсёды адольвае буру.*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 7.55 | 18.49 | 10.54 |
| Віцебск | 7.46 | 18.37 | 10.51 |
| Магілёў | 7.45 | 18.39 | 10.54 |
| Гомель | 7.40 | 18.38 | 10.58 |
| Гродна | 8.10 | 19.05 | 10.55 |
| Брэст | 8.08 | 19.07 | 10.59 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 02.11***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Марыяны, Фёдара.*
***К.*** *Алены, Віктара, Паўла.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +5..+7°C |
| ВІЛЬНЮС | +3..+5°C |
| КІЕЎ | +4..+6°C |
| МАСКВА | 0..+2°C |
| РЫГА | +4..+6°C |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | -2..0°C |



# НЮАНСЫ ВЫБАРУ

## сотавага полікарбанату для парнікоў і цяпліц

**Трывалыя і зручныя — менавіта такімі словамі можна ахарактарызаваць парнікі і цяпліцы, выкананыя з сотавага полікарбаната. Яны значна пераўзыходзяць аналагічныя канструкцыі з плёнкі і шкла. Але каб гэты сучасны матэрыял прадэманстраваў свае лепшыя ўласцівасці, важна ведаць, на што звярнуць увагу, выбіраючы сотавы полікарбанат, як правільна яго манціраваць і як вызначыць якасць лістоў.**

У параўнанні з цяпліцамі, выкананымі з плёнкі і шкла, пабудовы з полікарбанату адрозніваюцца:

- ✓ выдатнай цеплаізаляцыяй;
- ✓ высокай святлопранікальнасцю;
- ✓ надзейнай абаронай ад ультрафіялету;
- ✓ трываласцю і ўдарастойкасцю;
- ✓ лёгкасцю мантажу;
- ✓ даўгавечнасцю;
- ✓ устойлівасцю да высокай вільготнасці і розных атмасферных уздзеянняў;
- ✓ эстэтычнасцю.

Цяпліца з полікарбанату глядзіцца на любым садовым участку вельмі прыгожа, стыльна і сучасна, выдатна ўпісваючыся ў любы, нават старанна прадуманы ландшафт.

### Правілы мантажу

Не мае значэння, набылі вы ўжо гатовую цяпліцу з сотавага полікарбанату альбо збіраецеся будаваць яе ўласнымі рукамі, — правілы мантажу будуць аднолькавымі, і іх неабходна выконваць.

***Правіла 1:*** для цяпліцы неабходна выкарыстоўваць толькі празрысты полікарбанат. Каляровы, вядома, глядзіцца больш прывабна, але святла ён прапускае нашмат менш і ў канчатковым выніку раслінам проста не будзе хапаць сонца.

***Правіла 2:*** сотавы полікарбанат для пакрыцця парнікоў і цяпліц абавязкова павінен мець з аднаго боку спецыяльны УФ-ахоўны слой. Пры мантажы гэты слой абавязкова размяшчаецца вонкі.

***Правіла 3:*** таўшчыня лістоў полікарбанату залежыць ад таго, як менавіта вы збіраецеся эксплуатаваць цяпліцу. Калі выкарыстоўваць сваю пабудову вы збіраецеся толькі ў вяснова-восеньскі халодны перыяд, таўшчыні лістоў 5-10 мм будзе цалкам дастаткова. Калі вы збіраецеся ацяпляць яе і выкарыстоўваць больш працяглы перыяд, то полікарбанат павінен мець таўшчыню не менш за 15 мм.

Дарэчы, ад таўшчыні лістоў сотавага полікарбанату будзе залежаць і разлік апорных канструкцый цяпліцы, каб матэрыял мог вытрымаць ветравыя і снегавыя нагрузкі.

***Правіла 4:*** усе лісты полікарбанату з'яўляюцца аднанакіраванымі, а рэбры іх цвёрдасці размешчаны паралельна даўжыні ліста. На цяпліцы ўсе рэбры цвёрдасці варта размяшчаць толькі вертыкальна.

***Правіла 5:*** злучаць лісты полікарбанату паміж сабой неабходна выключна з дапамогай спецыяльных злучальных профіляў. А мацаваць на каркас цяпліцы толькі самарэзамі, пад якія неабходна падкладаць невялікую гумовую шайбу.

Паколькі лісты полікарбанату маюць дастаткова вялікі каэфіцыент тэмпературнага пашырэння, адтуліну пад самарэзы неабходна рабіць крыху большага дыяметра, чым сам самарэз. Мацаваць самарэзы трэба ад краю ліста, адступіўшы ад яго прыкладна 5 см; крапіць па ўсёй даўжыні ліста, праз кожныя 30 см.

Ніколі не мацуйце полікарбанат цвікамі — гэта толькі парушыць цэласнасць ліста і немінуча прывядзе да яго разбурэння. Таксама па правілах злучэнне лістоў паміж сабой павінна адбывацца ўстык!





***Правіла 6:*** не эканомце на камплектуючых! Такія, на першы погляд, дробязі, як кантавы профіль і кантавыя стужкі, у разы павялічаць тэрмін эксплуатацыі цяпліцы. Кантавыя стужкі, устаноўленыя на тарцах лістоў, стануць іх надзейнай абаронай і не прапусцяць ўсярэдзіну бруду, пылу і насякомых. А кантавы профіль у абавязковым парадку усталёўваецца паверх стужкі на ўсе вольныя тарцы матэрыялу.

***Правіла 7:*** не купляйце самы танны сотавы полікарбанат! Якасны матэрыял не можа быць вельмі танным, аддайце перавагу сярэднім па цане або больш дарагім лістам — яны праслужаць нашмат даўжэй.

### Як вызначыць якасць?

**1.** Паверхня ліста павінна быць без бачных сколаў, драпін, увагнутасцяў і нават невялікіх няроўнасцяў. Яна не павінна расслойвацца і мець паветраныя бурбалкі.

**2.** Рэбры цвёрдасці ліста павінны размяшчацца толькі пад прамым вуглом, хвалістасць рэбраў па даўжыні ліста недапушчальная.

**3.** Не купляйце полікарбанату без УФ-абароны, бо менавіта ад яе будзе залежаць тэрмін службы лістоў. Без УФ-пакрыцця полікарбанат пад уплывам прамянёў сонца памяняе колер, стане больш крохкім і разбурыцца, не праслужыўшы і 3 гадоў.

**4.** Набывайце толькі полікарбанат, які правільна захоўваецца. Ад гэтага таксама будзе залежаць тэрмін яго эксплуатацыі. Лісты не павінны стаяць на рабры або быць згорнутымі — яны павінны захоўвацца на спецыяльных стэлажах з роўнай паверхняй.

### Аб вытворцах

Найбольш папулярныя віды сотавага полікарбанату, якія прадстаўлены сёння на нашым рынку:

**Актуаль** — сотавы полікарбанат расійскай вытворчасці — годны прадстаўнік эканом-класа полікарбанатных лістоў. Гэты матэрыял даволі зручны ў мантажы, ён эластычны і досыць мяккі. Яму не хапае цвёрдасці. Праслужыць такі ліст каля 8 гадоў.

**Полігаль** — полікарбанат вытворчасці расійска-ізраільскай кампаніі. Дастаткова цвёрды, трывалы, гнуткі, зручны ва ўстаноўцы і, у той жа час, не вельмі дарагі матэрыял, які праслужыць не менш за 10 гадоў.

**Вінпул** — сотавы полікарбанат кітайскай вытворчасці, вельмі мяккі і далікатны, каштуе нядорага, але і праслужыць не больш за 3 гады.

**Санэкс** — таксама прадукцыя кітайскай вытворчасці. Вельмі цвёрды і адначасова ломкі, досыць нязручны ў мантажы; праслужыць каля 4 гадоў.

**Марлон** — полікарбанат брытанскай вытворчасці, які адрозніваецца вельмі высокай якасцю і досыць высокім коштам. Пры правільным мантажы праслужыць не менш за 10 гадоў.

■ **А не шкодзь!**

# ЗА «РЫБАЛКУ» — ДА ШАСЦІ ГАДОЎ

**Трох жыхароў Белаазёрска затрымалі супрацоўнікі ўпраўлення аператыўнага рэагавання Дзяржінспекцыі на возеры Белае. З-за блізкага размяшчэння Бярозаўскай ГРЭС вадаём ужо вызваліўся ад лёду, чым скарысталіся браканьеры, паставіўшы сеткі.**

У іх патрапіла каля 300 асобін рыбы — акуня і плоткі. За кожную з іх парушальнікам давядзецца заплаціць па базавай велічыні. А ўвесь незаконны ўлоў вагой 40 кілаграмаў абыдзецца ў 62 мільёны рублёў. Больш за тое, адзін з затрыманых у 2010 годзе ўжо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за незаконнае рыбалоўства з нанясеннем шкоды ў асабліва буйным памеры. Тады 18-гадовы юнак патрапіў пад амністыю, а зараз яго чакае суровае пакаранне. Артыкул 281 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь прадугледжвае за яго ўчынак да шасці гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## УСМІХНЕМСЯ

**100% апытаных мышэй баяцца жанчын!**

У бары:
— Будзьце ласкавы, раствор гідраксіду гідрадыкарбонія ў моцнапалярным растваральніку аксіду вадароду.
Бармен:
— Колькі моляў?

**Вясковы магазін гарэў, але ніхто не спяшаўся яго тушыць. Усе чакалі, калі згарыць ТОЙ САМЫ сшытак...**

— Я на тваім месцы не мела б зносін з гэтым тыпам.
— Гэта мой муж.

**Міністэрства аховы здароўя папярэджвае: няма грошай — не хварэй!**




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.108. Індэкс 63850. Зак. № 824.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30
1 сакавіка 2016 года.